ЛІТАРАТУРНАЯ БЕЛАРУСЬ

Выпуск №9 (85) (верасень)

www.lit-bel.org www. novychas. info

Культурна-асветніцкі праект Грамадскага аб’яднання «Саюз беларускіх пісьменнікаў» і «Новага часу»

Анонс

ПОГЛЯД

РАСІЯ ЯК МІФАТВОРЦА

Міхась БУЛАВАЦКІ

У апошні час мяне не пакідаюць думы пра Расію — нашага вечнага спадарожніка і неадчэпнага сябра.



Неадчэпнага, бо мы нібыта катаржнік і канваір — скаваныя наручнікамі. І нельга разняць іх, бо заржавеў ключ ад доўгага некарыстання ці ўвогуле згубіўся. І брыдуць цяпер двое небаракаў у часе і прасторы, і ўсё вымушаны рабіць разам, нават да ветру схадзіць. І ўсё адзін пра аднаго ведаюць наскрозь. Усё прадказальна без слоў і без доўгага роздуму. І гэта ўжо выклікае раздражненне, што другі пра цябе ўсё ведае, да дна душы, куды й самому заглядваць не вельмі хочацца...

З боку дык і не разбярэш, хто там катаржнік, а хто канваір. Мае рацыю той, хто мацнейшы, як заўжды ў прыродзе. Але ў чым моц?..

Дзіўная краіна Расія. Яна падаравала свету шмат людзей высокага духу. І многа зла, крыві і войнаў. Цяжкое мінулае цісне, гняце, не дае спакою. А спакою хочацца. Век такі, не маладзенькая ўжо. І Расія стварае міфы пра сваю дабрыню.

Дзе-небудзь распачынаецца вайна ці якія хваляванні — Расія абавязкова «суне свой нос». І называе гэта міратворчасцю. То яна мірыла палякаў у часы «Салідарнасці», то немцаў, падзяляючы іх Берлінскай сцяной, то чэхаў ды славакаў. Ці вось яшчэ адзін міф: Расія як міратворца ў Югаславіі. Колькі ляманту пра міратворчую місію! Колькі паказальных мерапрыемстваў!..

А калі проста задумацца над пытаннем: што было б у Югаславіі, калі б Расія не ўмешвалася? Адказ тут доўга шукаць не трэба, ён навідавоку: вайна скончылася б тым жа — капітуляцыяй Мілошавіча, толькі нашмат раней. Бо Мілошавіч, разлічваючы на больш істотную падтрымку Масквы, адцягваў гэткі канец, колькі можна было. Без Расіі вайна скончылася б нашмат раней, а таму нашмат менш было б ахвяраў, нашмат менш было б разбурэнняў. І калі гэта ўсвядоміць, то выказванні пра міратворчую ролю Расіі набываюць адценне нейкага цынічнага блюзнерства.

Расія не можа быць міратворцам. Гэтая нямогласць абумоўленая не толькі яе сучасным матэрыяльным станам, але больш — прычынамі гісторыка-генетычнымі. Краіна-заваёўнік, якая ўнесла ў гісторыю цывілізацыі ці не найбольшую колькасць войнаў, наўрад ці можа ўсведамляць сабе сутнасць і ступень маральнасці міратворчай місіі. Хаця я мог бы назваць шмат расійскіх славутасцяў, якія і па духу сваім, і па норме паводзінаў міратворцы ў самым высокім сэнсе гэтага слова, але такія людзі (як, напрыклад, А. Сахараў) ніколі не стаялі, не стаяць сёння і, мне здаецца, не будуць стаяць ля стырна расійскай палітыкі.

Новаствораная пасля распаду СССР Расія паспрабавала быць дэмакратычнай. Атрымалася кепска. І не зможа Расія існаваць у дэмакратычным стане, пакуль з галоў яе насельнікаў не выветрыцца дух імперскасці. Гаворка тут не ідзе пра Пуціных-Зюганавых ці іншых стырнавых. Гаворка пра расійца звычайнага, шэраговага.

Людзі Расіі самі па сабе ўжо й не здольныя заўважаць ступень гэтай сваёй хваробы. А чалавеку збоку яна кідаецца ў вочы амаль ці не пры кожным кантакце з расійцам.

Вось багатая газета «Новые известия» некалі падаравала малым дзецям чачэнскіх уцекачоў месячны адпачынак на Чорным моры. Рассаджваюць па аўтобусах і абураюцца: «Гэта ж трэба! Ніводзін з дзяцей не ведае расійскай мовы!» На думку прадстаўнікоў даволі прагрэсіўнай газеты, шасцігадовае чачэнскае дзіця абавязана ведаць расійскую мову. А якую мову павінен ведаць шасцігадовы татарын ці карэл? Таксама расійскую? А куды ж дзяваць мову родную, на якой размаўляюць іх бацькі? Ну ніяк не лезе ў галаву расійскага абывацеля думка аб тым, што гэта нармальная з’ява, калі маленькі чалавек ведае толькі родную мову. А расійская мова, як ні круці, не родная. Цікава, колькімі мовамі валодае звычайны шасцігадовы расійскі хлопчык ці дзяўчынка? Няўжо ж дзвюма ці трыма?!

Вось вядомы пісьменнік-гумарыст М. Задорнаў, гастралюючы ў Мінску, завітаў у «Макдональдс» падсілкавацца і ўбачыў там на цэнніку слова «чызбургер», натуральна напісанае па-беларуску з літарай «ы». Але чалавеку не прыйшло (і, мабыць, не магло прыйсці) да галавы, што слова напісана не па-расійску. На яго думку, у Мінску і не могуць пісаць не па-расійску. Ён палічыў, што гэта такая дзіўная памылка ў расійскай мове і дапоўніў ёю сваю калекцыю падгледжаных недарэчнасцяў. Цяпер ці не на кожным са сваіх выступленняў ён распавядае пра мінскі «чЫзбургер». Вось так бывае, што беларуская мова і ўласная абмежаванасць дапамагае расійскім майстрам слова зарабляць грошы. Сумнае «ха-ха!».

А некалі вядомы расійскі пісьменнік, нобелеўскі лаўрэат, выказаўся наконт таго, як «обустроить» Расію. І, «абустройваючы» яе, ён заадно «абустройвае» і Беларусь з Украінай як дзве часткі Расіі.

А раней расійскі радыёжурналіст распавядаў пра тое, як Зюганаў адзначаў дзень смерці Леніна. Перадаючы словы лідара камуністаў, журналіст хацеў выказаць сваю нязгоду з імі. І ён нагадваў слухачам пра тое, як Ленін гандляваў «исконно русскими землями», падпісваючы «Брестский мир». Журналісту няўцям, што ён тым самым квапіцца на тэрытарыяльную цэласнасць суседняй дзяржавы. Для яго Беларусь як асобная краіна не існуе. Ён мысліць катэгорыямі і маштабамі Расіі вялікай, і яму няма справы да пачуццяў нейкіх там беларусаў, чачэнцаў, удмуртаў.

Больш за тое, нават гэтыя пачуцці расіец трактуе на прыемны для сябе лад, яму хочацца (а таму ён так і бачыць), каб усе гэтыя «малыя народы», на чыіх землях ён гаспадарыць і пануе, былі ўдзячныя яму. І ствараецца чарговы міф — пра дабрачыннасць заваёўніцкай дзейнасці Расіі, пра тое, што народы толькі й чакалі «выратавальніка» прышэсця расійскіх войскаў і сустракалі Ермака, Суворава і г.д. хлебам-соллю з мокрымі ад удзячнасці вачыма і з паклонамі да зямлі. «А хіба не так?!» — чую я здзіўленае пытанне аднаго з маіх расійскіх сяброў.

Гэты міф найбольш выразна адлюстраваны ў гістарычным трактаце («опыте исторической публицистики») нейкага Ф. Несцерава, выдадзеным у 80-х гадах аж трыма буйнымі выдавецтвамі і ўзнагароджаным прэміяй ці не раней, чым той нарыс паступіў у кнігарні. Нягледзячы на адыёзнасць гэтай кнігі, адзін сказ адтуль заслугоўвае, каб яго працытаваць: «В целом для России XIII–XVIII веков состояние мира было скорее исключением, а война — жестоким правилом». Шэсць стагоддзяў амаль беспярапынных войнаў!!! А ці нашмат лепшыя наступныя два? Толькі для Ф. Несцерава гэта правільныя войны, з карысцю і для Расіі, і для заваяваных ёю народаў.

Але ж як была Расія пры царызме «жандармам Еўропы», такой яна засталася і пры саветах. Праўда, не для ўсёй Еўропы, а для «сацыялістычнага лагера». Наствараўшы лагераў на сваёй тэрыторыі, расійскія старшыні стварылі лагер і ў Еўропе. Ім здавалася, што ў іх лагеры жыць будзе добра. І яны абураліся няўдзячнасцю вугорцаў, чэхаў, палякаў, якія раз-пораз спрабавалі вызваліцца з гэтага лагера. Абураліся настолькі, што зацiскалі гэтую няўдзячнасць узброенымі войскамі і танкамі.

Міф аб дабрачыннасці расійскіх войнаў развіваецца ў іншым міфе — аб тым, як народы, абласканыя Расіяй, хутка развіваюць сваю культуру, сваю прамысловасць, народную гаспадарку, мастацтва. Маўляў, без Расіі нічога гэтага не было б (проста дзіву даешся, як гэта незаваяваная Расіяй Японія яшчэ неяк развіваецца).

Але было б ці не было б, — не будзем спрачацца. Важней тое, што дабрачыннасцю тут і не пахне. Плата за такую дапамогу звыш меры! Якуцкае золата і алмазы, чачэнская нафта, крымскія ўзбярэжжы, карэльскія лясы, чукоцкія цюлені і каляровыя металы, мардоўскі мёд, эвенкійская пушніна — усё гэта папаўняе чэрава Расіі, даволі часта не на карысць ні ёй, ні абрабаваным народам. Варта тут успомніць, што культурныя каштоўнасці, вывезеныя пры эвакуацыі на пачатку вайны з Беларусі, дагэтуль не вернутыя нашай краіне. Яскравы прыклад рабаўніцтва дзяржавы дзяржавай.

Расія скарыстоўвае нават душы прысвоеных народаў. «Вялікі рускі пісьменнік Чынгіз Айтматаў»!

Працяг на стар. 15 (7) ▸

САЮЗ

ШКОЛА МАЛАДОГА ЛІТАРАТАРА

Пачаўся другі набор навучэнцаў у Школу маладога літаратара пры ГА «Саюз беларускіх пісьменнікаў» на 2013–2014 навучальны год.

Заняткі будуць праходзіць у Мінску з сярэдзіны кастрычніка па травень два разы на месяц: у суботу (практычныя заняткі) і сераду (лекцыі і майстар-класы). Наведнікам з рэгіёнаў — спрыянне з даездам. Навучанне ў Школе — бясплатнае, група — 15-20 чалавек, выкладанне будзе весціся па-беларуску.

Школа дзейнічае як нефармальны адукацыйны праект, сертыфікат аб яе заканчэнні не замяняе дыплома афіцыйных навучальных устаноў.

Умовы для кандыдатаў:

Узрост — да 25 гадоў.

Для падачы заяўкі кандыдату на залічэнне ў Школу неабходна даслаць свой уласны празаічны мастацкі тэкст любога жанру аб'ёмам 2–5 старонак, а таксама матывацыйны ліст з адказам на пытанне: «Чаму вы хочаце вучыцца ў пісьменніцкай школе?».

Афармленне заяўкі:

Заяўкі прымаюцца па электроннай пошце да 1 кастрычніка па адрасе sbp@lit-bel.org.

Тэму ліста пазначце «Школа».

Прозу і матывацыйны ліст дасылайце разам у адным файле Word фармата.doc. На першай старонцы пазначце сваё імя і прозвішча, поўны паштовы адрас, дату нараджэння, e-mail і кантактны нумар тэлефона.

Пры паспяховым залічэнні ў Школу Вам будзе паведамлена пра гэта да пачатку заняткаў па кантактах, якія Вы пакінулі. Заяўкі не рэцэнзуюцца.


Фота Алены Казловай

ПЕРАМОЖЦЫ КОНКУРСА «ЭКСЛІБРЫС» ІМЯ ЯНКІ МАЎРА

10 верасня былі падведзеныя вынікі конкурса «Эксiлбрыс» імя Янкі Маўра, запачаткаванага Саюзам беларускіх пісьменнікаў. Сябрам журы было вельмі няпроста вызначыцца з пераможцамі — сярод твораў, пададзеных на конкурс, былі і коміксы, і пераклады, і цэлыя праекты кніг.

Сярод 117 удзельнікаў было шмат таленавітых і вартых увагі аўтараў, адзначылі ўсе пісьменнікі, якія ацэньвалі іх. У выніку абмеркаванняў нарэшце назвалі 12 фіналістаў: тры пераможцы і дзевяць дыпламантаў.

Першае месца прысуджана Вользе Гапеевай — за казачныя гісторыі «Сумны суп», а разам з дыпломам пераможца атрымае планшэт ад кампаніі «Prestigio» і правa выдаць сваю кнігу.

Другім месцам ушанаравана Дар'я Вашкевіч за казку «Бабаўняная дзяўчынка» (твор быў ілюстраваны мастачкай Аленай Медзяковай). Пераможца атрымае чытар-букрыдэр ад нашых партнёраў і магчымасць выдаць кнігу.

Трэцяе месца занялі пераклад «Чараўніка краіны Оз» Фрэнка Баўма, перастворaны на беларускую мову Сержуком Мядзведзевым, якому таксама дастаецца чытар-букрыдэр.

У дзявятку дыпламантаў увайшлі (у алфавітным парадку):

Праект кнігі Сяргея Календы, Дашы Зайчанка і Ліды Налiўка «Дзе жывуць беларускія пачваркі»;

Надзея Кандрусевіч з перакладам твора Сары Лундберг «Віта Белая Крэска»;

Павал Касцюкевіч з перакладам «Аўтаспынам па Галактыцы» Дугласа Адамса;

Алесь Квіткевіч з перакладам першай кнігі «Хронікі Нарніі» Клайва Стэплза Льюіса (кніга мае назву «Нябож Чарадзея»);

Глеб Лабадзенка з кнігай дзіцячых моўных малюнкаў «дзіцячая заМова» і з працягам гэтага праекта;

Элеанора Ляхновіч з казкай «Турба-Элік і яго сябры» (твор быў ілюстраваны аўтарам);

Мілана Пасанен з дзённікавымі гісторыямі «Королева рулета», якая сталася сапраўдным адкрыццём конкурса. Аўтарцы ўсяго толькі 13 гадоў, але яе літаратурныя здольнасці, адчуванне стылю і пачуццё гумару прыемна ўразілі сябраў журы;

Наталля Рудак з перакладам «Маленькай вядзьмаркі» Отфрыда Пройслера;

Ксенія Шталянкова з працягам прыгодніцкага рамана для падлеткаў «Адваротны бок люстра».

Усе фіналісты атрымаюць дыпломы і спецыяльныя прызы ад ГА «Саюз беларускіх пісьменнікаў».

Урачыстае ўзнагароджанне лаўрэатаў конкурса «Эксілбрыс» адбудзецца 12 кастрычніка ў галерэі сучаснага мастацтва «Ў». Пачатак у 18.00.

Прэс-служба СБП

ЮБІЛЕЙ

«А РАПТАМ ПРАЧЫТАЕ КУПАЛА?!»

ДА 100-ГОДДЗЯ СЯРГЕЯ ГРАХОЎСКАГА

У канцы 80-х гадоў мінулага стагоддзя мне пашчасціла пазнаёміцца з цудоўным чалавекам (светлая ёй памяць) — Марыяй Міхайлаўнай Мікуліч, сястрой Барыса Мікуліча, цудоўнага беларускага празаіка з няпростым і надзвычай трагічным лёсам.



Арганізатарка і нястомная захавальніца школьнага музея «Літаратурная Лагойшчына» Вера Рыгораўна Саўрыцкая неаднойчы запрашала яе на сустрэчы, паколькі пачэснае месца было адведзена на музейным стэндзе Барысу Мікулічу, жыццё якога і многія выдатныя творы былі цесна звязаны з лагойскай зямлёй.

Я невыпадкова ўзгадаў пра гэтае знаёмства, бо менавіта Марыя Міхайлаўна прапанавала мне ласку праз яе паказаць свае вершы Сяргею Грахоўскаму, з якім Барыс Мікуліч доўга і прыязна таварышаваў у гады творчай маладосці, пакуль ліхое і бесчалавечнае жыццё не разлучыла іх навечна.

Ці то па неабачлівасці, ці то спяшаючыся, але я аддаў на ўгледзіны Сяргею Грахоўскаму не лепшыя свае вершы, а дакладней сказаць — апошнія напісаныя, сыраватыя, неабкатаныя, неадляжаныя...

На ўсё жыццё запомніў я тую навуку слыннага майстра беларускай паэзіі, але не толькі навуку, а нешта большае...

Летась, калі зачынялі Беларуцкую школу імя Янкі Купалы, я з бібліятэкаркай нашай школы паехалі па «спадчыну» — забіраць кнігі ў сваю школьную бібліятэку. Паколькі мне выпала папрацаваць у славутай школе колькі часу, я папрасіў падараваць мне сёе-тое са спісаных кніг. На прапанову выбраць самому, пакваліўся на збор твораў Уладзіміра Караткевіча і некалькі кніг знаёмых са школы аўтараў. Пагартаў «Так і было. Артыкулы. Успаміны. Эсэ» Сяргея Грахоўскага і... не мог адарвацца. З якой дакладнасцю, любоўю, пяшчотай і замілаванасцю аўтар узгадвае далёкія даваенныя сустрэчы, знаёмствы, сяброўствы з многімі вялікімі творчымі людзьмі нашай Беларусі. Не магу ўстрымацца, каб не працытаваць хоць трошкі аўтара:

«...купляю ў кіёску некалькі экзэмпляраў часопіса «Беларусь калгасная». У другім нумары новага часопіса — мой верш «Гідрастанцыя»... Разгарнуў і любуюся лесвічкамі і прыступкамі сваіх радкоў. У гэтым жа нумары надрукаваны «Ударніку» і «Заўсёды наперад» Янкі Купалы. Пакуль гартаў часопіс, да кіёска падышоў Іван Дамінікавіч, павітаўся з кіяскёрам і са мною.

«Калі нацешыўся сваім творам, дык хадзем са мною». Ішлі, маўчалі. Так карцела пачуць Купалаву пахвалу. Ён, відаць, адчуў маю скаванасць і загаварыў сам: «Пакуль чытаў твой верш, ну ж і накульгаўся, не раўнуючы, па шпалах сігаў і ўсё з нагі збіваўся. Навошта так ламаць радок?..». Я вінавата апусціў галаву. Дзядзька Янка зірнуў і суцешыў: «Не журыся. Я так, на будучае, каб меней трэску было. Як на цяперашні час, дык вершык ніштаваты. Чытаў». Пасля гэтага я баяўся абы-што друкаваць. А раптам прачытае Купала? Мы развіталіся на рагу Ленінскай. Я пайшоў бязмэтна блукаць з вуліцы ў вуліцу. Не хацелася ні з кім сустракацца. Было брыдка за «драбіны», за трэск, за несапраўднае, напісанае абы надрукавалі. З купленых часопісаў пакінуў адзін, астатнія цішком сунуў у нейкую сметніцу. Купалавы ўрокі і цяпер для мяне — перасцярога ад пустаты, фальшу, самаўпэўненасці. Словы яго чую і сёння».

Перачытаў яшчэ раз гэтыя радкі і ўспомніў, што мне напісаў у адказ Сяргей Іванавіч Грахоўскі. Дарэчы, у свае 75-годдзе, бо даслааны канверт пазначаны 26 верасня. Для мяне гэта яшчэ таксама было вялікім уражаннем, што вядомы паэт так уважліва аднёсся да пачаткоўца, не ведаючы яго ні ў твар, ні прачытаўшы ніводнага ягонага твора ў друку. Я і тады, і цяпер не раз сабе думаў аб тым, як гэта важна сустрэцца ў жыцці з сапраўдным настаўнікам, колькі б я мог навучыцца, каб выпала пазнаёміцца з ім асабіста і хоць трошачкі пасябраваць. Зноў і зноў перачытваю ўспаміны Сяргея Грахоўскага і шчыра зайздрошчу ды захапляюся тым, як яны ўмелі сябраваць!..

Вось адкуль тая ўвага і цікавасць да пачынаючых аўтараў, вось адкуль тыя парасткі выхавання характару і душы! Вось над чым варта задумацца сённяшнім творцам: думаць аб тых, хто будзе ствараць літаратуру пасля нас.

А напісаў Сяргей Іванавіч Грахоўскі, папрасіўшы загадзя прабачэння, што так «скрэмзаў» мае творы, наступнае: «Паважаны Мікалай Міхайлавіч! М. М. Мікуліч папрасіла пачытаць Вашы вершы. Прабачце, што так іх скрэмзаў. Добра, што Вам хочацца пісаць, але аднаго жадання мала. У Вас пакуль што ўсё другаснае, вядомае, знаёмае і напісана нязграбна, без валодання тэхнікай верша, нават без адчування рытму. Вучыцца і працаваць Вам трэба настойліва і ўпарта. А настаўнікі — на кніжных паліцах. Поспехаў Вам. С. Грахоўскі».

Я не памятаю, ці блукаў я самотны па вуліцах, як у свой час Сяргей Грахоўскі пасля Купалавага «хрышчэння», аднак навуку тую засвоіў да скону. І цяпер, калі зрэдчасу даводзіцца чытаць творы пачаткоўцаў, я думаю аб тым, што шмат каму не хапае такіх творчых урокаў. Адно я памятаю вельмі добра: пасля завочнай сустрэчы з адметным майстрам беларускага паэтычнага слова Сяргеем Грахоўскім я не кінуў пісаць вершы, не стаў дасылаць у рэдакцыі пустыя, фальшывыя радкі, а ўпарта і настойліва, як параіў старэйшы сябар, стаў працаваць над словам, формай і зместам — і толькі праз некалькі гадоў асмеліўся даслаць вершы ў «ЛіМ». І цяпер, дасылаючы нізку вершаў у які-небудзь літаратурны часопіс, я сто разоў іх перагледжу, параюся нават з маладзейшымі аўтарамі, бо ніколі не забываю словы Сяргея Грахоўскага: «А раптам прачытае Купала?!»

Мікола Ляшчун

КАСТРЫЧНІЦКІЯ ЮБІЛЯРЫ

У наступным месяцы адзначаюць юбілеі сябры Саюза беларускіх пісьменнікаў:

04.10.1978 — Ірына Іванаўна Дашына
06.10.1963 — Іван Мікалаевіч Афанасьеў
12.10.1948 — Любоў Аляксандраўна Філімонава
13.10.1953 — Вячаслаў Антонавіч Ракіцкі
18.10.1943 — Генадзь Рыгоравіч Дзмітрыеў
18.10.1938 — Ала Васільеўна Кажэра
18.10.1963 — Віктар Паўлавіч Сазонаў
21.10.1958 — Максім Аляксандравіч Клімковіч
23.10.1948 — Віктар Уладзіміравіч Ярац
30.10.1938 — Уладзімір Ануфрыевіч Лебедзеў

Жадаем усім радасці, натхнення і дабрабыту!

АБРЫС

ЧАС ВЯРТАННЯ, або МОЙ ШЛЯХ ДА НАТАЛЛІ АРСЕННЕВАЙ

Выйшла ў свет першая ў айчынным літаратуразнаўстве кніга «Наталля Арсеннева: Шлях да Беларусі», прысвечаная творчасці беларускай паэтэсы-эмігранткі. Аўтар даследавання — кандыдат філалагічных навук Ала Петрушкевіч — разглядзела творчасць Наталлі Арсеннвай і ў кантэксце часу, і ў кантэксце айчыннай літаратуры. Наклад выдання — 100 асобнікаў.

У юбілейны месяц (20 верасня — 110-годдзе з дня народзінаў знакамітай паэтэсы) «Літаратурная Беларусь» змяшчае эсэ-ўступ з названай кнігі.

Ала ПЕТРУШКЕВІЧ

Лета, 1989 год. Курсы настаўнікаў у Інстытуце ўдасканалення ў Гародні. Слухаю лекцыю Аляксея Міхайлавіча Пяткевіча пра творчасць беларускіх пісьменнікаў-эмігрантаў. Між іншым размова ідзе і пра паэзію Наталлі Арсенневай. Да таго гэтае імя сустракала ў друку. Але ніколі ў часы вучобы на філалагічным факультэце. Аляксей Міхайлавіч раіць набыць кнігу «Туга па Радзіме», якая нядаўна выйшла. Не думала тады, што гэта будзе першая кніга ў маім неблагім на сёння зборы твораў беларускіх эмігрантаў. Як не марыла нават, што праз нейкі час менавіта мне давядзецца прапанаваць у Гродзенскім дзяржуніверсітэце для студэнтаў беларускага аддзялення курс «Творчасць пісьменнікаў беларускага замежжа».

Напачатку 90-х, калі працавала над дысертацыяй па творчасці Дануты Бічэль, пачула ад кіраўніка, акадэміка Івана Якаўлевіча Навуменкі:

— Што гэта ваша Данута адна, як Піліп з канапель, выскачыла? Каго яшчэ побач паставіце?

— Ларысу Геніюш.

— Пастаўце і Наталлю Арсенневу. Але ж і кампанія!

І калі я пабедавала, што больш няма дзе прачытаць яе вершаў, апроч як у анталогіі «Туга па Радзіме», падказаў, што ў аддзеле рэдкай кнігі акадэмічнай бібліятэкі ёсць першы зборнік паэткі «Пад сінім небам». Лішне казаць, што ў той жа дзень я ўжо трымала ў руках тую кнігу.

Падборка вершаў у анталогіі, як мне здавалася, зусім не благая, сама паэтка, праўда, была не надта задаволена («падбор твораў нейкі дзіўны»). Але чамусьці тыя вершы і блізка не зрабілі на мяне такога ўражання, як тая незвычайная кніга. Яна і сапраўды незвычайная. У руках яе трымала сама Наталля Арсеннева. І бацька Максіма Багдановіча Адам Ягоравіч, якому кніга і была падараваная. «Бацьку майго ўлюбёнага паэты...» — аўтограф паэткі сведчыў пра тое. Не магла адвесці вачэй ні ад гэтага надпісу, ні ад фотаздымка, ні ад сціплай, але такой далікатна-прыгожай зжаўцела-белага колеру вокладкі. І вершы ўспрымаліся зусім па-іншаму. Ад іх веяла такой пяшчотай, такой выкшталцона-жаноцкай тугой па высокім сінім небе, па золаце восені. І чымсьці, што нельга вытлумачыць проста словам, а толькі вершам, тымі яе вершамі. Увесь час, чытаючы паэтычныя радкі, бачыла яе, уяўляла нават, як яна выглядае, як апранута. Мо смешна, але здавалася, што адчуваю водар яе парфумы... Не заўважыла, як закончыўся дзень, бібліятэкарка ветліва папрасіла вяртаць кнігу. Назаўтра зранку я ізноў трымала гэтую кнігу ў руках.

Напэўна, гэта праўда: чалавек прыцягвае да сябе тое, што жадае мець. Наступная сустрэча з паэзіяй Наталлі Арсенневай адбылася ўжо ў часе маёй працы ва ўніверсітэце. Здавалася б, зусім выпадкова атрымала ў якасці падарунка ад калегі з суседняй кафедры кнігу. Выпадкова зайшла да іх, ён таксама выпадкова з'явіўся там, нешта патрэбна было яму ў сейфе, дзе, апроч усяго іншага, ляжалі кнігі, якія ён атрымліваў з Амерыкі. Узяў адну і працягнуў мне. «Дару. Напэўна, табе гэта спатрэбіцца», — было сказана як пра нейкае звычайнае выданне, якое лёгка можна было набыць у кожнай кнігарні. А была гэта кніга, што стане адной з самых дарагіх для мяне ў маёй бібліятэцы, — Наталля Арсеннева. Між берагамі. Адзіная, якую нікому ніколі не пазычаю, бо не магу дазволіць сабе страціць яе, як тое ўжо здарылася з многімі. Заўсёды прыношу на лекцыі і паказваю студэнтам, але папярэджваю, што кніга не выдаецца. Менавіта тады, калі займела гэтае выданне, вырашыла, што распрацую для студэнтаў курс пра тую нашу міжбераговую літаратуру.

«Між берагамі» — гэта кніга, атрымаўшы якую, Наталля Арсеннева (як яна пра тое сведчыла пазней) адчула сябе паэткай. Вокладка колеру марской хвалі, ярка-бірузовая, у цэнтры залатым цісненнем профіль аўтаркі. Прадмова самага знакамітага эмігранцкага крытыка Антона Адамовіча, якая і сёння ўспрымаецца як вельмі цікавае, цэласнае, грунтоўнае даследаванне і жыццёвага шляху, і творчасці паэткі. Змешчаны партрэт работы Пётры Міраноўіча. Прыгожая жанчына прыгожа-восеньскага веку, часу залатой, жоўтай восені. Размытыя абрысы. Толькі выразна вылучаюцца вочы, яркія, цёмныя. І столькі ў іх болю, столькі стратаў адбілася. А погляд — удалечыню, напоўнены мудрасцю і тым унутраным спакоем, якога здольны дасягнуць натуры моцныя, нескароныя. Не ведаю, у якіх колерах выкананы партрэт, але ўяўляю, што ў бляклa-жоўта-залатых. Пра паперу адмысловцы, напэўна, могуць сказаць: няякасная. А як па мне, то цудоўная, моцная і пажоўклая, як тая згадка ў эпіграфе Максіма Багдановіча да ягонага «Вянка». «Між старонак старых, пажоўклых» заўсёды знаходжу для сябе тое, што дапамагае выжыць і ў пару вясновую, калі неба такое сіняе-сіняе, а ў душы халодна-халодна, і асабліва ў пару залатой восені, калі так адчувальны подых сцюжы...



Зімой 1998 года ў нашы школы паступіў указ, у выглядзе тэлефоннага званка, пра забарону вывучэння творчасці Наталлі Арсенневай, Ларысы Геніюш, Масея Сяднёва. Прамаўчаць было нельга. Напісала артыкул, які так і называўся: «Ці можна сёння прамаўчаць?». Ён быў апублікаваны ў «ЛіМе» 25 мая 1998 года пад назвай «Ці дажывём?..» Зразумела, нічога змяніць не здолеў. Сёння такое ў «ЛіМе» не публікуюць. Газета творчай інтэлігенцыі не згадала нават пра 100-гадовы юбілей паэткі. Затое палічыла магчымым пакінуць абразлівыя выказванні на яе адрас з даклада літаратурнага генерала на з'ездзе СПБ...

Да практычных заняткаў па творчасці Наталлі Арсенневай прапаноўваю студэнтам згадаць, што ведалі раней пра паэтку, ці вывучалі ў школе. Дзесьці да 2000 года большасць адказаў былі амаль аднолькавымі: ведалі гэтае імя, вывучалі ў школе паэзію. Пазней многія студэнты гаварылі пра тое, што або ніколі не чулі нават імя, або калі і чулі, то нічога не ведалі пра яе творчасць. Самая недарэчная сітуацыя сёння: ніхто са студэнтаў-першакурснікаў ніколі не чуў імя паэткі. Як і імя Ларысы Геніюш.

А раней былі вельмі цікавыя выключэнні. Аднойчы пачула такі аповед. Студэнтка працавала летам у дзіцячым садку ў заходнебеларускім мястэчку. У адным з пакояў, на ўсю сцяну, па-мастацку напісаныя словы «Малітвы». Спытала ў дзяцей: «Што гэта такое?». Малыя адказалі: «А хіба вы не ведаеце? Гэта ж наш гімн «Магутны Божа»!». Якім жа было маё здзіўленне, калі на пытанне, хто тая патрыётка-выхавацелька, пачула: «Ваша аднакурсніца». І назвала імя вельмі мілай, прыгожай дзяўчынкі, якая ў студэнцкія часы не вельмі ўлягала за навукай, здавалася, была зусім абыякавай да нейкіх нацыянальных праяваў жыцця. «Яна і ёсць тая дзіўная, бо зрабіла тое, чаго ад яе не чакалі», — гэтак ахарактарызаваў яе наш калега прафесар Ігар Васільевіч Жук, калі пасля заняткаў расказала на кафедры пра вельмі прыемны для мяне выпадак.

Параўнальна нядаўна пачула аповед, як дырэктар школы ў адным з гарадоў, што на Гарадзеншчыне, падкрэсліваў у размовах з вучнямі, што сапраўдным гімнам Беларусі з'яўляецца «Магутны Божа». І гэта ў наш час! Ёсць жа яшчэ і дырэктары!.. Дзяўчынка запомніла гэта. Як ім, вучням, важным бывае слова настаўніка. Як часта яно падае на вельмі ўрадлівую глебу. Менавіта пра гэта не раз чула ад аднаго з самых лепшых нашых беларускіх настаўнікаў з Гудзевічаў Алеся Мікалаевіча Белакоза.

Адна са студэнтак вучылася ў музычнай школе, спявала ў хоры. Песня, якую выконвалі амаль заўсёды, — «Магутны Божа». З тых часоў памятала яе, але імя паэткі не ведала. Наогул, часта студэнты памятаюць малітву, якую яны чулі ці спявалі ў касцёле. Але вельмі рэдка ведаюць імя аўтаркі верша.

Апошнім часам усё меней аповедаў пра Наталлю Арсенневу. Варыяцыі на адну і тую ж тэму: нічога не ведала са школы, вельмі шкада, што паэзія не вывучаецца. Дабавілася яшчэ адно нечаканае ўспрыняцце: калі ў школе ў аглядзе сучаснай паэзіі пачула гэтае імя, падумала, што гэта маладая сучасная паэтка. Студэнтка-выдатніца, у тым часе вучаніца-выдатніца, у якасці прызу на алімпіядзе па роднай мове атрымала кнігу Лідзіі Савік «Пакліканыя» (Які цуд! Як бы ні глядзелі ўсе іх ідэалагічна-вертыкальныя цэнзары, усё ж і нашы кнігі даходзяць нават да школьнікаў і такім чынам). Тады і прачытала ўпершыню гэтае імя. Але тэкст падаўся занадта складаным, чытаць не стала, а вось ужо ва ўніверсітэце!..

Гэтая кніга стваралася на працягу амаль пятнаццаці гадоў. Многае з напісанага было прэзентавана на навуковых канферэнцыях. Праўда, далёка не ўсё можна было надрукаваць у нашых зборніках. Таму артыкулы ў большасці сваёй выходзілі ў навуковых і перыядычных выданнях Польшчы, па-за межамі Беларусі.

Да гэтага часу не выдадзена ні адна кніга пра Наталлю Арсенневу. Даследчыцай творчасці беларускіх паэтаў-эмігрантаў Лідзіяй Савік напісаны грунтоўны раздзел пра паэтку ў манаграфіі «Пакліканыя. Літаратура беларускага замежжа». Літаратуразнаўцу з Беласточчыны Яну Чыквіну належыць артыкул «Між Вільняй і Рочэстэрам (Творчасць Наталлі Арсенневай)», змешчаны ў кнізе «Далёкія і блізкія. Беларускія пісьменнікі замежжа». Ён з'яўляецца аўтарам і манаграфічнага артыкула пра паэтку ў «Гісторыі беларускай літаратуры XX ст.». Мікола Мішчанчук — аўтар артыкула «Між берагамі (Лёс і творчасць Наталлі Арсенневай)». Гэта самыя грунтоўныя працы пра творчасць паэткі.

20 верасня 2013 года спаўняецца 110 гадоў з дня нараджэння Наталлі Арсенневай, чыя творчасць усё яшчэ не можа вольна вярнуцца ў Беларусь, так, як ніколі не вярнулася сюды аўтарка. У лісце да яе літаратара Антона Адамовіча чытаем: «Вы зусім правільна пісалі, што Вас будуць чытаць і разумець па сьмерці. Гэта ж з паэтамі часта бывае, а з запраўднымі — бадай заўсёды». Час — чытаць і разумець творы паэткі — хіба ж не прыйшоў?

Наталля Арсеннева, бясспрэчна, вартая таго, каб кнігі пра яе з'явіліся...

БЫЛІЦА

ШОЎ ПАВІННА ПРАЦЯГВАЦЦА

Юры НЕСЦЯРЭНКА

Фрэдэрык Булсара памалу пераставаў быць парсам і ўсё больш ператвараўся ў суперзорку, адпаведна ўзяўшы сабе псеўданім касмічнага маштабу — у гонар планеты Меркурый. Ужо былі выпушчаны тры першыя альбомы і хутка павінна была з'явіцца «Ноч у оперы».



На той жа самай выспе і па тых жа самых начах не губляў час дарэмна Парсанс, чалавек, які да парсаў, можа, і не меў дачынення, але старажытныя аланы напэўна маглі б пачуць нешта няўлоўна знаёмае ў гучанні яго імя — Алан. Сваёй гукарэжысёрскай працай у «Зваротным баку месяца» Парсанс паставіў адну цікавую кампанію ў шэраг супергруп. Кампанія сяброў, узначальваў якую спадар Гілмар (з біблейскім імем Давыд), ужо рыхтавала альбом «Вам бы тут пабываць», высакародна і, амаль што, шчыра, прысвечаны Сіду Баррэту, які так жа шчыра ўсё больш станавіўся амаль што парсам.

За «Вам бы тут пабываць» хутка з'явіцца альбом «Звяры». Ідэя якога была ўзята з оруэлаўскай «Звераферамы».

Магілёўскі аэрапорт меў самае прамое дачыненне да навакольных звераферамаў, як у прамым значэнні — геаграфічна, так і ў пераносным — гістарычна, і яшчэ паўнавартасна працаваў, як і належала любому савецкаму аэрапорту ў першай палове 70-х. Самалёт «Як-40» па раскладзе падняўся ў паветра. Не выключаецца, што гэта адбывалася ў той самы час, калі Фрэдзі, Алан, Давыд і Сід вызначыліся, у якім накірунку сваёй дзейнасці будуць рабіць пераможны рывок (відавочна, рывок быў накіраваны не ў бок сацыялістычнай культуры і не на карысць чужой для вышэйпералічаных асобаў ідэалогіі). Наўрад ці яны ведалі, што канчатковым пунктам прызямлення ў «Як-40» быў Сімферопаль, ад якога да Чорнага мора заставалася кіламетраў пяцьдзясят.

Мае бацькі спланавалі свой адпачынак у Еўпаторыі, адным з самых папулярных месцаў чарнаморскага ўзбярэжжа. Туды мы выправіліся ўсёй нашай сям'ёй: мама, тата, пяцігадовая сястрычка і дзевяцігадовы я. Тысячы такіх самых сем'яў ляцелі ў Сімферопальскі аэрапорт у гэты ж самы час з усіх канцоў Савецкага Саюза: з Сібіры, з Казахстана, а мо нават і з Далёкага Усходу, узбярэжжа Ледавітага акіяна ці з кітайскай мяжы.

Адпачынак праходзіў традыцыйна: з раніцы пляж, невялікі перапынак з ратаваннем ад паўдзённага сонца ў любым ценістым месцы і лянівы абед, зноў пляж, увечары атракцыёны ці кафэ, марозіва і ліманад альбо кіно на адкрытай пляцоўцы, потым цяжкі сон на здымнай кватэры ў начной спякоце паўднёвага клімату. У перадапошні і апошні дзень адпачынку самая адказная місія — закупка прадуктаў: мясцовыя вінаград, персікі, алыча, абрыкосы, кавуны. З Еўпаторыі — накірунак на сімферопальскі аэрапорт, дзе адпаведна раскладу рыхтуецца да вылету самалёт на Беларусь. Дарэчы, як крыху раней, ці пазней за наш рэйс, рыхтуюцца ўзляцець авіялайнеры на Казахстан, у Сібір, на Далёкі Усход, да ўзбярэжжа Ледавітага акіяна ды кітайскай мяжы...

Як толькі мы трапілі ў аэрапорт, стала зразумела, што ніхто нікуды не ляціць. І казахі, і сібіракі, і жыхары Далёкага Усходу разам з кітайцамі, а таксама шмат хто яшчэ, сядзелі на сваіх чамаданах у невялікім памяшканні аэравакзала. Па гучнай сувязі кожныя пяць-дзесяць хвілінаў металічны жаночы голас паведамляў аб адмене чарговага авіярэйсу. Адпаведна людзей збіралася ўсё больш і больш. Аэравакзал акружылі міліцыянты. Адзіны раз у жыцці я бачыў такую аграмадную колькасць супрацоўнікаў міліцыі, апранутых у старую парадную форму: белыя фуражкі, белыя кіцелі, цёмна-сіняе, амаль што чорнае галіфэ, хромавыя боты. У хуткім часе гэтая форма зменіцца на знакамітую шэрую, якая праіснуе да самых апошніх дзён Савецкага Саюза.

Як усё адносна ў свеце: толькі што мы ўсхваляваны імкнуліся не спазніцца на пасадку ў свой самалёт, а літаральна праз нейкіх пятнаццаць-дваццаць хвілінаў мы ўжо былі заражаны ўсеагульным страхам. Што здарылася? Вайна? Нейкая буйная катастрофа? Усіх нас падазраюць у глабальным злачынстве, здрадзе Радзіме, спробе захопу самалёта ці аэрапорта, ці Сімферопаля ўвогуле (забруджванні Чорнага мора, пагрозе Турцыі)? Зараз міліцыянты роўнымі шэрагамі пойдуць правяраць дакументы? Абшукваць багаж, пратыкаць шомпаламі кавуны і персікі?

Адказаць, што на самой справе адбывалася, не мог ніхто. Людзі маўкліва займалі свае месцы на лаўках, сядзелі на праходах, спрабавалі ўладкавацца на вялізных падваконніках. Дзеці не бегалі і не шумелі, разумеючы, што адбываецца нешта занадта сур'ёзнае. Нейкае дзіцё не вытрымала і заплакала. Дыхаць станавілася ўсё цяжэй і цяжэй, на вуліцу нікога не выпускалі. Урэшце незнаёмая жанчына страціла прытомнасць. Медсупрацоўнікі вельмі хутка апынуліся побач. У залі плакала ўжо не адно дзіцё. Спробы выйсці на вуліцу заканчваліся нічым. Спытацца што-небудзь было нельга. Любыя размовы перарываліся загадамі заняць сваё месца. Мы адчувалі сябе закладнікамі.

У нейкі момант было загадана пакінуць рэчы на сваіх месцах і ўсім арганізавана выйсці на вуліцу. Па жывым калідоры, паміж міліцыянтаў, мы трапілі на пляцоўку, з якой было бачна лётнае поле. Людзі недаўменна пераглядваліся, перагаворваліся шэптам. Толькі адзін чалавек, здавалася, нічога не баяўся. Гэта быў аграмадны, паголены налыса каўказец, які ўвесь час уголас выказваў прэтэнзіі: «Шьто хацят, то тварят! Я ужэ давно дольжэн улетаць атсюд!..».

Раптам, быццам бы ніадкуль, па руках пайшлі папяровыя кветкі, надзьмуўныя шарыкі, невялікія сцяжкі з чырвонай матэрыі, на якіх было напісана нешта кшталту «Мір» і «Дружба». Адразу натоўп павесялеў, і тут жа «сарафаннае радыё» пачало перадаваць — зноў жа шэптам, ці вельмі нягучна і загадкава, адзін аднаму «на вушка» — кавалачкі інфармацыі, якія, быццам бы ў калейдаскопе, можна было складаць у розных камбінацыях: «...урадавыя «Чайкі...», «...Брэжнеў тут...», «...палітбюро ў поўным складзе...».

Толькі каўказскі чалавек працягваў сваю тэму: «О, шайтан, какіе чайкі! Какой палітбюро! Да пошлі ані падальшь! Мне літаць нада! Я ужі давно должін быць нэ здэсь!..».

Раптам і сапраўды: тры аўтамабілі «Чайка» не вельмі хутка праехалі ў накірунку да лётнага поля. За імі каля дзесяці навюткіх «Ікарусаў» павольна, як на паказе мод, прадэманстравалі натоўпу шчыльна закрытыя белымі фіранкамі салоны. Дружны савецкі калектыў патэнцыяльных авіяпасажыраў сімферопальскага аэрапорта нядружна прагудзеў нешта кшталту ці то прывітання, ці то здзіўлення. Нехта лянява памахаў кветкамі. Я, спрабуючы таксама далучыцца да шматпакутнага свята, выпадкова лопнуў шарык. Тут жа перад шэраговымі міліцыянтамі, якія ўтваралі жывую заслону, з'явіўся афіцэр і пачаў пільна ўглядацца ў тое месца, адкуль пачуўся хлапок. Твары маіх бацькоў выцягнуліся і збялелі. Але абышлося. Афіцэр не стаў расцэньваць інцыдэнт як спробу пакушэння ці дыверсію...

Мы — «масоўка», машыны ды самалёт — «дэкарацыі», а прэзідэнт выходзіў дзе-небудзь зусім у іншым месцы, і здымалі яго зусім іншыя камеры

На ўзлётна-пасадачную паласу, вельмі далёка ад сваіх гледачоў, выехаў незвычайны, бруднага неакрэсленага колеру, з нязвыклай сімволікай на бартах замежны самалёт. «Боінг...» — нягучна пракаментаваў нехта з натоўпу. «Какой «боін-шмоін»?! Когда закончіся этат безабразій? Мне давно нэ здэсь нада быць...» — паляцела ў адказ гнеўная тырада. Тыя дарослыя, хто стаяў вакол, сурова пазіралі на падазронага бунтаўшчыка, але нічога яму не гаварылі. Ад яго свабоды выказванняў мне зрабілася не па сабе. Нават у дзевяцігадовым узросце я ўжо ўсведамляў, што савецкаму чалавеку так гаварыць «нельга».

Калона «Ікарусаў», якую ўзначальвалі тры «Чайкі» — бліскучых, чорнага колеру, легендарных «крамлёўскіх кабінетаў на колах», праехала ў зваротным накірунку.

Вельмі хутка гучнымі камандамі міліцыянтаў натоўп быў развернуты, і зноў, па «жывому калідору», накіраваны да будынка аэравакзала. Нашыя рэчы былі на сваіх месцах. Праз кожныя пяць-дзесяць хвілінаў па гучнай сувязі пачалі аб'яўляцца вылеты рэйсаў, і ў хуткім часе зала чакання лётнай установы Сімферопаля апусцела і ўвайшла ў звыклы рэжым сваёй працы.

У магілёўскім аэрапорце нас сустрэў нехта з татавых знаёмых з машынай. Калі дома мы распакоўвалі свае чамаданы, торбы і пакункі, вынімаючы з іх сакавітыя экзатычныя прадукты і сувеніры, па тэлевізары якраз пачалася «перадача №1» для ўсяго Савецкага Саюза — легендарная «Программа «Время»» пад незабыўнае музычнае суправаджэнне аўтарства Георгія Свірыдава.

Першым блокам навінаў ішла ашаламляльная інфармацыя аб тым, што ў нашую краіну прыляцеў прэзідэнт ЗША (па сенсацыйным узроўні падзея для тагачасных савецкіх абывацеляў прыраўнівалася да прылёту на нашу планету кіраўніка суседняй Галактыкі). Па словах дыктараў, прыляцеў прэзідэнт не абы-куды, а ў Сімферопальскі аэрапорт. І там ужо, як аказалася, «весьсоветскийнародсвоодушевлениемибезотчётнойрадостью» сустракаў лідара Злучаных Штатаў. Прычым народ няблага падрыхтаваўся: нарабіў папяровых кветак, надзьмуў шарыкі (хаця — «...Отставить шарики! Товарищ полковник, в следующий раз вместе со своими шариками пойдёте в отставку!..»), нагатаваў чырвоных сцяжкоў з надпісамі «Мір» і «Дружба», сабраў прадстаўнікоў неабсяжнай Радзімы з самых розных бакоў: з Казахстана! «Ура-а-а!»; З Дальняга Усходу! «Да здравствует...!»; З берагоў Паўночнага Ледавітага акіяна! «Вечно живой...!»; З кітайска-савецкай мяжы! «Даёшь автоматы Калашникова китайского производства! Ура-а-а!!!»; З савецкай Беларусі! «Живе-е-е Белару-у-усь!!!»

(Паўза.)

«...Товарищ полковник, промотайте-ка чуть-чуть назад... Чё-то мне тут показалось...». Выявы людзей на відэазапісе хуценька пабеглі назад, паднімаючы па трапе амерыканскую дэлегацыю спінай да выйсця з самалёта. Кадр змяніўся. «Стоп!» Аграмадны, паголены лысы чэрап нахіліўся вельмі блізка да камеры і спытаўся з пагрозай: «Шьто такой! Я когда-нібудь улечу адсюд?..»

«А-а, так это ж майор Абдулганиев! От уже, бл...дь, изголяется как может, провокатор хренов, твою мать...»

Усе тэленавіны былі прысвечаны падзеі з'яўлення Рычарда Ніксана на савецкай зямлі. Я глядзеў у экран і не мог паверыць сваім вачам: я памятаў амаль што ўсіх гэтых людзей з аэрапорта стомленымі, раздражнёнымі і хаваючымі сваю раздражнёнасць. Але на тэлеэкране ўсё было па-іншаму. Зусім па-іншаму! Голас дыктара чароўным чынам рабіў сітуацыю прынцыпова інакшай: людзі па-сапраўднаму радаваліся, усміхаліся, махалі кветкамі, сцяжкамі. Праўда, бязгучна. Хуткая нарэзка патрэбных кадраў рабіла сапраўдны цуд.

Я нават пачаў думаць, што была яшчэ нейкая іншая група людзей, якая сапраўды так радавалася і крычала — у адрозненне ад нашай, дзе людзі ледзь перасоўвалі ногі ад стомы і спякоты. А на тое, што ў кадрах траляліся знаёмыя твары, я падумаў: гэта проста некаторыя нашы, «сумныя», нейкім чынам патрапілі ў групу тых, «вясёлых», і заразіліся іхным настроем. Але, калі камера рухалася ўздоўж натоўпу, я раптам разгледзеў кавалачак мамінай яркай спадніцы, татаў капялюш ад сонца, а таксама свой локаць і шорты.

Я павольна правёў позірк спачатку на ўласны локаць, потым на шорты — і зразумеў, што гэта ўжо не проста запыленая вопратка, якая боўтаецца на нагах. Перад маімі апушчанымі долу вачыма пералівалася колерамі і зіхацела частка сусветнай гісторыі.

Магчыма, у той момант у маёй свядомасці і адбыўся падзел. З аднаго боку, я яшчэ заставаўся чалавекам, а з іншага — ужо стаў «саўком». У тым сэнсе, што пачаў успрымаць рэчаіснасць дваяка: «тут» — тое, што адбываецца на самой справе, а «там» — тое, што патрэбна «камуністычнай партыі і ўсяму савецкаму народу» (гл. тэлевізар).

Калі б можна было рабіць назвы апавяданняў вельмі доўгімі, то ў нашым выпадку гэта выглядала б наступным чынам: «Шоў павінна працягвацца, а звераферма застаецца звераферамай...». Цяпер я ўпэўнены, што ў «Чайках» ды «Ікарусах», якія праехалі тады перад намі, акрамя кіроўцаў, нікога не было. Так, для праграмы «Время» здымаліся патрэбныя сцэны. Мы — «масоўка», машыны ды самалёт — «дэкарацыі», а прэзідэнт выходзіў дзе-небудзь зусім у іншым месцы, і здымалі яго зусім іншыя камеры.

Шмат чаго мяняецца ў свеце, шмат чаго застаецца ў нязменным выглядзе. Некаторых ужо няма ў жывых. Няма Фрэдзі, няма Сіда. Выходзяць парсы, і персы таксама выходзяць. Сышлі Леанід Брэжнеў і Рычард Ніксан. А Давыд па-ранейшаму працягвае рабіць шоў. Гэта азначае, што і шоў працягваецца, як завяшчаў вялікі Фрэдзі, а дзе-ніднзе (нават да сённяшніх часоў?) і звераферамы застаюцца звераферамамі, не горш, чым у Оруэла...

ВЕРШЫ

РАЗГАДКА ПІРАМІДАЎ

Міхась СКОБЛА

Брат

Паўтараецца дзіўны абрад,
Што ў фальклёры не мае назову, —
Кажа прыхадзень мне: — Я твой брат.
Як прагнаць, як адвадзіць назолу?

Я сваяцтву сапраўднаму рад,
Клічу крэўнікаў на пагасціны.
Ды прыходзіць чужак: — Я твой брат,
І мы жыць у братэрстве павінны.

Мы частуемся, хто чым багат, —
Сваякі па крыві і па духу.
А над вухам ізноў: — Я твой брат...
І той голас, пачуты стократ,
Не прагнаць, як асеннюю муху.

Дзе б ні быў — на гульбе, ці сяўбе,
Я губляюся, прыхадня стрэўшы.
Ён расказвае мне пра сябе,
Ён адзіны ўжо стаў і старэйшы.

І выкрыквае ўжо як загад,
Ужо зáгрудкі ўзяўшы ў зацішку,
Раз, маўляў, ты малодшы мой брат,
То і слухаць павінен брацішку!

З азіяцкай хітрынкай пагляд,
Пра братэрства сваё не змаўкае…
І спытацца мне хочацца: брат,
А імя тваё часам — не Каін?

Званар

Уладзіміру Барташу

Ёсць узыходжанне да звону,
Як свой уласны эверэст.
Без падрыхтоўкі, без дазволу —
Душы прыземленай пратэст.

Душа заўсёды неба прагне,
Душы няпроста дагадзіць.
Душа не хоча жыць у багне,
Што вокам чортавым глядзіць.

Угору дзвесце дваццаць сходак.
Вятры з вакон бяруць разгон.
І думаеш — а як жа продак
Сюды узняў дзвюхтонны звон?

А ўзнагародай за знямогу —
На вежы ўстаць у поўны рост
І пазваніць знянацку Богу
Без пасярэднікаў, наўпрост.

Хай потым гром і навальніца,
Няхай сняжыць, няхай імжыць…
Хоць раз да Бога дазваніцца —
Дзеля такога варта жыць.

Вечар

Божая кароўка заблыталася ў павуціну,
Што на пожні расой вечаровай набракла.
Жабы ў сажалцы зноў вывучаюць
лаціну —
Паўтараць не стамляюцца: аква, аква.

Там — на дыбачкі прыўстае касцёл,
Каб данесці воблакам свой малебен.
Тут — у лозах азваўся быў пасвісцёл,
Ды замоўк, адчуўшы, што не патрэбен.

З-пад страхі гумна выглядае багор.
Вёска на галасы людзей паскупела.
І гучыць, не змаўкаючы, жабін хор —
Перамožна,
на ўвесь бел свет,
а cappella!

Пасля дажджу

А лівень схлынуў і збег за рэчку.
І стала дыхацца лёгка-лёгка.


Фота Джона Кунстадтэра

Раз-пораз вогненную вуздэчку
Пярун прымяраў камусьці далёка.

Сланечнік чуб абтрасаў каля рова
І назіраў, як у дзікай злосці
З вуздэчкі тае і дугі каляровай
Імкліва ўцякае грывасты хтосьці.

Не ведаючы, хто на небе ахвяра,
Звінеў на зямлі сырадой у даёнцы.
І светлым воблакам стала хмара,
Паспавядаўшыся сонцу.

***

Дружылі — не разлі вада.
Хоць за крысо нячысцік тузаў,
Іх не сварылі ні бяда,
Ні трубы медныя, ні муза.

Ці спеў з карчомкі даляцеў,
Ці чорная прабегла котка —
Ён зрокся сябра. Так хацеў.
Сышло. А на душы пякотка.

І што яна — мо Божы знак?
А мо нячысцікавы кукіш?
Прадаў сяброўства за пятак —
Пасля і за мільён не купіш.

Ода шлагбаўму

Мне збрыдзеў дух бульбяна-агародны,
Ад сагаў пра рахманасць — Божа збаў.
Вось сімвал твой, забыты краю родны, —
Пярэсты, у палосачку, шлагбаўм.

Яму заўжды я невыказна рады.
Ён стаў пейзажам нашым не чужы —
Спыняе рух імклівай аўтастрады
І чэргі рэгулюе на мяжы.

Пільнуе раздарожжы, найхарошы,
Нястомны, незгінальны працаўнік.
Ён для краіны зарабляе грошы —
На пенсіі, на школы, на пікнік.

Пад колы фурам кідаецца, смелы,
Тармозіць джыпы з піцерскай братвой…
Шлагбаўм мой родны, бел-чырвона-белы,
Як можна не заўважыць подзвіг твой?

А я заўважыў, і ў якімсь нясцерпе
Мяне няўпынна подумка дзяўбе:
Ты варты быць на гістарычным гербе —
Пагоня скача хай — цераз цябе!

Зямляча, беражы шлагбаўм, як вока,
На дровы не сячы яго, не руш.
І перад ім, як едзеш дзе далёка,
Спыніся і здымі свой капялюш.

***

Падлічыўшы ўсе гузы,
Самы час агойтацца.
Толькі ляж пад абразы —
Адпявалы знойдуцца.

Прагнусавяць некралог
І ўзмахнуць кадзілам.
А я проста так прылёг.
Вам якое дзіва?

Ах, далі ўжо знаць радні?
Ах, заняў вам покуць,
Дзе вы звыклі дзень пры дні
Гойсаць і галёкаць?

Хто галёкаў, той прыціх,
Да дзвярэй падаўся —
Міхаіл Архістраціг
З цёзкам прывітаўся.

Мне падаў святы Пятро
Ключ ад райскай брамы.
Скінуў райскі птах пяро
На падушку прама.

Столь — дзівосны парасон,
Квецень між пазамі…
Незвычайны гэта сон —
Сон пад абразамі.

***

Насалелая выдма лысее.
За прычаламі ясніцца даль.
Піша мора сваю адысею,
Развінуўшы гекзаметры хваль.

Там свае адплываюць героі
Па сваё залатое руно.
Там свае ахілесы і троі,
Для рысталішчаў — тупкае дно.

Штó зямныя імперыі ў славе,
Дзе дачаснікі селі на трон?
Сто вякоў акіяннай дзяржаве,
Дзе нязменны ўладар — Пасейдон.

Барадаты, суровы з аблічча,
Ходзіць ён па зыбучым пяску,
Галіёнамі золата лічыць
І русалкам дае на луску.

Сее жменяй, ніяк не дасее,
Дзе плытчэй, трапяткую кефаль…
Піша мора сваю адысею,
Развінуўшы гекзаметры хваль.

Залатыя Пяскі

Намывала стагоддзямі мора
Залаты свой запас —
Пытляваны сонцам і ветрам,
Шліфаваны жорнамі хваляў
Жоўты пясочак.
Кожнай пясчынцы хацелася
Стаць жамчужынай у чарупіне
Ці адмерваць імгненні
У пясочным гадзінніку —
Падзяляць на каштоўныя унцыі час.
Сонца, мора й пясок як пылок —
Райскі куток.
Але тысячы змеяў
Зладзілі тут свае лежні,
З вінаграднікаў спелых
Сыкала гадаўё…
І тады баязлівыя людзі
Прывезлі на Залатыя Пяскі
Усяго пяць кошыкаў вожыкаў —
Маленькіх, калючых вожыкаў,
Вялікіх адвагай вожыкаў,
І — паўцякалі ўсе змеі,
І знікла зусім гадаўё.

Шчаслівыя людзі —
Сябры-другары балгары,
Зруйнуйце вы помнікі
Макдональдсам і піратам,
Жрыцам кахання, кухмістрам
І залатому цяльцу,
А пастаўце помнік Вожыку —
Вызваліцелю Залатога Пяску!

Вожыкі мілыя,
Хочаце — я дам вам бусі
І куплю вам купэ ў цягніку
Да самой Беларусі?
Бо не магу ужо я
Трываць там гадаўя…

Разгадка пірамідаў

У сонечнай Варне
На плошчы ля ратушы —
Груда камення.
Як маеш прэтэнзіі
Да гарадское ўлады
Ідзеш і кладзеш туды
Свой камень пратэсту.
Расце піраміда на плошчы,
І варненцам лёгка жывецца —
Ніхто з іх не носіць
За пазухай камень.

Усе егіптолагі свету,
Няўжо і цяпер вам няясна,
Хто і навошта
Узвёў піраміды над Нілам?

Ды проста падступны Хеопс
Забраў у фелахаў аазіс.
Нягоднік Рамзес
У засушлівы год
Закапаў у гаршку на беразе Ніла
Апошняе зерне.
А гіцаль Тутанхамон
Прымусіў падданых
Сабраць колькі сціртаў
Вярблюджых калючак
Для сваіх драмадэраў
І ў тэрмін не разлічыўся.

Цярплівы народ
Клаў камень на камень.
А фараоны жылі гэтак доўга —
Як цячэ Ніл лянівы…
Вось і ўся пірамідаў разгадка.
А таму не лічыце мяне экстрэмістам,
Калі выйду на плошчу
З каменем у руцэ.

***

Посцім ці аладкі ў мёд мачаем,
Ці ратуем песняю душу,
Божа, не карай мяне маўчаннем —
Аб адным заўжды Цябе прашу.

Даў ты мне дыханне, даў каханне
І ў чмяліным лузе сенажаць,
Веча вечарэй і мроі ранне —
Як пра ўсё пра гэта прамаўчаць?

Прамаўчаць над срэбным вадаграем,
Поўным весялосці і журбы?
Прамаўчаць, як прагучаць над Краем
Зыкі архангельскае трубы?

Кім названа золатам маўчанне?
Хто ён быў — філосаф, адвакат?
Ёсць маўчанне — як нямка мычанне,
Ёсць маўчанне — безуважны кат.

Ці дамоў вярнуся з падарожжа,
Ці ўдыхну ізноў чужыны дым,
Не карай маўчаннем мяне, Божа, —
Я маліцца буду аб адным.

▶ АПАВЯДАННЕ

АХВЯРА КАМПАНЭЛЫ

Люстра душы

Чэхаў сцвярджаў: вочы — люстра душы чалавека. Калі зірнуць у вочы Алеся Анцікяна, то ўбачыш у іх боль, жаль, надзею, непакору. Жар душы ягонага няскоранага за стагоддзі, шматпакутнага народа. Алесь — мой малодшы паплечнік у слугаванні слову, якое неўспадзеў, сціпла і шчыра западзе ў сэрца чытача пры азнаямленні з ягоным творчым набыткам. У ягоных жылах зліліся гордая, горская армянская бацькава гарачая кроў з памяркоўна-павольнай, беларускай матчынай крывёю — і спарадзілі ў сыне, які нарадзіўся, дарэчы, у Ленінградзе, людскую дабрыню, спагаду і прыязнь у аблямаванні іскрыстага, чулага, чалавечнага гумару.

Творчасць празаіка, а апошнім часам і паэта, грунтуецца на багатым жыццёвым вопыце. Манера стылю Анцікяна нагадвае почырк нашага заўчасна пагаслага земляка Уладзіміра Іванавіча Стэльмашука. Гэта — не абрыдлая сённяшняя модная прыгодніцкая пісаніна, а адлюстраванне складаных чалавечых пачуццяў у жорсткай жыццёвай плыні. Пісьменніцкія вартасці Анцікяна ацэнены як пераможцы конкурса «Залатое пяро» ў намінацыі «Драматургія» дыпломам усебеларускага альманаха «Гоман». І ёсць за што.

Напрыканцы жніўня Аляксандра Францавіча Берасцейскае аддзяленне Саюза беларускіх пісьменнікаў павіншавала з грунтоўным — шасцідзесяцігадовым юбілеем. Да пажадання арыгінальнаму творцу грунтоўных поспехаў у жыцці і працы далучаецца і «Літаратурная Беларусь».

Аляксей Філатаў



Аляксандр АНЦІКЯН

Гісторыя, якую свярбіць расказаць, адбылася нядаўна. На той час я служыў у крымінальным сыску транспартнай міліцыі. Успамінаецца, як у халёпны лістападаўскі вечар зазірнуў да нас у кабінет малады ўстрывожаны мужчына. Назваў сябе ды распавёў пра свае прыгоды ў пагранічным горадзе Брэсце.

То быў вясковы цяльпук, якому напрамілы Бог карцела прыдбаць зімовыя чобаты. А ў той час абсалютнага дэфіцыту як у харчовых, так і ў прамысловых магазінах было — хоць у футбол гуляй; прыстойныя рэчы набываліся ці па вялікім блаце, ці ў спекулянтаў, ці нацянькі — у польскіх чыгуначнікаў. Пагэтаму, атрымаўшы ад дасціпных людзей адпаведную кансультацыю, малады чалавек накіраваўся на месца адстою цеплавозаў, «польскай колеі паньствовай». Тут яму неўспадзеў сустрэўся быстравокі грамадзянін, які спачатку пацікавіўся, што робіць таварыш пшыяцелю ў такім небяспечным месцы, дзе без дай прычыны могуць набіць пысу, абкрасці, а потым паспачуваў і прапанаваў небараку свае паслугі ў набыцці патрэбнага яму абутку. Узяў у разявы грошы, залез у цеплавоз — і-і-і шукай голку ў стозе ці ветру ў полі. Дарэмна чакаў вясковец сэрдабольнага мужычка: бы ў недалёкі Буг ён пурнуў…

Вось тады і вырашыў чалавек звярнуцца па дапамогу ў міліцыю. А ў міліцыі, як усім вядома, працуюць таксама людзі, і нікому з іх не хочацца ў такую непагадзь, калі руплівы гаспадар і сабаку пашкадуе, цягчыся на месца злачынства.

Кінулі на пальцах, і лёс усміхнуўся мне: перабор. Ды, дзякуй Богу, далі ў памагатыя талковага сяржанта — вынюхаў ён патрэбнага нам машыніста. Але той сцвярджае: ніц не вемем і ніц не відзел, пшэпрашам, панове міліцыянты. Скажу шчыра, нічога іншага мы ад яго і не чакалі: паляка на мякіне не правядзеш і без пенёнзы не возьмеш.

Але думай, кепала, бо акрамя дакляравання пацярпелага і такіх-сякіх прыкметаў злачынцы з ягоных слоў — нічагуські не было. Але машынерыя вышуку загула і пачала набіраць абароты.

Зарыентаваны ўсе службы. Ля цеплавоза засела варта. Ахвяра наша прагледзела ўсе фотаальбомы са злачынцамі магчымых фарбаў і колераў. Так, не здарма гаворыцца: хто шукае, той знойдзе. Праз паўтыдня каля цеплавоза паляка вушлы сяржант затрымаў асобу, прыкметы якой супадалі з апісаннем пацярпелага. Праводзім афіцыйнае апазнанне — і наш злыбяда-пакупнік зімовых чабоцяў адразу пазнае гіцля.

Перад намі сядзеў тыпус гадкоў з паўсотню, які ўсенька адмаўляў, адно далдоніў, што хлопец, якога ён бачыць першы раз у жыцці, шчыра памыляецца. Не, такога «моцнага арэшка» можна было «раскалоць» толькі грунтоўнымі доказамі… І, наўздзіў, дапамог у гэтым паляк-машыніст, якому было абяцана не дасылаць кіраўніцтву непрыемную вестку пра ягоную адмову органам прававога парадку «Звёнздску Радзецкога».

Затрыманы нутром унюхаў, што яму, сем разоў судзімаму за махлярства, надта небяспечнаму рэцэдывісту хавацца няма куды, прызнаўся ды дабавіў, што дурняў трэба вучыць, як жыць на белым свеце. У душы я быў з ім шчыра згодны.

Замкнуў затрыманага ў ізалятар часовага ўтрымання, пачаў рыхтаваць матэрыялы следства. І раптам бы гром з яснага неба! Вызывае раба божага Анцікяна начальнік аддзела і паведамляе, што на мяне ў транспартную пракуратуру прыйшла скарга ад затрыманага Л, і на заўтра прызначана аператыўная нарада, на якой будзе прысутнічаць пракурор.

Нарада пачалася з зачытвання начальнікам той скаргі прыблізна такога зместу:

«У такім та годзе, месяцы, дня я быў затрыманы міліцыяй каля польскага цеплавоза і мяне заставілі прызнацца ў злачынстве, якога я не рабіў. Асабліва нацыскаў опер па прозвішчы А., які папрасіў выйсці ўсіх супрацоўнікаў з кабінета і пачаў выкарыстоўваць меры фізічнага і медыцынскага ўздзеяння па сістэме Кампанэлы. І пасля гэтых пякельных здзекаў, калі мой арганізм неяк міжволі пачаў вылазіць са скуры і я ўжо развітваўся з жыццём, мне давялося прызнацца ў тым, чаго на самай справе я не рабіў.

У сувязі з гэтым прашу ласкава абараніць мяне ад гэтай лютае пачвары, бо ён мяне скалечыць ці заб'е. І калі такое здарыцца, то ляжа на сумленне пракурора. Подпіс і яшчэ раз дата».

Пракурор дадаў, што ўчора ён апытваў затрыманага, і той усё напісанае пацвердзіў, а пры ўпамінанні оперупаўнаважанага А. пачаў выкручваць сабе рукі, рваць на галаве валасы і біцца ёю аб сцяну.

У кабінеце запанавала напятая ціша, братва круціла галовы ці ў бок начальніка, ці пракурора, ці мяне. Нарэшце нехта нясмела спытаў:

— А хто гэта такі — Кампанэла?

Начальнік лісліва, з надзеяй зірнуў на пракурора, і той запэўніў вобчаства, што Кампанэла — правая рука Беніта Мусаліні і ў Італіі ужываў у адносінах да ворагаў нацыі драпежныя катаванні, якія не пакідалі слядоў на целе ахвяры. Далей ён падаўся ў гісторыю фашызму, адкрыў нам вочы на ягоныя зверствы і давёў, што Мусаліні павесілі італійскія партызаны, а Кампанэлу асудзілі на Нюрнбергскім працэсе. Метады ягоных катаванняў да сяго дня патрабуюць вывучэння, ды ў пракуратуры мяркуюць, што супрацоўнік А. сёння падзеліцца з намі сваімі «дасягненнямі».

Добры тузін вачэй глядзеў толькі на мяне. Канечне, у гэтай сітуацыі, калі да зарэзу трэба было дакляраваць, што ты — «не вярблюд», я з цяжкасцю ўспомніў, хто такі Кампанэла. Думкі верталётным вінтом закруціліся ў галаве, шукаючы хоць нейкі праменьчык святла. І нарэшце:

— Я не ўпэўнены, але ўспамінаецца, што Кампанэла — гэта манах, які жыў у сярэднявеччы, і ніякім саталітам Мусаліні практычна не мог быць, калі, безумоўна, не зрабіў яго Творца бессмяротным.

Шмат хто ўсміхнуўся, узрадаваўся, успомніў школьныя і інстытуцкія праграмы, пра манаскія ордэны, служкам якіх быў менавіта Кампанэла. Тады начальнік аддзела транспартнай міліцыі прамовіў «залатое» слова: катэгарычна ні табе, А., ні другім не належыць павучаць пракурора, талкаваць яму пра Кампанэлу, што манахі ў свой час былі інквізітарамі, якія не толькі адмыслова катавалі, але і палілі людзей.

І калі гэта не той самы Кампанэла, то, напэўна, які-небудзь ягоны нашчадак, і сакрэты катавання перадаваліся ад дзеда да ўнука. Пасля такое высновы на мяне ўзвалілі ўсе вядомыя і невядомыя грахі лінейнага аддзела. Забіла асінавы кол у дол заключнае слова палкоўніка: «Мы яшчэ даведаемся пра гэтыя кампанэлаўскія лялечкі-цацачкі, і ты за іх адказаш па поўнай праграме, «вплоть до партийного билета». А пакуль я сваім загадам забараняю табе працягваць службу, накладаю хатні арышт… скардзіся хоць манаху, хоць самому Госпаду Богу. І не ўздумай суадносіцца з затрыманым і ціснуць на яго праз тваіх сэрдабольных ілжэтаварышаў».

Безумоўна, насталі чорныя дні, але я, кроў з носа, павінен быў выбіць з прашчалыгі глебу з-пад ног і апраўдаць сябе ў вачах сяброў, якія добра ведалі, што я чысты, як сокал у сінім небе.

Па-першае, я павінен быў адсачыць жыццё і дзейнасць гэтага манаха і выйсці на Нюрнбергскі працэс. А па-другое, я не адразу адчуў, што ў гэтага затрыманага нешта не тое з галавою, мо звіліна трэснула? — і ён даўмеў, як адвесці мяне ад следства, каб, крый Божа, не разблыталіся ягоныя праграшэнні і злачынствы. І, увогуле, хворыя на галаву людзі — майстры на ўсялякія цуда-фантазіі.

У абласной бібліятэцы мне ветліва і адразу знайшлі патрэбныя крыніцы. Чытаю, выпісваю: «Кампанэла Джавані Даменіка нарадзіўся 05.09.1568 у горадзе Стыла (Калабрыя, Італія). Памёр 21.05.1639 г. Італійскі філосаф, адзін з прадстаўнікоў ранняга ўтапічнага камунізму, з сям'і дробнага рамесніка. Манаскае імя «Тамазо». У 1559 годзе за вальнадумства і падрыхтоўку змовы супраць іспанскага ўціску ў Неапалітанскім крулеўстве асуджаны пажыццёва. 27 гадоў адбыў у турме, дзе пісаў кнігі. У 1602 годзе стварыў адзін з першых трактатаў утапічнага камунізму «Горад Сонца»».

Разабраўся з Кампанэлам, прагледзеў матэрыялы Нюрнберга, і здалёк падобнага прозвішча не знайшоў. Зрабіў выпіскі, нават засведчыў пячаткаю бібліятэкі. На наступны дзень пачаў высняць псіхічны стан грамадзяніна Л.

Афіцыйны запыт не мог зрабіць, выручылі сяброўскія сувязі. У мужчыны было столькі псіхічнай паталогіі, што ён мог бы прэтэндаваць на ўнясенне ў кнігу рэкордаў Гінэса.

Надта доўга ў сяброўскіх колах сярод супрацоўнікаў успаміналася гэтая скарга псіхічнахворага, як анекдот.

А для мяне асабіста Кампанэла, гэты манах-утапіст, зрабіўся бы родны. Я поўніўся радасцю, што ён не вынаходзіў адмысловых катаванняў, а быў шчырым летуценнікам і любіў сваю Італію.

Зусім нядаўна давялося сустрэцца са старым знаёмым на, так бы мовіць, Брэсцкім Арбаце. Ён кінуўся ў абдымкі і папрасіў не крыўдаваць на старое — справу мінулую.

А я і не крыўдую, бо на пакрыўджаных, як вядома, ваду возяць, а ў мяне, прабачце, спіна баліць, панская хвароба — крыжовы радыкуліт, зараза, закатаваў.

Пераклаў з расійскай
Аляксей Філатаў



ПОГЛЯД

РАСІЯ ЯК МІФАТВОРЦА

◂ **Працяг. Пачатак на стар. 9 (1).**

Так, гэты кыргыз пісаў на мове расійскай. Але для таго, каб прарычаць на ўвесь свет (найперш, на расійскамоўны свет) кыргызскае паданне пра манкуртаў (ці не расійскамоўным кыргызам адрасаванае?) і ўстурбаваць гэты свет лёсам каня Гульсары, у вобразе якога толькі глухі, сляпы і бяздушны не адчуе болю і енку Кыргызстана, які канаў у расійскім палоне.

Як добра жывецца народам пад расійскім крысом, якога росквіту яны дасягнулі, мы бачым на прыкладах з жыцця крымскіх татараў, карачаеўцаў, чаркесаў, паволжскіх немцаў, карэйцаў, туркаў-месхетынцаў, балкарцаў, курдаў, тых жа інгушоў і чачэнцаў. Гэта пра іх, вышэйпералічаных, гаворыцца ў справаздачы хельсінскай групы па правах чалавека (1991 г.): «Як правіла, дэпартацыі праходзілі без папярэджання. Перасяленню падлягалі ўсе прадстаўнікі вызначанай народнасці — мужчыны, жанчыны, старыя, хворыя, інваліды. Некаторым удавалася сабраць за выдзеленыя хвіліны сякія-такія пажыткі, іншым увогуле нічога не дазвалялася браць з сабой. Аўтаматчыкі заганялі іх спачатку ў грузавікі, а затым у таварныя вагоны, у якіх іх чакаў шлях працягласцю ад некалькіх дзён да некалькіх тыдняў у далёкія раёны Сярэдняй Азіі. Там іх выгружалі і пакідалі на волю лёсу з мізэрнымі запасамі. Многія тысячы паміралі ў дарозе. Яшчэ болей загінулі ад голаду, холаду і хваробаў у месцах высылкі...»

А што вы ведаеце пра чукчаў, акрамя зняважлівых анекдотаў? І, магчыма, мала хто ведае пра нацыянальна-вызвольнае, залітае крывёю, паўстанне тывінцаў у 30-х гадах. Але я не веру, што гэтага не ведае адданы слуга Пуціна Сяргей Шойгу. Скарыліся тывінцы? Спытацца б у іх. Але адказ ужо вядомы. Бо сёння насельніцтва Тывы больш чым напалову складаюць чыстакроўныя арый… прабачаюся, расійцы. Магчыма, удзячныя Расіі карэлафіны? Ці іжорцы? Ці нанайцы? Ці вепсы, якіх засталося не болей за сотню і якія так і не змаглі пад апякунствам Расіі стварыць сваёй пісьмовасці?

А вось — дадзеныя перапісаў: у 1929 годзе на абсягах расійскай федэратыўнай дзяржавы існавала 191 народнасць, у 1979 годзе іх было ўжо 132. Удзячныя Расіі народы зыходзяць у нябыт. Застаюцца няўдзячныя. Яны хочуць волі. І яны яе здабудуць.

Міхась Булавацкі

__P.S.__ Сумны жарт з інтэрнэткаментароў да сёлетняга еўрабачання (там беларуская спявачка Алена Ланская атрымала ад Расіі нуль): «Беларусь расійцы лічаць сваёй тэрыторыяй і таму не галасавалі за Алену. За спявачку ж ад сваёй краіны галасаваць нельга». Я не збіраюся абараняць спявачку. Магчыма, яна і заслугоўвала такой адзнакі. Я — пра жарт. У кожным жарце, кажуць, ёсць доля праўды. Тут гэтая доля досыць вялікая. Паглядзіце расійскі «Словарь иностранных слов». Там знойдзеце словы, запазычаныя з розных моваў, у тым ліку моваў народаў СССР — казахаў, украінцаў ды іншых. Але не знойдзеце слоў, запазычаных з беларускай мовы, хаця такіх слоў насамрэч шмат. Гэта ж не «иностранные» словы. Паглядзіце расійскі «Мифологический словарь». Там знойдзеце артыкулы пра багоў ды іншых міфалагічных істотаў розных народаў, нават удмуртаў, эскімосаў і чамораў, але не знойдзеце багоў беларускай міфалогіі. Беларусі як асобнай краіны для расійцаў дагэтуль не існуе?..

ВЕРШЫ

СТАРАДАЎНІЯ ПРЫСЯГІ

ЮДЗІТА ВАЙЧУНАЙТЭ
(1937–2001)

Архіў, 1863

__1. Зельня__
Зноў старадаўняя зельня зімою. Бераг мора. Завея.
Запарушаны дзесьці ў дарозе рыдваны.
Гайдаецца ціха забытае крэсла.
Ламаюць вялізныя і вечназялёныя
стогадовыя сосны — мяне зноў калоціць.
Можа,
гэтае сухое сонца лекавых зёлак і рыбны смурод
з-пад аброслай пухоўкай страхі
(у рыбакоў на падушках
спіць паранены бунтаўнік) праб’ецца вонкі…
Не ўратавала б
нават смерць ад цябе —
ад першабытных пранізлівых чараў…
Ізноў галашу я ад дзіўнай, забойчай уцехі,
прыпаўшы
да святой скрываўленай кашулі….
І цвёрдая, нібы скалы,
заледзянелая на зломе хваля. Бераг мора.
Завея.

__2. Тэлеграма__
НЕ РАССТРЭЛЬВАЙЦЕ МАЙГО КАХАНАГА
Снежны дзень. Замглёны дзедаўскі тэлеграф
зноў прачыняе цяжкія дзверы.
Я хаваю свой твар
у пахкую маміну муфту.
Я не хачу чуць, як на вуліцы смяюцца жандары…
Я сцярплю здзекі і гвалт,
але толькі не ноч,
калі мроіцца ў цёмным пакоі
яшчэ пустая труна без века.

Я ПРАШУ: НЕ РАССТРЭЛЬВАЙЦЕ КАХАНАГА
Ён прыходзіць у сне
(вартавыя хаваюцца ў нішах)
яшчэ хлапечыя голыя грудзі —
гэтую жывую мішэнь са стрэльбішчаў —
падставіўшы натоўпу…
………………………..
У тумане —
пад жалобным вэлюмам удавы —
нявесты заплаканыя вочы дзіцячыя.
Спісаную прыгожым почыркам паперу
падпішае пісьмавод
(ліст экзекуцыі).

__3. Ключніца__
Я — дачка збяднелае шляхты.
Бразгаю ключамі дваранін.
(Усю ноч гігаталі коні —
бунтоўна, змрочна, шалёна.)
Усю ноч я гатавала вячэру
(яны бясконца ішлі і ішлі.)
Нібы вільготнае сонца
ўзняло непрыгожы змучаны твар.
І ўсміхалася светлабровым братам з лесу
(за камерай шамаціць
на золку, імкнучыся ўгору, жыта…)
Іду этапам у Самару.

1969



Паўстанец

Пасля 1863 года ў Парыжы Адамас Бітэ вёў цяжкое эмігранцкае жыццё: драбніў камяні, запальваў вулічныя ліхтары.

Глядзець праз веццe ў зеленаватае неба
на імшысты колер вулічных пліт
(калі ўсю ноч сніцца Кракяйскі лес,
пад дажджом і ў прыцемку,
калі паўстанцы дзесьці на невялікім
пляцы паміраюць
перад вялізным натоўпам),
каб ад ветра захінуцца
ў заношаны дзевятнаццацівечны
палітон.
І на вуліцах чужога гаманкога места
запаліць ліхтар за ліхтаром,
глядзець, як у адбітках барыкад
і сузор’яў цьмяна гарыць газ…
Цярпець праз малую на глобусе краіну,
занурыцца тварам у далёкі яе дым,
дзе мае прадзяды сякерай і паданнямі
выконваюць старадаўнія прысягі…

1965

АЛЬБІНАС ЖУКАЎСКАС

Вісельня — сабе

Пыл па Лукішках ганяюць вятры.
Дрэмле за мурам Якуб і сапе…
Вільні найлепшыя цесляры
Вісельню ставяць не іншым — сабе.

Лупяць сякеры ліхія…
Хутка з жыццём развітацца
З зашмаргаю на шыі
Вызначыў лёс паўстанцу.

Добра Якубу — муры
Глушаць пакут адгалоскі:
Церпіць не ён, не цары,
А за яго — Каліноўскі.

ЁНАС СТРАЛКУНАС

Паранены паўстанец, 1864 г.
Вадохрышча, Новы Год прыйшоў…
Клубніцы, трускалкі з начное столі…
Кастрыца сыплецца на стол,
Вада пасохлыя вусны моліць.

Шэпт лесу, косаў звонкі спеў…
Марш войска… Крывавыя відзежы.
Што сёння піў ты? Што сёння еў?
Хаваеш што ў прабітай адзежы?

Вісельня ў Вільні… Ў вёсках пажар…
Слупом шугае агонь у айчыне,
Сажа спадае, спадае на твар,
Сыходзіць ноч, ды ранак не стыне…

29.VIII.1969

Пераклаў з летувіскай Лявон Баршчэўскі.

РАЗМОВА НА ДОСВІТКУ

Анатоль ВЯРЦІНСКІ

Рыхтуючыся да ўдзелу ў паэтычным свяце «Бабіна лета ў Белаазёрску з Нінай Мацяш», прымеркаваным сёлета да 70-годдзя паэтэсы, знайшоў раптам амаль паўзабыты, прысвечаны ёй верш, пад назовам «Размова на досвітку». З нейкай прычыны не зусім, здаецца, завершаны. І вось цяпер, пад уражаннем ад свята, рашыў апублікаваць яго з нязначнымі праўкамі.

Тры дні таму, за горадам, на дачы,
дакладней — на сваёй мансардзе дачнай,
у прадсвітальнай летняй цішыні
я абудзіўся з думкай пра цябе
(ці ні прыснілася мне перад гэтым?).
Звярнуўся ў думках да цябе з пытаннем:
«Ці ведаеш, ці ўяўляеш ты,
як многа для мяне ты значыш?
Як важны для мяне твой лёс?»
Прамовіў «для мяне» і спахапіўся,
і стаў вініцца ў той жа міг
за тое, што вось так эгаістычна
пачаў на досвітку з табой размову.
Крыху ўдакладніў сваё пытанне:
«Ці ведаеш, ці ўяўляеш ты,
як многа значыш ты для нас,
для сваіх блізкіх, па крыві і духу?
Для ўсёй свае шматлікае сябрыны?
Для ўсяе роднае краіны?
Ты — са сваёй усмешкай і слязой,
Ты — са сваёю доляй і нядоляй,
Ты — з сэрцам, сэрцайкам сваім,
такім вялікім і такім дрыготкім,
такім трывалым і такім пяшчотным,
ты — са сваімі праўдай і сумленнем,
ну і, вядома ж, са сваім «Агменем»…
Ці ведаеш, ці ўсведамляеш ты?»
І ў перадранішнім святле
мне уявілася твая усмешка —
усмешка незвычайная твая,
і мудрая, і крышку іранічная.
І ў перадсвітальнай цішыні
пачуўся ў адказ твой голас:
«Чаму пра гэта я павінна ведаць?
Чаму павінна гэта ўяўляць?
Усведамляць павінна гэта?
Мне што, няма чаго рабіць?
Займацца чым? Пра іншае што думаць?
Які мой лёс, якая сама ёсць —
такую і прымайце, ягамосць.
Вам лепей знаць, што значу я для вас.
А мне відней, што для мяне вы значыце,
вы — блізкія па духу і крыві,
мая сябрына і мая краіна.
Ямчэй прымошчваю я на плячах свой крыж
і вам усім кажу я: «Будзем!
Ды рушайма далей сваёй дарогай!»…

ПАМЯТНАЕ

АДЗІН З УСІХ

Аляксей ФІЛАТАЎ

З хаосу да прасветленасці

Уладзімір Андрэевіч Калеснік… 17 верасня — ягоны дзень народзінаў. Яму было б 91…

Як толькі азорыць свядомасць гэтае імя, адкідаеш прэч пацяруху паўсядзённасці, застываеш у захапленні і павазе да асілка беларускае думкі, якая ахапіла невымерную прастору часу ў літаратуразнаўстве і гуманітарнай навуцы ўвогуле.

Сорак гадоў я хадзіў з ім па адной зямлі, дыхаў адным паветрам, цешыў вока веліччу Лукаўскага возера на Маларытчыне і дубоў на кладах ягонае выспы, не мог надыхацца грыбным водарам Збунінскага лесу; не наслухаўся ягоным палымяным словам на лекцыях і паседжаннях літаратурнага абласнога аб'яднання — і Настаўнік нязменна выводзіў мяне «з хаосу асабістых пачуццяў да той прасветленасці духу, якая была сапраўдным натхненнем, напружаннем стваральных сіл душы».

Я верыў у Яго і веру па сёння, як далёкі мой продак верыў у Бога ўрадлівасці і кахання — прыгожага юнака Ярылу ў ільняных белых строях на белым кані. Я маю на гэта крышачку права, бо так і нераспазнаную, травіяльна гаворачы, літаратурнай грамадскасцю канцэпцыю ДАБРА на самым пачатку майго слугавання роднам слову і зямлі заўважыў менавіта Ён.

Што б ні было, што б ні думалі людцы добрыя, ні гаварылі, але, напэўна, і я быў патрэбны Яму. Можа, дзеля нават таго, каб адарвацца ад паўсядзённай, самазнішчальнай працы сваёй, адпачыць ад яе побач з наіўна-прымітыўнаю, але шчыраю, як Ён сам сказаў у водгуку на маю кнігу прозы «Дарога», «эксцэнтрычнаю» маёю натураю. Надае рашучасці выказаць некалькі радкоў падзякі «Плытагону» нашае берасцейскае паэтычнае флатыліі аўтограф Уладзіміра Андрэевіча на кніжцы «Тварэнне легенды»: «Лявоне, няхай не гасне агеньчык палескага гумару. 31.X.1990, Брэст».

Спачатку было завочнае знаёмства цераз прыёмнага дзядзьку майго настаўніка, Калеснікавага студэнта-завочніка, франтавіка Леаніда Мяфодзіевіча Крышпіновіча, які дужа шанаваў прафесара, а той адказваў яму ўзаемнасцю.

Потым закадычны мой дружбак, казацкага пошыбу дзяцюк — палешук Мікола Крываблоцкі цягне мяне з чыгуначнага тэхнікума ад рэек, шпалаў, накладак, падкладак, кастылёў і шурупаў, астракоў і крыжавінаў у свой педагагічны інстытут на публічную лекцыю, якую будзе чытаць «свяціла, сам Калеснік» пра мастацтва ранняга Рэнесанса.

За кафедрай высокі, хударлявы мужчына працуе. Працуе натхнёна, азартна: свяжутая кашуля расшпілена на два верхнія гузікі, вузел гальштука паслаблены, пад колер гальштука, цёмна-карычневы пінжак вісіць на спінцы крэсла, у другой руцэ ўказка, у другой — белая насоўка, якою раз-пораз аціраюцца кроплі поту з ілба.



Уладзімір Калеснік і Уладзімір Караткевіч (у лодцы ззаду)

Абсалютна нічога не цямячы ўвогуле ў мастацтве і асабліва эпохі Рэнесанса, я — «глух і нем», адно бачу Калеснікаў лоб, залысінкі над ім у павуцінні таненькіх сіняватых пражылак. Словы вылунваюць з вуснаў, а лоб моршчыцца, пражылкі збіраюцца ў ладнаваты вузельчык: новая думка ўсплыла, падштурхоўвае папярэднюю, але ёй яшчэ рана волю даваць, змаганне ідзе. Нарэшце вузел выпроствяецца, разыходзіцца. Чалавек усміхаецца і вядзе далей свой высока-інтэлектуальны рэй…

Першыя мае опусы паказаў Уладзіміру Андрэевічу дзядзька Лявон. То былі кароценькае апавяданне «Жаваранак» і старонак пад паўсотню дакументальная аповесць пра трагічны пачатак вайны. На вялікія нашы радасць і здзіўленне Калеснік не выкінуў іх, нават не паленаваўся занесці на абласное радыё і ў «Зарю».

Маларыцкі Эміль Заля

Акрылёны такім поспехам, дзевятнаццацігадовы пуцейны брыгадзір набраўся нахабства прачытаць некалькі абразкоў на паседжанні абласнога літаратурнага аб'яднання, якое акрылёна вёў «сам Калеснік». Тут і ўчыніў ён мне і Ватэрлоо, і Сталінград. У адным з абразкоў з гневам распавядалася пра бамбізу-драпежніка, мурлатага пуцейца-фабзайца, які заспеў на гарышчы брыгаднае кладоўкі сямейку кажаноў. Палапаў іх, сляпых пры дзённым святле, і спаліў навідавоку рабочых паяльнаю лямпаю.

Узрушанасці, абурэнню старэйшых «Берасцейскага вогнішча» не было межаў. Чыстай вады натуралізм! Што захачу, тое і вараччу, звілін, думкі ў даўбешцы не маеш! Маларыцкі Эміль Заля вышукаўся! ДЗЕ АБАГУЛЬНЕННЕ, ДЗЕ ТЫПІЗАЦЫЯ? Пазітывізм з адмаўленнем законаў рэчаіснасці, адзін крок да абстракцыянізму, калі мазня аслінам хвастом прызнаецца шэдэўрам жывапісу!.. — на ўвесь рэдактарскі кабінет і напрыканцы сабе пад нос: — Цяля божае, апавядання скляпаць не можа, замалёўкі крэмзае.

Пасля такога прачуханца надоўга прапала ў мяне ахвота да прыгожага пісьменства, і нашы стасункі насілі толькі чыста навукова-гаспадарчы (ад слова вучыцца) характар.

Не дапамог і Мяленцьеў

— Ты б зайшоў у інстытут. Справа ёсць, — падаўгу да сесіі пазваніў ён на мой чыгуначны «лінейны»тэлефон.

Ногі ў рукі. Падбегам. Чакае ў фае першага паверха ля саменькіх дзвярэй са скруткам ватману. Разгарнуў скрутак з адмысловымі, хоць і ад ягонай левай рукі, чарцяжамі.

То дзверы ў гараж. Нарэшце пляцадвялі, два гады качарыжылі. Хоць ты і спатыкнуўся на чарчэнні ў тваім чыгуначным інстытуце, ды бачыш, кумекаеш штосьці-небудзь?

— Бачу. Завесы фасонныя, шпінгалеты, бы ў салдацкай трохлінейцы затворы, а што гэта за кавалак жалеза з дзіркамі па канцах?

— Стрэлачны замок. Гэта ж табе не Плюшкінаў свіран-свінінец.

— А-а, замок Мяленцьева.

— То-та, пакуль другі ключ не ўставіш, першы не вымеш і дзверы не адчыніш. Не дурань быў гэты ваш, як яго?

— Мяленцьеў.

— Знойдзеш такі? У вашай майстэрні зробяць такія завесы й затворы?

— З завесамі няма праблем. Нашы Ляўшы самому маршалку Пілсудскему сейф змайстравалі, а вось замок. Усе стрэлкі цэнтралізавалі, на аўтаматыку паставілі, а замкі на металалом здалі.

— Пашахонцы, пачакаць не маглі.

— Давайце чарцяжы, шукаць будзем.

— Шукай, заплачу. Толькі каб памеры вытрымалі…

Абзваніў усе дванаццаць акалоткаў, абгледзелі ўсе купы лому — замка не было. Прашу помачы ў сувязістаў, на ўласныя страх і рызыку выдзерлі «мяленцьева».

Зося Міхайлаўна не шкадавала ні пітва, ні закускі: слесары не шкадавалі рук, вышпукавалі ўсё дбайненька, камар і той не ўточыць нос.

Вось і малайчына. Прыходзь на талаку. Алёша Бакуменка абяцаў салдацікаў падкінуць — ты і пакіруеш, то ж дарожны, нават маставы, майстар і ў вайсковым будатрадзе крыху падубасіў, а то звычайны гараж…

Палякі ў костку цэглу клалі

Акурат перад талакою параніў я сабе касою руку. Добра пацягнуў. Знаёмы хірург чыгуначнай бальніцы тры швы паклаў, пазямляцку без замарозкі: хутчэй зажыве. Уладзімір Андрэевіч на такую аказію:

— Дома сядзі, надта не гаруй ды і не радуйся, тваё ад цябе не ўцячэ, калі зацягне, наведаешся. А ваякамі я і сам пакамандую…

Нарэшце зацягнула.

Малінавага колеру «масквічыкам», як ахрысціў яго Караткевіч, «божай кароўкаю» з адным толькі сядзеннем кіроўцы (уласнымі рукамі рамантуе машыну ад рухавіка да бампера) за Трышынскія могілкі дапінаемся.

— Халера на яго, пакуль з таго горада выедзеш, у той Спакойны завулак уціснешся, усе нервы папаліш…

Уціснуліся, нервы не ўсе спалілі, удвух увіхаемся, па-пуцейску сказаўшы, паточна-звеннявым метадам. Ён — старшы, я — падсобны. Маўчыць. Толькі вокам павядзе — цэменту падбаўлю, галавою хітне — вады плясну, на жвір пальцам пакажа — пару шуфлёў падкіну, у ацынкаванай балеі ўсенька на зацірку раскалачу. Леваю на масцярок раствор пакладзе, адмысловенька цаглін паставіць, разоў з пяць і адвесам, і «васэрвагаю» — ураўнем праверыць. Расцуць і «яма», і паграбок. Пад вечар загаварыў:

— Я — да Зосі. Папалуднаваць час. А ты падлогу тут выкладзі. Да ночы залієм. Пацяху даў «кароўцы» задні ход.

На каленях поўзаю, носам нюхаю, намагаюся, каб шчылюбінкі не было. Выклаў, жвірком прыцерушыў, кірзачамі ўтаптаў, венічкам вымеў, даланёю прыгладзіў.

Вяртаецца. Прыгнуўся ў варосях, на калені абаперся, доўга то адным, то другім вокам глядзеў на мае патугі. Нарэшце:

— А палякі, Лявоне, цэглу ў костку клалі… Хадзем, чарвяка заморым.

— Не, цэглу ў костку пастаўлю!

Еш, Лявоне, еш

Залілі падлогу, зацерлі, заглянцавалі, зажалязнілі, мосцімся ў самаходзік. Раскрывае гаспадар гаспадыніну торбу — авохці мне: салаты, грыбочкі, нейкі булёнчык у тэрмаску, кілбаска, вяндлінка, нават бульбачка з курыным сцягном. Вочы разбегліся, слінаю захлынаюся, пакую за абедзьве шчакі.

А Ён успароў нейкім багнэтам скрынку ялавічыны і гэтым жа «мечэтэ» сілкуецца, у слоікі, міскі, талеркі і вокам не вядзе. «Ну, думаю сабе, — Ён не зазірае, дай я Яму ў скрынку зазірну. — І цап відэльцам кавалак тлусцейшага, хоць не надта ялавічыну люблю. Калеснік скрынку на калені мне бац і корд свой у «бардачок» паклаў. «А, маць тваю, еш, Лявоне, еш, табе трэба пад'есці!..»

Перад тым як перайсці ад «навукова-гаспадарчых» нашых з Настаўнікам стасункаў толькі да «навуковых», дакладваю спадарству, што замок той Мяленцьева «браткі» рассакрэцілі. Дасканала падмялі «Божае кароўкі» прытулак. І Уладзімір Андрэевіч найболей убіваўся па тым паляўнічым багнэце, набытым у час вандроўкі з Янкам Брылём ля берагоў Ледавітага акіяна…

Давай заліковую

Уладзімір Андрэевіч не мог назваць настаўнікам чалавека, які не аваладаў дасканала фальклёрам і не навучыўся выразна выказваць свае і чужыя думкі, таму з першага да апошняга дня працы ў нашым інстытуце сам выкладаў і фальклёр, і выразнае чытанне. Пра што ў нашай «Сінявокай» ходзіць шмат прыпавесцяў і пагудак. Першую я пачуў ад таго самага «казака» — Крываблоцкага.

— З грахом напалам аджаваў я два пытанні з білета, думаю сабе, траяк будзе. А прафесар дадатковае задае.

— А скажы мне, Мікола, з кім-чым народ наш дзеўку-красу параўноўвае?

— З калінаю краснаю, з лябёдкаю белаю.

— Праўда твая, а хлопца-малайца?

— З дубам! — стрэльнуў Мікола.

— Сам ты, хлопча, дуб-дубок, шызы галубок, сокале ясны, явар кучаравы! Вучы як след!

Кудзеркаваты, бы эфіоп, Мікола заліковую кніжку — у бакавую кішэню майго лапсердачка (на экзаменах пазычыў), і след яго прастыг, бы ветрам чалавека здзьмула.

Сесія да фінішу ідзе, спадае і Крываблоцкага казацкая пыха: «хвост» вісіць, у Маларыце жонка з дачушкаю чакаюць. Стыпендыя да зарэзу патрэбна… І раптам Уладзімір Андрэевіч на калідоры: «Чаго хваста падціснуў? Дзяцей майстраваць мастак, а іх жа карміць трэба. Давай, давай заліковую!..» І паставіў «добра» ў калідоры, на падваконні.

На прастор

Нявесту майго малодшага брата фальклёр, як яна сама ўспамінала, Богу дзякаваць, абмінуў, бо яна вучылася на факультэце пачатковых класаў, а вось выразнае чытанне…

Ціхмянае дзяўчо ў рудзенькай дзятдомаўскай сукеначцы з белым акаруначкам па каўнерыку, але шыракаватае, і не толькі ў сялянскай костцы, нешта піскнула ўвобміг асіплым галаском, а мэтр расправіў таксама ёмістыя свае грудзі:

— Ну, што ж ты, крыжаначка, із-за вострава на стрыжань? Адразу, адразу выграбай на прастор рачной валны!..

І сёння няёмка

У тым, што я збег з трэцяга курса чыгуначнага інстытута і паступіў у педагагічны, паспрыяў і Уладзімір Андрэевіч:

— Хопіць табе ўжо тых рэек і шпалаў, рыхтуйся да нас. Мо без памылак пісаць будзеш ды розуму крыху ўхопіш.

Першай кантрольнай была работа па фальклёры. Таго запасу, што застаўся з дзяцінства (пераважна перапоўненых вульгарызмам прыпеўкі ды парачка паданняў), на яе не хапала. Ды выручыла мая ж, ляхавецкая, настаўніца роднай мовы, з якой звёў лёс у адной групе завочнага аддзялення. Па маёй парадзе загадала яна сваім сённяшнім вучням запісаць ад бацькоў і ба-

буляў усенькае, на што яны былі здатны. Адабрала на яе думку лепшае сабе, а мне пакінула «пацяруху». І ў той «пацярусе» былі такія залацінкі, што пакінуў тую работу выкладчык сабе.

І вось экзамен. Рыхтаваўся дбайна. Цягну білет. У білеце пытанне: «Жыццё і дзейнасць беларускага этнографа Раманава». Адно толькі памятаю, што завецца Еўдакімам, бо гэткім рэдкім сёння імем цесця майго яшчэ за Мікалаем Другім ахрысцілі. Яшчэ ўсплыло, што адна з прац Раманава са словаў Калесніка завецца «Пёсэнькі з-над Нёмана і Дзвіны».

Сяджу, пакутую, пацею. «Усё, прапаў на векі вечныя, як ты Яму ў вочы зірнеш?» І тут зноў мая настаўніца, побач праходзячы, пуц шпаргалачку пад саменькі нос…

А Ён не заўважыў. Ён пахваліў, а мне і сёння няёмка…

Трэнас

Не бяру ў двукоссе, бо гэта не Мялеція Сматрыцкага, не царквы нашае праваслаўнае, а мой асабісты плач. З «Трэнасам» і ўсёй старажытнай літаратурай справіўся я нармалёва, бо так уелася ў душу гэтае слова, што нават Міхась Рудкоўскі падпісаў свае «Сінія Брады»: «…Такому, разгэтакаму, які цэлы месяц не піў гарэлкі і сніў «Трэнас…» А вось з літаратурай першай паловы XIX стагоддзя дык выйшла трагедыя.

Маці, жонка хворыя, двое дзяцей, на трох работах увіхаюся, дзе ты толкам падрыхтуешся. Таўкуся на калідоры перад дзвярыма, за якімі Уладзімір Андрэевіч не ў ласкавым гуморы нярвуецца. Нават выходзіць, пытаецца ў мяне: «Запалкі ёсць?»

Знайшоў, аддаў. Ніколі-ніколі не бачыў, каб Калеснік курыў. А самому так засмаліла зацягнуцца — хоць енкам енчы. Аббег усе тры паверхі, на вуліцу выскачыў — ні ў кога нямашака запалак, яшчэ больш свярбіць.

Адчыняю высокія дзверы, пераступаю парог:

— Уладзімір Андрэевіч, вы мае запалкі…

Эх, доля мая нешчаслівая, раны Езуса!..

— Ты што, сюды курыць прыйшоў?! Абібок, каб і нагі твае не бачыў!..

На апошнім курсе, перад дзяржэкзаменамі, Аляксею Антонавічу Майсейчыку здаў тое XIX стагоддзе. «Тры, Лявоне, стаўлю — Калеснікаў курс! — сціпла ўсміхнуўся мой малады тады сябар-прафесар».

Пытанні ёсць?

Фініш. Заўтра першы дзяржаўны экзамен. Кансультацыю вядзе прафесар Калеснік. Лета. Задуха. А ў аўдыторыі акурат кран з вадою. Падыходзіць да яго, адкручвае, вяртаецца за кафедру і ў лагодным настроі праз усмешку пытае, ці ёсць пытанні. Дзве групы, чалавек пад паўсотню: пытанняў няма. Я вас сур'ёзна пытаю: пытанні ёсць?! Пытанняў няма.

— Дык якога ражна вы сюды прыперліся? Бачыш ты, адстаялі ў чарзе па дыплом інстытуцкі, а гэта ж вышэйшая гуманітарная адукацыя. Духоўнае жабрацтва, прымітыў! У капроны, нейлоны, джынсы паўлазілі, крыжыкі, кулончыкі, краваты на шыі панавешвалі, а за душою што?! У каго вачэй пазычыўшы, у клас зойдзеце?! Апошні раз пытаю: пытанні ёсць?!



С. Казак. Партрэт У.А. Калесніка

І раптам нейкая краля, як на грэх у джынсах на груваскім азадку:

— Уладзімір Андрэевіч, — тоненька так пытаецца, — а што такое, што такое… анані-аніна, анані…

— А-на-нізм?! Не раю. А вось анімізм — гэта…

І пайшоў, і паехаў, аж пакуль званок не зазвінеў. На развітанне з крана запіў горыч апошняй сустрэчы ахалоненай за дзевяноста хвілін вадзіцаю…

«Жызня»

Апошні дзяржаўны экзамен на завочным аддзяленні філфака — руская мова. Топіцца старшыня сельсавета з палескай глыбінкі, ціхмяны, абзэмкаваты былы франтавік і вязень фашысцкага канцлагера. (Намецкую лексіку ведае куды лепш за рускую). Ужо і за саломінку не хапаецца…

— Вы не волнуйтесь ради Бога, пожалуйста. Вот вам последний вопрос… — нярвуючыся і экзаменатар, і чальцы камісіі. — Слово жизнь какого склонения?

Успацеў старшыня, кропелькі з вусоў злізаў, зжаваў: напэўна, напэўно… первава…

Усе цяжка ўздыхнулі. А Уладзімір Андрэевіч усміхаецца:

— А што вы думалі. Праўду чалавек гаворыць, бо цяпер у яго ўжо не жизнь, а жызня пачынаецца…

І паставілі людзі чалавеку «тры».

Адзін з усіх

Чытаю на «літаратурнай серадзе» ўрывак з «Лясной аповесці». На палянцы, у альтанцы пад назваю «Муха» сышліся паляўнічыя і лясное начальства. Гарэлка ракою цячэ, закускі таксама не бракуе… Берасцейскія пісарчукі смяюцца пад вус. Свецяцца жарынкі ў Рудкоўскага вачах, які толькі што прачытаў: «У друга майго лесніка ідзе баль гарою. Чацвётага сына знайшоў друг пад сасною». Уладзімір Андрэевіч доўга не вытрымаў, але лагодна:

— Ну, што ты пішаш, Лявоне? Ляснічы ў цябе назбіраўся, бы чмель, у дырэктара школы адзін вус у капусце, а другі ў смятане, заяц акасеў ушчэнт, нават месяц у небе прычасціўся. Ды і ты сам як былы чыгуначнік упіўся ўдрызіну. Адзін конь «Пятлюра» цвярозы, бо да дрэва прывязаны…

Па-Ясенінску

Наш «Гуртавы і Вадар» (Ніна Мацяш) — Калеснік трывацць не мог празмернага зазірання нашай берасцейскай «брацій» у чарку. Ды ніколі доўгіх натацый не чытаў, выказваўся заўсёды змястоўна. На скалечанае ў застоллі Сцяпану Крывалю вока рэзюмаваў:

— Чаго і трэба было чакаць. Дажыліся да зялёных венікаў — пісацелю в пьяной драке выбили глаз, хорошо…

Сустракае неяк мяне.

— Ну, дзе ты цяперака, Лявоне, штаны аціраеш?

— У спорце, Уладзімір Андрэевіч, у спорце.

— А-а-а, яно і відно, дзе спорт — там і спірт.

Трапляюцца на вочы Яму Рудкоўскі з Купрэевым — абодва кульбакі пагублялі.

— Малайцы, што хоць шырока, па-Ясенінску, а то чуў — пад коўдраю «чарніла» смокча-це…

І гэта, як бы мы ні «супрацўляліся», крыху ўплывала на піякаў. Тым больш, што неяк заспеўшы Рудкоўскага, Купрэева, Філатава на лаўцы ў скверы на Міцкевіча, супраць выцвярэзніка, ледзь выціснуў, здавалася, са слязою са зрэнкі ў сонечных вачах:

— Хлопцы, пашкадуйце сябе: вы ж таленавітыя. Як звяры!

Польская готыка

Паперад сямідзесяцігоддзем разліўся ва Уладзіміра Андрэевіча апендыцыт. Зрабілі аперацыю. Ляжыць у гарадской, на Леніна, бальніцы. Прысесці няма дзе: паўсюль купы даведнікаў, энцыклапедый, малюнкаў і рэпрадукцый. Галава — на падушцы, акуляры — на носе, у руках — пяро і папера. Працуе.

— А-а-а, здарова, хлопцы, — скрывіўся, бо кальнула, адпусціла — заўсміхаўся.

Алесь Каско вымае з дыпламата слоік узгадаванага на чудзінскіх мурагах мёду. А я прынёс толькі самога сябе. Заводзім гамонку. Мы пра здароўе, а ён пра польскую готыку, крыху цяжкавата падцягнуўшы цела пад спінку рыпучага ложка:

— Прыйшла на змену Раманскаму стылю. Пучкі тонкіх калонаў пераходзяць у стрэльчатыя аркі нервюраў. Найбольш значныя помнікі ў Італіі, Францыі, Англіі і Нямеччыне. Вылучаюцца вялікай вышынёю, а вось саборы Кракава, Гнезна, Познані, Гданьска маюць не спічастую, а плаўную, паўцыркулярную, крыху закруглёную форму…

І тут мне чамусьці скок на язык польская дражнілачка: «Окрэнгла, як талеж, прысядла на пул, А спева, а таньчыць, як вул…»

— Ну, скажам, не спева і таньчыць, а смердзе і пердзе, як вул. — Засмяяўся, ухапіўшыся аберуч за правы бок, і папрасіў Алеся:

— Звядзі ты гэтага чортавага Капшука з вачэй маіх, а то, чаго добрага, шво разыдзецца…

Не на сметнік

З жонкай Зосяй Міхайлаўнай спускаюцца пад руку з прыступак паліклінікі. Высокія, сімпатычныя, у добрым настроі.

— А-а-а, Лявоне, чуў, чуў, нарэшце зборнічак скляпаў. Нясі, не лякайся. Зірну. Толькі не дакучай. Пачытаю, сам патэлефаную.

Пяцьдзясят шэсць дзён чакаў. Нарэшце Зося Міхайлаўна: «Казаў, каб зазірнулі».

Пасадзіў за рабочы свой стол.

— Была б дрэнь, сам на сметнік выкінуў бы. А так стукайся ў выдавецтва: ёсць кніжка. Што ж, у Мележа мазырская мова, у цябе — маларыцкая. Гэта добра. Не дазваляй пашахонцам ніводнага ляхавецкага слоўка выкрэсліць. Але літаратуршчыны, майстэрства часам больш, чым зместу, хоць матэрыял цікавы, твой… Перанясі-тка мне гэтую дошку на балкон (не толькі піша, малюе, але і рэжа па дрэве).

Дубовая сталешніца, бы волавам налітая, ледзь падняў.

Кліча зноў да стала, налівае чарку «Напалеону». П'ю і хвалю, бы зроду не каштаваў:

— Смачна, халера на яго.

— А ты думаў, — закаркаваў пляшку і ставіць на паліцу. — Ідзі. Ідзі. Няма мне, браце, калі цырымонію разводзіць…

Перагналі

Крочыць бадзёра, сам сабе ўсміхаецца, спыняецца, дае патрымаць мне свой жоўты партфель:

— Хоць і восень наўкола, а неяк пасвятлела на душы. Трыццаць гадоў Амерыку даганялі, нарэшце перагналі.

— Не можа быць. А ў чым?

— У даўжыні дубінак. У іхніх паліцыянтаў яны да сракі, а ў нашых — да каленяў. — Рагоча, ацірае хустачкай слязу, забірае «тэчку» сваю…

Пах пылу фаліянтаў

Неяк побач з Настаўнікам успамінаў маё дарагое, маладое, праведнае, пуцейскае. Як доўб кайлом і ржавай лапатаю ў чыгуначным насыпе гліну «прорези» глыбінёю і даўжынёю 2,7 метра. Пад цягнікамі, не вылазіў на свет белы нават у час паўгадзіннага перапынку на абед.

А Ён чамусьці з імпэтам і слухаў мяне, і распавёў сваё. Менавіта пра чароўны, незабыўны яму пах пылу фаліянтаў у сутарэннях архіваў і музеяў, дзе адразу пасля вайны, хворы на сухоты, корпаўся, шукаў ад Кірылы Тураўскага і Скарыны да Багдановіча «чужое слова» пра Беларусь. І Бог дараваў Яму напаткаць «Песню пра зубра» Гусоўскага — «пачынальніка многіх матываў у беларускай легендзе нацыянальнага адраджэння, спеў якой гучаў не на роднай мове, а на мове рэнесанснага Рыма».

Шукаў, знаходзіў, тварыў. А ў выніку амаль у кожным радку яго ных глыбінных тварэнняў адчуваецца пазіцыя змагара за праўду шляхам праўдзівага, тонка прыхаванага выяўлення зла ў піку нахабнае, крывадушнае, ханжаскае прапаганды «дабра» хлусамі і здраднікамі нашае нацыянальнае ідэі ў нашым нечалавечым, здаецца, з усёй зямное кулі толькі беларускім жыцці.

А як яны думалі

Пазваніла Зося Міхайлаўна: прасіў, каб пільным вокам зірнулі на садок, да зімы дрэўцы падрыхтавалі.

Прыехаў з лецішча, пераступаю парог іхняга гасціннага жытла. Гаспадыня рыхтуе торбу прысмакаў на кухні, бо без торбы з гэтае хаты не выпускаюць. А я ў спальні Яму, крышку акрыяламу, апавядаю пра выпадкова сустрэтую ягоную аднакласніцу з Навагрудскай гімназіі, палячку Буландо Барбару.

— Мувіла пані, жэ памёнта вас. Надта здольны быў да навукі, маляваў пенькне, але, холера ясна, такі шчыры беларус!

— А як яны думалі? — так шчыра, па-маладому вымавіў Уладзімір Андрэевіч, што вырвалася: яшчэ не адно дрэва пасадку побач з Ім…

▸ БЫЛОЕ

РОДНАЯ, НЕЗАБЫЎНАЯ…

Я чакаў гэтай кнігі. І вось яна ляжыць перада мною — «Скрозь «Маладосць»» (да 60-годдзя вядомага нашага часопіса).

З увагай і хваляваннем чытаю старонку за старонкай: грунтоўны артыкул Генрыха Далідовіча, цікавыя згадкі Адама Мальдзіса, зацемкі Уладзіміра Дамашэвіча, Віктара Яраца, Васіля Ткачова, пратаколы даўніх паседжанняў рэдкалегіі… углядаюся ў знаёмыя, родныя твары на фотаздымках: Аляксей Кулакоўскі, Пімен Панчанка, Васіль Быкаў, Міхась Стральцоў, Вера Палтаран, Мікола Аўрамчык, Уладзімір Караткевіч, Іван Мележ, Іван Чыгрынаў, Алесь Жук, Васіль Зуёнак, Анатоль Грачанікаў, Янка Сіпакоў, Жэня Янішчыц, Раіса Баравікова, Валянцін Ждановіч… Шкадую, што няма фатаграфій славутых маладосцеўцаў Янкі Брыля, Рыгора Барадуліна, Ніла Гілевіча, Уладзіслава Нядзведскага. З недаўменнем і прыкрасцю чытаю пад фота Паўла Дубашынскага «Кастусь Кірэенка», Івана Новікава — «Алесь Асіпенка», Міхася Вышынскага — «Мікола Вяршынін»… І — не знаходжу настойліва замоўленага ў свой час майго слоўца — прызнання ў любові да мілай, роднай маёй «Маладосці». Не разумею, у чым справа — усяго ж некалькі старонак машынапісу, ніякай, як мне здаецца, «крамолы». Вось я і вырашыў прапанаваць «Літаратурнай Беларусі» маё ненадрукаванае кароценькае эсэ. Не таму, што лічу яго літаратурнай з'явай, а проста хачу яшчэ раз узгадаць дарагіх майму сэрцу людзей і даўнія незабыўныя падзеі. Так бы мовіць, у дадатак да юбілейнай кніжкі.

Генадзь БУРАЎКІН

У маёй бібліятэцы я беражліва захоўваю, як дарагую рэліквію, першы нумар «Маладосці» — тонкі, фармату славутага калісьці «Огонька», падпісаны да друку 16 красавіка 1953 года. Увесь ён практычна прысвечаны «вялікаму і мудраму» Сталіну, чыя нечаканая смерць, як тады здавалася, скаланула ўвесь свет. І ў самім гэтым факце сёння мне бачыцца своеасаблівы боскі знак, які падвёў рысу пад цэлай эпохай у жыцці вялікай дзяржавы і шматмільённага народа. Якраз «Маладосць» стала ў беларускім літаратурным друку найпершай трыбунай для разняволеных «пасляcталінскіх» настрояў і «пасляcталінскага» пакалення пісьменнікаў.

Акуратнымі стосамі на паліцах у мяне складзены і часопісы пазнейшых гадоў, розныя сваім фарматам, сваім накладам, са знаёмымі і незнаёмымі аўтарамі. Але той, першы нумар для мяне асаблівы. Я добра памятаю, як старшакласнікам, які спрабаваў нешта рыфмаваць, у прыгарадным полацкім пасёлку чакаў яго, як радасна гартаў яго старонкі і шукаў нечага незвычайнага і прыгожага. І, вядома ж, нясмела марыў, што аднойчы і маё прозвішча трапіць пад яго вокладкі.

Тая школьная мара шчасліва збылася, калі я стаў студэнтам Белдзяржуніверсітэта і з хваляваннем пераступіў парог рэдакцыі на вуліцы Карла Маркса ў Мінску, каб аддаць акуратна спісаныя старонкі з агульнага сшытка ў рукі заўсёды ўсмешлівага і добразычлівага Міколы Якаўлевіча Аўрамчыка. З таго, такога ўжо даўняга, часу на многія гады «Маладосць» стала маім родным часопісам, значную частку майго жыцця і лёсу. Як, урэшце, і для ўсіх маіх літаратурных равеснікаў.

Калі ў 1972 годзе я прыйшоў у маладосцеўскі калектыў, там яшчэ працавалі паважаныя ветэраны часопіса: мілая, інтэлігентная, трапяткая Вера Сямёнаўна Палтаран, сціплы і разважлівы Сцяпан Іванавіч Кухараў, мудры, шырока дасведчаны Уладзімір Міхайлавіч Юрэвіч, памянёны ўжо Мікола Якаўлевіч Аўрамчык. Ды і Вячаслаў Адамчык, Анатоль Кудравец, Уладзімір Дамашэвіч, Валянцін Ждановіч упаўне маглі лічыцца старажыламі. Пазней у рэдакцыйных кабінетах з'явіліся Мікола Гіль, Янка Сіпакоў, Алесь Жук, Леанід Дайнека, Уладзімір Крукоўскі. Усе таленавітыя, усе працавітыя і дружалюбныя, аб'яднаныя ўзаемаразуменнем і ўзаемапавагай і безаглядна адданыя беларушчыне. З імі працаваць было лёгка і прыемна. Радасці шчодра дзяліліся на ўсіх. На ўсіх дзяліліся і беды (а і іх таксама хапала).

Памятаю, як з пакоя ў пакой узрушана бегалі то Дамашэвіч, то Аўрамчык, калі новыя рукапісы прыносілі Васіль Быкаў і Янка Брыль, Іван Мележ і Іван Чыгрынаў, Уладзімір Караткевіч і Іван Пташнікаў. Як свяціліся вочы мілага Міколы Якаўлевіча, калі ён чытаў толькі што прысланыя вершы Уладзіміра Марука і Раісы Баравіковай! Ён паўтараў зноў і зноў удалыя радкі і ўсё пытаўся: «Праўда ж, добра?» Ну што яму можна было адказаць, калі вершы сапраўды былі яркія і таленавітыя…

А як мы ўсе перажывалі, калі, пераадольваючы зацяты скептыцызм, а то і адкрытае супраціўленне не толькі пільных цэнзараў, а і дастаткова ўплывовых чыноўнікаў з высокіх кабінетаў Цэнтральнага камітэта КПБ, друкавалі выдатную, балючую, унікальную кнігу Алеся Адамовіча, Янкі Брыля і Уладзіміра Калесніка «Я з вогненнай вёскі…» Якіх толькі закідаў у яе бок не гучала з вуснаў наглядчыкаў за ідэалагічнай чысцінёй паказу айчыннай ваеннай гісторыі: і празмерны трагізм, а не гераізм, і нібыта апраўданне залішняй пакоры вяскоўцаў перад акупантамі, і бяскласавы пацыфізм… Мы горача спрачаліся, даказвалі, урэшце хітравалі (асабліва даводзілася цяжка мне, як галоўнаму рэдактару), але — перамаглі. І калі на ўсесаюзнай пісьменніцкай нарадзе ў Мінску такія высокія аўтарытэты, як Канстанцін Сіманаў, Алесь Ганчар, Чынгіз Айтматаў назвалі кнігу выдатнай з'явай ва ўсёй сусветнай літаратуры, тадышні кіраўнік рэспублікі Пётр Міронавіч Машэраў падышоў да мяне ў кулуарах і падзякаваў за тое, што мы не далі партыйным функцыянерам загубіць яе. Дарэчы, рукапіс «Я з вогненнай вёскі…» спярша быў прапанаваны (і адвергнуты) зусім не нашаму часопісу. Мы гэта ведалі (аўтары сумленна нас папярэдзілі), але ўнікальнасць і непаўторнасць яго была настолькі відавочнай, а адчуванне неабходнасці такой кнігі менавіта ў партызанскай Беларусі дапамаглі нам спрычыніцца да з'яўлення гэтага балючага, жахлівага дакумента людской пакуты, трываласці і мужнасці ў смяротнай барацьбе з фашызмам.


Фота Budzma.org

З радасцю ўспамінаю я і ініцыяваны намі конкурс на лепшы нарыс і публіцыстычны матэрыял, які праводзілі сумесна з літоўскімі, латышскімі і эстонскімі калегамі, і сяброўства з часопісамі «Дняпро» з Кіева і «Аўрора» з Ленінграда. Так званыя абменныя нумары, нефармальныя сустрэчы супрацоўнікаў, сумесныя творчыя паездкі не толькі дабаўлялі нам цікавых знаёмстваў, але і прыкметна ўзбагачалі змест часопіса. На жаль, многім конкурсным публікацыям відавочна не хапала вастрыні, праблемнасці, але што зробіш — такі быў час. Ды, скажам шчыра, і сёння ў гэтых слабасцях можна папракнуць маладосцеўскую публіцыстыку…

Колькі не прыгадваю свае даўнія «маладосцеўскія» гады, заўсёды бачу шматлюдныя і шумныя службовыя нашы кабінеты. Рэдакцыя была тады своеасаблівым дыскусійным клубам, сяброўскім асяродкам для творцаў розных узростаў і поглядаў. У нас гадзінамі мог сядзець і дзяліцца няпростымі думкамі і развагамі Іван Паўлавіч Мележ. Асляпляў і ўзрушваў фантанам самых нечаканых прапаноў і меркаванняў неўгамонны Алесь Адамовіч. Зачароўваў сваімі фантазіямі добразычлівы і гаваркі Уладзімір Караткевіч. Так і сыпаў дасціпамі і бліскучымі экспромтамі Рыгор Барадулін. І збіралі вакол сябе цэлыя купкі ўважлівых слухачоў мажны, мудры і іранічны Іван Антонавіч Брыль і яснавокі, сціплы, трохі зажураны Пімен Емяльянавіч Панчанка… А калі да мяне аднойчы забег мой сябра, першы беларускі касманаўт Пятро Клімук, дык дзверы ў пакой немагчыма было зачыніць — хоць здалёк зірнуць на жывую легенду, сапраўднага героя хацелі і супрацоўнікі суседскіх «Бярозкі» і «Вясёлкі», і камсамольскія функцыянеры. Яшчэ не спешчаны славай мілы Пётр Ільіч расказаў нам тады («па сакрэце»), якая гэта цяжкая і нават рызыкоўная праца — разведка космасу, і якая маленькая наша родная Зямля, калі глядзець на яе з-пад зор…

Заўсёды бачу шматлюдныя і шумныя службовыя нашы кабінеты. Рэдакцыя была тады своеасаблівым дыскусійным клубам, сяброўскім асяродкам для творцаў розных узростаў і поглядаў

Маладосцеўскія ж «вячоркі», якія здараліся зусім нярэдка і дзе, зразумела, не абыходзілася без чаркі, былі па-добраму разняволеныя і хатнія. Хапала на іх і жартаў, і сяброўскіх «падколак», і нечаканых споведзяў. І заўсёды прысутнічаў упарты карпаратыўны клопат, каб часопіс наш быў цікавы, каб у яго было шмат чытачоў (а тыраж тады перасягаў 20 тысяч экземпляраў), каб публікацыі заўважалі самыя строгія крытыкі, а найлепшыя нашы аўтары заставаліся вернымі нам.

Вядома, жыццё ішло, многае з часам мянялася. «Бранзавелі» першыя славутыя маладосцеўцы Іван Навуменка і Васіль Быкаў, Іван Пташнікаў і Іван Чыгрынаў, Ніл Гілевіч і Янка Сіпакоў, Рыгор Барадулін і Міхась Стральцоў… Але заставалася нязменнай іх любоў і ўдзячнасць «свайму» часопісу, іх святое адчуванне прыналежнасці да высокіх традыцый роднай літаратуры, іх сумленная вера ў сілу праўдзівага мастацкага слова. Прыходзілі новыя аўтары на старонкі «Маладосці». Прыходзілі новыя людзі ў яе калектыў. Рэдакцыя мяняла «месца жыхарства». Вокладкі прыхарошвалі сваё аблічча. Новы час дыктаваў свае, не заўсёды зразумелыя мне, законы і густы.

Большасці тых, з кім разам я здаў у друк болей сямі дзясяткаў нумароў «Маладосці», ужо няма на свеце. Але ёсць і — спадзяюся — заўсёды будзе любімая «Маладосць». Родная, незабыўная…

Галоўны рэдактар «Маладосці» ў 1972–1978 гадах



ВЕРШЫ

БЕЛЫ МАРМУР

ЦЫПРЫЯН КАМІЛЬ НОРВІД

***

I
Ці той птах брудзіць дом свой,
што так робіць,
Ці той, што і гаворкі не заводзіць?

II
Ці той жыў за мяне, хто не прызнаў віну,
Ці той, хто ведае, што маю й не адну?

III
Дзе розніца паміж абвінавачваннем,
Адменай, клятвай альбо перайначваннем? —
І як суддзя іх суадносіць разам,
Сумленна, прафесійна, у экстазе?
І ці сумленне існуе за так,
Безарганічнае, бо межаў брак,
Ці, можа, нават цягне, як магніт?...
А чысціня — як? — плача зноў наўзрыд?...
А мне тады куды — пятля і суіцыд?...
Над столікам завіс адказ, як сталактыт!!

Памяці спадара Яна Гаеўскага, польскага палітычнага эмігранта, забітага выбухам паравой машыны ў Манчэстары ў ліпені 1858 года

1
Доўга глядзелі людзі простай веры
На дзіўнае дзіва асветы заходняй
І думаць смелі: ці ж не для паходні
Боскі агонь скралі ў гэткім памеры?

2
Думаць, шаптаць, што Люцыфер стары
Святасць падхопіць і нашу ўзаемнасць,
Ні гераізм, ні каханне бязмернасць
Ужыўшы — але: рухавік паравы…

3
Толькі Т А М У, які ўсё і паўсюды,
Зазвычай здаецца паважным усім,
Бога параняць і новы крыж будзе,
А гэты адзін, бо быў з тварам людскім.

4
Вось так, Эпапею машына змяла,
Кратар згарнуў сэрцы й рэшткі мазгоў,
Не слаўным героем з чужых берагоў
Гаеўскі Ян згінуў, але ад катла!...

5
Не!... смерць Яго не міне нас употай —
Цел розных цела з адным лягло тварам;
Падзёншчык і шляхціч побач, на пару,
З Сынам-ахвяры — Сынове прыгнёту…

6
Братэрства штандар зробіць справу
святую,
Са смерці жыццё набярэцца карысці,
Нібы той выгнаннік, ЯН-ЕВАНГЕЛІСТА,
Што з кіпню ў катле расспяваў: «АЛЛУЯ!...»

Грамадзяніну Джону Браўну

Праз Акіяна паверхні прасціну
Песню Табе шлю, як чайку, о! Яне…

Будзе плыць доўга яна да айчыны
Вольных. — Заспее? Але ў якім стане?...
— Ці ж, як прамень сівізны тваёй слыннай
Белым на плаху зляціць па паўстанні:
Сын Тваёго Ката каб ручкай дзяціннай
Кідаў каменне па чайцы гасціннай!

*
Так што, калі з Тваёй белаю шыяй
Прагнуць вяроўкі хутчэй разабрацца;

Так што, калі не захочаш вітацца
З гэткай планетай, спадлелай, вашывай,
Пхнеш яе — гадам спалоханым зікне,



Цыпрыян Каміль Норвід (1821–1883) — адна з найбольш яскравых і значных постацяў польскай і еўрапейскай культуры. Большую частку свайго нялёгкага жыцця гэты выдатны паэт, празаік, драматург, мастак і філасоф правёў у эміграцыі, да якой яго прымусілі палітычныя абставіны акупаванай і падзеленай на часткі радзімы.

Сёлета спаўняецца 130 гадоў са дня смерці творцы, вершы якога і цяпер застаюцца надзвычай актуальнымі. Магчыма, таму, што закранаюць адвечныя тэмы любові да сваёй Айчыны, чалавечага сумлення і змагання за свабоду.

І калі скажуць: «Вісіць ён, паніклы…» —
Скажуць і ўраз азірнуцца, ці ж маняць? —

Так што, перш чым закрываць твар
Твой станучь,
Каб, апазнаўшы Амерыка сына,
Не закрычала на зорак дванаццаць:
«Згасце агні мае, мушу прызнацца:
Ноч ідзе — чорная з тварам мужчыны!»

*
Так што Касцюшкі цень і Вашынгтона
Перш чым узнікнуць, прымі песню, Яне…

Х а й п е с н я с п е е
й в я д з е н а с д а с к о н у,
А к а л і з г і н е,
н а р о д п е р ш п а ў с т а н е.

Над возерам

Мая залатая, мабыць, кахаеш… калі…
Любіш і зорку, з якой нам святло на зямлі,
Зямлі, што параніць не раз будзе трэба
Для светаў іншых — скажы —
нахіліш мне неба
Да грудзяў, далі каб за мір нам анёлы
Пакой, дзе жыць будзем з настроем
вясёлым
Лагодна на цернях, квітнеючых белым,
Быццам усё ўваскрэсла ўжо боскім целам…

Толькі ж — калі — ты ўявi —
калі барацьбіту
З закрытым забралам, між стрэлаў
промняў
Біцца аднаму… кажы… што, пакуль
не забіты,
Непераможны… праўду пішы, як на помнік,
Бо вечная!
Не ведаю, нават, што ўспомню,
Не ведаю — ды бачу неба вокам [смелым]
І чыстым — бо… кахаю цябе сэрцам
цэлым…

Лярва

1
На бруку лонданскім коўзкім,
У імгле месяца белай
Мінаюць яе павозкі,
А ты згадаеш, самлелы.

2
У цернях чало? ці ў брудзе? —
Як распазнаць гэта можна?
З Нябёсамі шэпты аб цудзе
Льюцца… ці? пена бязбожная!...

3
Скажаш, што гэта Святая
Кніга звіваецца ў слоце,
Што па яе не сягае
Дух, бо не мысліць аб цноце!...

4
Р о с п а ч і г р о ш — вось два словы —
Ў бельмах пачвары бязногай.
Адкуль узялася?... — са схову.
Куды йдзе?... туды, дзе нічога!

5
Надта падобны ёй статак
З кпін і грымасаў крывых;
— Гісторыя?... толькі: «крыві!...»
Сучаснасць?... адно: «дастатак!...»

Белы мармур

Грэцыя цудаў!... з мармуру рукі над морам
Бачу… й пытаю: што адбылося
з Г а м э р а м,
Тым, што вучыў цябе, з зоркамі пела
каб хорам?
Дзе прах яго? альбо дом? — дай адказ
у памеры
Хваляў эгейскіх, што б'юць гекзаметрам
аб скалы —
Рытмам хлапкоў іх скажы — занатуй:
пенай стала!

*
Грэцыя ўдзячная! — што, падкажы,
з Ф і д ы я с а м,
Тым, што вучыў каб трымаліся
з годнасцю ўласнай
Дзеці твае і хадзілі, бы з Зеўсам сам-насам,
Згніў у турме? М і л ь ц ы я д у баі лёг,
няшчасны?
А Ф е м і с т о к л, Т у ц ы д ы д і Ц ы м о н…
асудзілі?
Грэцыя! — што з А р ы с т ы д а м,
адданым малітвам,
З тым, што вучыў выбачаць, хоць быў
збіты нагамі?
А Ф а ц ы ё н — той стары, што браў
бітву за бітвай —
Труціш яго ты аднак… а С а к р а т??...
…Ох жа! Пані
Блакітнавокая, з профілем роўным
Мінервы…
– Рэшткі твае таму свецяць такой
прыгажосцю:
Бачу іх з радасцю!... а пакідаю з тугою,
Разам з фіялкамі, што параслі там,
дзе косці
І зямлю тую штогод акрапляюць расою.

Мая Айчына

Хто скажа мне, што нібыта айчына:
Вёскі, калоссе і студні,
Хаты і кветкі, і ў полі скаціна —
Скажу: «Гэта — ступні».

Дзіця з маці рук ніхто не адніме;
Падлетак каленаў сягае;
Вырасце сын — на руках яе ўздыме:
Справа святая.

Роднай айчыны не ступні крыніца;
Целам я з па-за Еўфрату,
А духу майму Хаос сніцца:
вось свету плата.

Ніхто мяне ні ўратаваў, ні стварыў;
Спазнаў і сябе, і вечнасць;
Ключ Давідовы мне вусны адкрыў
За чалавечнасць.

Айчыны крывавыя ступні абцерці
Ўласным валоссем кладуся.
Твар яе вечна трымаю я ў сэрцы,
Ім ганаруся.

Продкі таксама не ведалі іншай;
Да яе ног датыкаўся,
І тым нагам пацалунак быў чыншам —
Так я вітаўся.

Хай жа не вучаць мяне, дзе айчына,
Бо вёскі, калоссе і студні,
І кроў, і цела для вернага сына
То — след, ці — ступні.

Пераклаў з польскай Павел Надольскі



Фота А.А.

ЗГАДКІ

«ЗАЧЕМ УБИЛИ ПТИЧКУ?»

Сяргей ЗАКОННІКАЎ

Не так, як хочацца, бо жыццё безапеляцыйна ўносіць карэктывы, але ўсё ж пасоўваецца праца над маімі рукапісамі «Рабскі дзень, вольная ноч» і «Згадкі Вогненнага Пса». Для мяне вяртанне ў мінулае, асэнсаванне яго дзеля нашай будучыні стала не менш важным, чым штотыднёвы абавязак калумніста газеты «СНплюс»(дзявяты год) або, самы любімы занятак, — пошук у душы вершаў.


Фота Svaboda.org

Улетку 1968 года мне, як і іншым навучэнцам ваеннай кафедры Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта, давялося праходзіць вайсковыя зборы, прымаць прысягу, здаваць іспыты на званне малодшага лейтэнанта. Атабарыліся зборы на танкавым палігоне каля вёскі Дубаўка пад Бабруйскам.

Лад таго быцця высвечваецца ў маіх лістах бацькам: «Мы ў лагеры. Размясцілі ўсюды: і ў палатках, і ў казармах. Наша першая рота жыве ў казарме. У ёй філолагі, журналісты, юрысты і гісторыкі. Газет, часопісаў, кніг няма. Радыё таксама. Жывем так — каб толькі дзень хутчэй прайшоў. Кормяць кепскавата, але з голаду не памрэм. Цэлы дзень заняткі, і нават ноччу. Вось і сёння будуць начныя вучэнні. На занятках пот цячэ ручаямі».

Студэнтаў гуманітарных факультэтаў БДУ рыхтавалі да пасады камандзіраў мотастралковых узводаў. А таму з першых дзён далі немалую нагрузку. Мы да сёмага поту капалі акопы, траншэі, ладзілі абарончыя рубяжы. Вучыліся і наступаць, што было нашмат прыемней. Авалодвалі навыкамі ваджэння бронетранспарцёра, здавалі залікі па стральбе з пісталета, аўтамата, кулямёта, гранатамёта, па паражэнні мішэняў баявымі гранатамі.

Паўдзельнічалі мы і ў сапраўдных трохдзённых вучэннях, на якіх спачатку акопваліся і наступалі на другарадным напрамку, а затым студэнтам рашылі паказаць, як танкі фарсіруюць Бярэзіну пад вадой. На пераправе нас, як звычайных гледачоў, размясцілі ў бяспечным месцы, каля палаткі медыкаў. Адным вокам мы сачылі, як на бераг выпаўзаюць магутныя дыназаўры, з брані якіх сцякае струменямі ўскаламучаная вада, а другім касіліся на больш прывабныя аб'екты. Тры разамлелыя пад сонцам весялушкі-рагатушкі ў вайсковай форме не толькі гаманілі пра нешта сваё, жаночае, але і пільна назіралі за падзеямі, гатовыя прыйсці на дапамогу. Пасмы іхніх валасоў, якія свавольна выбіліся з-пад пілотак, перабіраў лёгкі ветрык, а з расшпіленых грубаватых, каляных гімнасцёрак выглядвалі далікатныя, мілыя шыйкі і рваліся на свабоду тугія грудзі. Старэйшая заўважыла непрыхаваную цікаўнасць і какетліва прыкрыкнула: «Мальчики, не засматривайтесь на взрослых тётенек. У вас все ещё впереди». А гэтай красунікапітану тады, відаць, стукнула ад сілы 28-30 гадкоў.

Тое лета было сапраўды гарачым, і не толькі надвор'ем. У наступным лісце ёсць такія радкі: «У нас адбылося шмат змен. Па якой прычыне — вы ведаеце. Забралі ўсе транзістары, фотаапараты. Бурліць Чэхаславакія. Да яе межаў, відаць, будуць падведзены войскі з двух бакоў. І ўсё ж, як мне здаецца, нікому ваяваць не хочацца».

Не скажу, што студэнты ведалі нешта больш-менш дакладнае пра падзеі ў Чэхаславакіі. На палітзанятках казалі, што контррэвалюцыйныя сілы хочуць рэстаўраваць у краіне капіталізм, вырваць яе з сацыялістычнай садружнасці, што блок NATO гатовы акупаваць Чэхаславакію. А з другога боку, у нас мелася некалькі транзістараў, якія можна было настроіць на хвалі «Голаса Амерыкі», Бі-Бі-Сі. Хоць перадачы замежных радыёстанцый пастаянна і жорстка глушыліся, але нейкія абрыўкі ўдавалася паслухаць. З іх вынікала, што грамадзяне Чэхаславакіі хочуць свабоднага жыцця, перамен у палітыцы, эканоміцы, ва ўсім грамадскім і сацыяльным ладзе краіны. Каментатары праводзілі паралелі з рэвалюцыйнай Венгрыяй 1956 года. Потым, калі транзістары прымусілі здаць, мы жылі пад прэсам самых блытаных чутак. Добра помніцца пачуццё няпэўнасці, вялікай трывогі…

…Раптам уначы — трывога. Сонныя і няўцямныя, мы строімся ў тры шарэнгі ў казарме. Ад аднаго да другога пабегла вестка: «Савецкія танкі перайшлі мяжу Чэхаславакіі». Але камандаванне збораў не патлумачыла сітуацыю. Быў толькі аддадзены загад спакаваць лепшыя аўтаматы Калашнікава, якімі мы карысталіся, а яшчэ ўскрыць прывезеныя са склада скрыні і ачысціць ад змазкі новую зброю.

Раніцай паехалі на грузавіках у Бабруйск, здалі скрыні з аўтаматамі. А затым пайшлі на запасныя пуці, дзе віравала асноўная пагрузка. Танкавую дывізію, да якой прыкамандзіравалі зборы, таксама перакідвалі ўбок Чэхаславакіі. Магутныя, баявыя машыны ўзбіраліся па лагах на платформы. Тут і ўбачыў нас галоўны начальнік — хударлявы, цыбаты генерал, да якога ўвесь час падбягалі афіцэры, дакладвалі пра пасоўванне пагрузкі. «А это что ещё за войско?» — строга спытаў ён, са здзіўленнем разглядаючы «дапатопную» форму і зялёныя пагоны з чырвоным кантам узору 1944 года. Афіцэры разгубіліся, а пасля пачалі тлумачыць яму, што гэта — студэнты са збораў. Генерал, задураны мітуснёй, бясконцымі клопатамі, імгненна пачырванеў і выдаў: «Вы что, может, и их грузить в эшелоны будете? Чтобы через минуту этих рас…дяев (нецэнзурнае слова смачна і раскаціста прагучала ў вуснах начальніка) я здесь больше не видел!»

Калі вярнуліся ў лагер, то пачулі, што ў казарме працуюць дынамікі. Па радыё штохвілінна манатонна сцвярджалася, што СССР аказвае ўзброеную дапамогу братняму народу Чэхаславакіі па яго просьбе. А затым ішлі рэпартажы, як цяпер мы ведаем, поўнасцю хлусливыя. Яны расказвалі пра вялікую ўдзячнасць і радасць чэхаў, славакаў, якіх старэйшы брат ратуе ад контррэвалюцыі…

З новай раніцай студэнцкае войска зразумела, што яно кінута на волю лёсу. Дывізія была невядома дзе, а мы засталіся без харчовай апекі. Пакуль ішлі перамовы — каму, якой часці нас перадаць? — некалькі дзён жылі на «падножным корме». Выручалі хлапчукі, якія пастаянна круціліся каля лагера і цяпер па нашай камандзе цягалі з гародаў гуркі, памідоры, з садоў — яблыкі, грушы. Але маладыя арганізмы не задавальняліся раслліннай ежай, патрабавалі большага. Давялося перасіліць сорам і патурбаваць мясцовых прыгажунь, якія ўвечары прыходзілі з навакольных вёсак да лагера на танцы. На пыльным «пятачку» завязваліся не толькі рамантычныя, але і прагматычныя знаёмствы. Спагадлівыя дзяўчаты, хаваючыся ад бацькоў, прыносілі сала, нават пальцам напіханую, смачную хатнюю каўбасу. Але ж галадаючых было шмат, на ўсіх харчу не хапала.

У адзін такі адвячорак я размаўляў па тэлефоне з Аляксеем Пысіным, выдатным паэтам-франтавіком, які працаваў у газеце «Магілёўская праўда». Ён пацікавіўся жыццём-быццём на зборах. Нашу сітуацыю зразумеў з паўслова, засмяяўся: «Чакай перавод тэлеграфам. Разлічышся потым вершамі для газеты». На тыя грошы Пысіна купляўся хлеб, батоны і малако для цэлага ўзвода. Гэты жэст ласкавасці да мяне з боку Аляксея Васільевіча не быў адзінкавым. Забягаючы наперад, скажу, што пашчасціла не толькі мець добрыя стасункі з любімым паэтам, але і ініцыяваць у час працы ў аддзеле культуры ЦК КПБ узнагароджванне яго за творчасць высокім ордэнам (праўда, атрымаў з Масквы не такі, які заслугоўваў), дапамагаць, калі ён хварэў…

Пасля перадыслакацыі дывізіі (з-за недахопу салдацкага кантынгенту) воляй вышэйшага начальства на плечы студэнтаў легла сур'ёзная адказнасць: хадзіць у нарады, вартаваць склады ГЗМ (гаруча-змазачныя матэрыялы), боксы з танкамі і іншай тэхнікай. У першую ж ноч адбыўся інцыдэнт. Якраз каля склада ў высокім разнатраўі пралягала сцежка, па якой салдаты традыцыйна хадзілі ў «самаволку». У канцы яе быў лаз пад плотам, а за ім — вольная воля. Адносіны паміж нарадамі і аматарамі пагуляць рэгулярна адпрацоўваліся, зацвярджаліся ўмоўныя сігналы, каб прапускаць толькі сваіх, а чужых затрымліваць. Але ж студэнты гэтага не ведалі. Ім быў патрэбен толькі пароль. Тром гулякам-дэмбелям, якія спецыяльным перарывістым свістам, а затым і матам сведчылі з цемені, што яны — свае, усё ж давялося класціся ў калючую траву ўніз тварам і чакаць начальніка каравула.

Асабіста мне «пашанцавала» трапіць у начны нарад да боксаў з танкамі, калі ў Бабруйску на вуліцы раптам абстралялі ваенны патруль і паранілі яго начальніка — маёра. Што гэта было, хто ўчыніў злачынства, так да канца збораў і не высветлілася…

Апека над намі ўсё ж знайшлася, зборы перадалі ў распараджэнне асобнага ракетнага дывізіёна. Перад прыездам новага начальства стараліся як маглі. Усюды прыбралі самае дробнае смецце, дарожкі пасыпалі свежым пясочкам, разраўнялі граблямі. Ды ўсё роўна не дагадзілі. Прамову перад строем падпалкоўнік пачаў так: «У вас образование — высшее, а сознание — низшее. Зачем убили птичку?» Мы знiякавелі. Якая птушачка? Пра што ён гаворыць? Нехта ў страі зарагатаў. «Кто смеется? Выйти из строя!» — загадаў новы начальнік. Але ніхто не выйшаў. Шчака ў падпалкоўніка, які быў кантужаны ў вайну, затузалася, скрывіўся рот. Ён выбраў самага цыбатага, першага, хто кінуўся ў вочы, і аб'явіў: «Три наряда вне очереди!» На гэтую строгасць хтосьці прысвіснуў. «Кто свистел? Пять нарядов вне очереди!» Начальнік лютаваў, а мы ніяк не маглі даўмецца, што ж такое здарылася.

Нарэшце высветлілася, што падпалкоўнік, калі аглядаў лагер, на адной з дарожак заўважыў мёртвага вераб'я. Як ён сканаў: ці ад старасці, ці ад хваробы, ці падбіў яго хтосьці па-за лагерам — было невядома. Але мы да гэтага «набожчыка» ніякага дачынення не мелі, пра што і пачалі даводзіць падпалкоўніку. Ды ён не хацеў слухаць тлумачэнні. «Совершили нехороший поступок, а отвечать некому, — змрочна прамовіў ён. — Посмотрим тогда, как вы ходить умеете». Падпалкоўнік загадаў нам праходзіць паротна страявым крокам, а сам падняўся са світаю афіцэраў на невялікую трыбуну, што ўзвышалася над пляцам. Мы прайшлі зладжана, але на каманду "Запявай!" — адказалі маўчаннем. Яшчэ адзін круг: «Запявай!» Чуецца толькі грукат ботаў. Маўчанне. Падпалкоўнік абурыўся. Ён сышоў з трыбуны, наблізіўся да нас і раззлавана спытаў: «Почему, сачки, не поёте?» Мы загаманілі: «Таварыш падпалкоўнік! Такія падзеі ў свеце адбываюцца, а нам ніхто нічога не гаворыць, не інфармуе. Тут не да песень. Душа не спявае». Ён спакойна выслухаў скаргі і сказаў цвёрда, безапеляцыйна: «Ничего. Душа запоет. А куда она денется? Будете ходить строем весь день, пока не запоет!»

Мы зразумелі, што зацятасць начальніка не пройдзе, што яна вынікае не з канкрэтнай сітуацыі, а з адчування поўнай улады над людзьмі. Гэтую ўпартасць нельга перасіліць. Падпалкоўніку трэба абавязкова дамагчыся свайго, і ён без песні жывымі нас з пляца ніколі не выпусціць.

Затым падышоў палкоўнік з ваеннай кафедры і міралюбна сказаў: «Ребята, пожалуйста, не лезьте на рожон. Надо спеть! Прошу вас!» Зноў грукат ботаў, а з-пад іх пыл, які нахабна засціць вочы. На падыходзе да трыбуны запявала першай роты Валера Аносаў набраў паветра ў грудзі, над шэрагамі з дзясяткаў дружных глотак гучна панеслася: «Скажи-ка, дядя, ведь не даром Москва, спалённая пожаром, французу отдана…» Падпалкоўнік ад нечаканкі ўстрапянуўся, а потым скрывіўся ад паражэнчай сітуацыі ў вядомых словах класіка, але задаволіўся і гэтым. Болей да канца збораў ён да нас не завітваў…

Нікому не хочацца жыць і тым больш спяваць пад прымусам, у клетцы — ні птушцы, ні чалавеку. Але гвалт над тымі, хто з ласкі Вышэйшай Волі нараджаецца свабодным, ніяк не спыняецца, паўтараецца і паўтараецца, пра што сведчыць беларуская рэчаіснасць, у якой невінаватых людзей кідаюць у турмы, а маладым бакланам пад Навалукамлем па-садыцску адразаюць дзюбы. Тое даўняе няўцямнае пытанне: «Зачем убили птичку?», зневажаючая муштра студэнтаў і сёння застаюцца без тлумачэння, без адказу.

ФАЛІЯНТ

ШЭДЭЎР КНІГАДРУКАВАННЯ XVI СТАГОДДЗЯ

Горад, як і чалавек, мае свой лёс, сваю біяграфію. За амаль тысячагадовае існаванне Брэста ў гісторыі горада, як у кроплі вады, адбіліся ўсе асноўныя этапы развіцця Беларускай дзяржавы.

Тут не толькі вяршыліся лёсы краінаў і народаў, але і ствараўся летапіс гісторыі веры.

Чатыры з паловай стагоддзі таму назад — 4 верасня 1563 года — маршалкам і канцлерам ВКЛ Мікалаем Радзівілам была выдадзена кніга, якая атрымала назву Радзівілаўская Біблія. Але найчасцей самы поўны збор XVI стагоддзя Старога і Новага запаветаў называюць у гонар горада, дзе ён быў надрукаваны: Брэсцкая Біблія.

Выданне ўяўляла сабой пераклад, зроблены з яўрэйскай, грэцкай і лацінскай моў на польскую: «Biblia swieta, to jest ksiegi Starego i Nowego zakonu wlasnie z zydowskiego, greckiego i lacinskiego nowo na polski jezyk z pilnoscia i wiernie wylozone».

Забяспечаная прадметным паказальнікам, гравіраваная тытульнымі лістамі, з шыкоўнымі ілюстрацыямі — гэта ўсё пра яе. Да гэтага часу Брэсцкая Біблія лічыцца адным з лепшых і самых поўных друкаваных выданняў XVI–XVIII стагоддзяў. Кніга-юбіляр сапраўды вартая ўсялякіх рэгаліяў. Выхад у свет яе першага асобніка адбыўся раней, чым заснавальнік друкарскай справы ў Расіі Іван Федаровіч выдаў першую кнігу на царкоўнаславянскай мове «Апостал».

Лёс Бібліі стаўся трагічным. Пасля смерці Радзівіла Чорнага яго сын Мікалай Радзівіл Сіротка, будучы заўзятым каталіком, загадаў сабраць пратэстанцкія брэсцкія выданні бацькі і спаліць іх у двары Нясвіжскага замка. У гэтым полымі загінула і вялікая частка выданняў Брэсцкай Бібліі.

Аднак, пры ўсіх сваіх вядомых і бясспрэчных вартасцях, Брэсцкая Біблія і дагэтуль знаходзіцца ў самым эпіцэнтры мноства гіпотэз: чаму Радзівіл Казімір Чорны палічыў за лепшае пратэстанцтва? Чаму ён уклаў у выданне Бібліі ўвесь свой гадавы даход: 10 тысяч дукатаў, прыцягнуўшы лепшых перакладчыкаў і мастакоў? Нарэшце, чаму для кнігадрукавання быў абраны менавіта Брэст?



Увогуле, «Радзівілаўская Біблія» з'яўляецца эпахальнай з'явай не толькі для ўсяго абшара колішняга Вялікага Княства Літоўскага і Польскага Каралеўства, але і для тагачаснай Масковіі. Пра гэта сведчыць геаграфія распаўсюджання Берасцейскай Бібліі: асобнікі, якія захаваліся да нашага часу або фрагменты гэтага рэдкага выдання складаюць прадмет гонару бібліятэк і архіваў Мінска, Вільні, Кракава, Масквы, Санкт-Пецярбурга.

Адзіны асобнік Брэсцкай (Радзівілаўскай) Бібліі 1563 года выдання знаходзіцца на тэрыторыі Беларусі, у фондзе аддзела рэдкіх кніг і рукапісаў Цэнтральнай навуковай бібліятэкі імя Якуба Коласа Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі. На жаль, у Брэсце яе няма. «У нашай бібліятэцы захоўваецца асобнік Радзівілаўскай Бібліі, адноўлены ў 2003 годзе намаганнямі прафесара Ягелонскага ўніверсітэта, дырэктара выдавецтва Collegium Columbinum Вацлава Валецкага і мецэната Пятра Кралікоўскага. Але мы не губляем надзеі атрымаць і арыгінал у свае фонды. Нездарма ж кажуць, што святыні з'яўляюцца тады, калі прыходзіць час ім вярнуцца. Мы спадзяемся, што гэты час калі-небудзь прыйдзе, і Брэсцкая Біблія вернецца на радзіму», — падзялілася сваімі думкамі намеснік дырэктара па навуковай працы Брэсцкай абласной бібліятэкі імя Максіма Горкага Ала Мяснянкіна.

А інакш і быць не можа, бо Радзівілаўская Біблія — гэта адзін з сімвалаў Брэста. Нараўне з Брэсцкай уніяй і Брэсцкай крэпасцю.

Алена Сезіна


ДЫСКУСІЯ

ПРА ЗДЫМАК МАКСІМА БАГДАНОВІЧА

14 жніўня 2013 года на сайце «Нашай Нівы» (nn.by/?c=ar&i=113975) з'явілася рэпублікацыя гутаркі карэспандэнта Еўрапейскага радыё Алеся Пілецкага з дырэктаркай Музея Максіма Багдановіча Таццянай Шэляговіч. У загалоўку гутаркі вылучана праблема: «На самым вядомым фота Багдановіча — не Багдановіч?».



М. Багдановіч. 1911 г.



Год 1915-ы.

Прызнацца, мяне таксама бянтэжыла, што ў якасці здымкаў Максіма публікуюцца выявы нейк не падобных адзін да аднаго маладых людзей. Але я не антраполаг, нават і блізка не ведаю антрапалагічнай тэрміналогіі, не ўмею патлумачыць, чаму так бывае, што аблічча чалавека да непазнавальнасці мяняецца. І вось пра тое, якое фота Максіма-кніжніка сапраўднае, загаварылі ўголас.

Таццяна Шэляговіч апавядае слухачам і чытачам, што ў сярэдзіне мінулага стагоддзя партрэт Максіма Багдановіча зрабілі не з адзіночнага фота, а (шляхам выкадроўкі) з невялікага агульнага здымка супрацоўнікаў яраслаўскай газеты «Голос». «У выніку, — кажа спадарыня Шэляговіч, — атрымаўся партрэт, які моцна адрозніваецца ад рэальных здымкаў паэта».

Па-мойму, Таццяна Шэляговіч памыляецца, калі кажа, што выкадроўку са здымка супрацоўнікаў газеты «Голос» зрабілі ў сярэдзіне мінулага стагоддзя. Гэта, як відаць, адбылося значна раней — у сярэдзіне 1920-х.

3 чэрвеня 1981 года, калі беларусы рыхтаваліся да 90-х угодкаў з дня нараджэння Максіма, мастак Вячка Целеш атрымаў ліст з такім пытаннем: «А якім здымкам Максіма Б[агдановіча] будзеце карыстацца?». Пытанне задавала асоба, якая добра ведала Паэта: Зоська Верас. Далей у сваім лісце яна пісала: «Ёсць здымкаў шмат, але ня ўсе добра паказваюць яго выгляд. Паводле мяне самы лепшы, падобны здымак — з кніжкі «Вянок», выданай паўторна ў Вільні ў 1927 г.».

Гэты ліст, як і наступны, надрукаваны сёлета ва ўкладзенай Міхасём Скоблам кнізе ўспамінаў і лістоў Зоські Верас «Я помню ўсё».

Амаль праз год, 14 красавіка 1982 г., каментуючы Вячку Целешу нейкае выданне да 90-годдзя Паэта, Зоська Верас пісала: «Тая паштоўка — юбілейны партрэт Максіма Б[агдановіча]ча, абсалютна нічога не варты. Я маю такіх, хіба, з дзясятак. Адразу напісала ў Менск, у музэй — аб сваім паглядзе. Я і ім казала (былі ў мяне нядаўна з Менска, з музэю), і Вам кажу, што я лічу адзіным добрым і падобным здымак, зроблены ў 1915 г. у газэце «Голос». (...) Такім я Максіма бачыла і помню. Пасылаю адзін такі Вам».

Дык вось, у «Вянку» 1927 года была надрукавана ці не выкадроўка з таго самага калектыўнага здымка супрацоўнікаў газеты «Голос», які можна ўбачыць у другім томе Твораў Максіма Багдановіча (1928). Такога Максіма Багдановіча і запомніла Зоська Верас.

Калі ў кагосьці ёсць сумненні што да сведчанняў Зоські Верас, дык паведамляю, што другое выданне «Вянка» да друку рыхтаваў і прадмову да яго пісаў Антон Луцкевіч. Ён таксама добра ведаў Максіма Багдановіча: у 1911 годзе запрасіў паэта ў Беларусь, з Вільні завёз на месяц да сваякоў у Ракуцёўшчыну...

Калі недастаткова сведчанняў З. Верас і таго, што здымак М. Багдановіча ў «Вянку» 1927 года быў змешчаны, мабыць, не без ведама А. Луцкевіча, звернемся да іншых людзей, якія ведалі Максіма асабіста. Гэта Змітрок Бядуля, Леанард Заяц, Вацлаў Ластоўскі і Аркадзь Смоліч — людзі, якія ў 1920-х гадах жылі ў Менску. Калі не ўсе яны, дык нехта з іх не мог не бачыць «Вянок» 1927 года: сувязь паміж Вільняй і Менскам была тады неблагая, Беларускае навуковае таварыства, якое ўзначальваў А. Луцкевіч, і Інстытут беларускай культуры супрацоўнічалі; Антон Луцкевіч, дасылаючы ў Менск выяўленыя ім тэксты М. Багдановіча, браў дзейсны ўдзел у падрыхтоўцы двухтомніка Твораў нашага паэта (1927–1928). Хто сустракаў у друку, у архівах пярэчанні супраць гэтага здымка ў «Вянку»?

У сярэдзіне мінулага стагоддзя партрэт Максіма Багдановіча зрабілі не з адзіночнага фота, а (шляхам выкадроўкі) з агульнага здымка супрацоўнікаў яраслаўскай газеты «Голос»

Яшчэ раней, чым у «Вянку» 1927 года, гэты партрэт паэта быў надрукаваны ў 3-м выданні «Гісторыі беларускае літаратуры» Максіма Гарэцкага. Кніга выйшла ў 1924 годзе. Той самы здымак мы бачым і ў 4-м выданні «Гісторыі...» М. Гарэцкага (1926). Хто-хто, а Змітрок Бядуля не мог не бачыць гэтых выданні. Пэўна ж, бачылі іх і Вацлаў Ластоўскі, і Аркадзь Смоліч. Ці пярэчылі яны супроць гэтага здымка?

У 1927 годзе, як паказана вышэй, у Менску выйшаў першы том Твораў Багдановіча. Кніга адкрываецца тым самым здымкам Максіма з подпісам: «З фатаграфічнай групы 1915 году». Адказным рэдактарам тома быў чалавек, які ў 1916–1917 гадах разам з паэтам працаваў у Менскім аддзяленні Беларускага таварыства пацярпелым ад вайны: правадзейны член Інстытута беларускай культуры Аркадзь Смоліч. Зноў жа, том не маглі не бачыць іншыя людзі, якія добра ведалі Максіма-кніжніка. Ці сустракаліся каму ў друку і ў архівах іх пярэчанні супроць гэтага здымка?

Маюцца ў Творах Максіма Багдановіча і два іншыя індывідуальныя фотаздымкі — з 1909 і 1911 гадоў. Але я пішу пра той фотапартрэт, на якім мы бачым маладога чалавека, у якога была, кажучы словамі Змітрака Бядулі, пышная цёмна-каштанавая шавялюра. Спадарыня Шэляговіч лічыць, што гэты партрэт «моцна адрозніваецца ад рэальных здымкаў паэта». А вось на думку Зоські Верас менавіта ён, гэты партрэт, — «самы лепшы, падобны здымак». Рэальным лічылі гэты партрэт і іншыя сучаснікі Максіма Багдановіча. І змяшчалі яго ў кнігах 1920-х гадоў...

Дапоўнены варыянт, які быў першапачаткова апублікаваны на www.nn.by.

Анатоль Сідарэвіч

РЭЦЭНЗІЯ

АДСУТНАСЦЬ КРОПКІ

СНЫ БАРЫСА ПЯТРОВІЧА

Новая кніга Барыса Пятровіча «Спакушэнне», якая выйшла ў выдавецтве «Кнігазбор» — гэта зборнік апавяданняў розных гадоў. Аўтар, мажліва, хацеў расставіць нейкія кропкі над «і», абраўшы ў новы зборнік менавіта апавяданні з кніг «Ловы», «Сон між пачвар», «Фрэскі», «Шчасце БЫЦЬ…» ды сціпла ўключыўшы напрыканцы кнігі 6 новых апавяданняў у раздзел пад назвай «З новай кнігі».



Нельга сказаць, што праз усе апавяданні аўтара скразной лініяй праходзяць нейкі адзін сюжэт, лейтматыў або лірычны герой… Зрэшты, і так, і не. Амаль ва ўсіх творах галоўны герой — персанаж шчыры, чуллівы, ранімы, паэтычны. Настолькі паэтычны, што ўсё гэта здаецца вершамі, снамі ў прозе. І, трэба сказаць, вельмі публіцыстычнымі.

Наогул, пісьменнік відавочна гуляецца з уласцівым сабе наборам прыёмаў: публіцыстычнасцю (імкненнем закрануць нейкія рэальныя або магчымыя ў рэальнасці праблемы і нават «разжаваць» канкрэтную мараль, як у апавяданнях «Не пытайце, што будзе заўтра»,«Прыемны колер», «Вера»); дакументалізмам ці наўмысна падробкай пад яго (калі аўтар аперыруе рэальнымі геаграфічнымі найменнямі і гістарычнымі агульнавядомымі ці асабістымі падзеямі, як у апавяданнях «Каханне ў краіне, дзе не было сэксу…», «Вочы засмучоныя»); аўтабіяграфічнасцю ці падробкай пад яе, як у апавяданнях «Планідаманада», «Паўночныя ночы», «Больніца».

Здаецца, што Б. Пятровіч акурат з тых аўтараў, якія натхняюцца непасрэдна самім жыццём і схільныя больш апісваць і рэфлексаваць над падзеямі, якія рэальна адбыліся, чым выбудоўваць сваю рэальнасць, населеную прыдуманымі тыпажамі. Падобна на тое, што аўтару проста неабходная платформа для выказванняў. Ён хоча падзяліцца вопытам, расказаць жыццёвую гісторыю пра сямейную здраду, экзістэнцыйную адзіноту мужчыны пасля разводу або неўзаемнае каханне і немагчымасць сэксу.

Дарэчы, менавіта матыў інтымнай блізкасці, часта немагчымай або забароненай, які прысутнічае ў многіх апавяданнях, якраз і стаў вызначальным у выбары назову для ўсяго зборніка — «Спакушэнне» (у падтрымку гэтай ідэі на вокладцы кнігі змешчана карціна Сержука Цімохава з аголенай жанчынай). Ёсць тут і аднайменнае апавяданне. Фантасмагарычная, амаль булгакаўская гісторыя пра п’янага мужчыну, якая здарылася даўно ў невялікім палескім гарадку, што знік пасля Чарнобыля. Ён ішоў ва ўнівермаг, каб набыць падарункі дачцэ і жонцы на 8 сакавіка, а сустрэўся з жанчынай сваёй мары. Тое, што з гэтага не выйшла нічога добрага, і так зразумела. Але развязка апавядання настолькі ацверажальна-рэалістычная, нават ментарская, што не зусім стасуецца з усёй папярэдняй фантасмагорыяй ды інтрыгуючай аўтарскай інтанацыяй — звычайная бытавуха. Хаця, зрэшты, тэма немагчымасці адрозніць яву ад сну і перацякання аднаго ў другое раскрыта цалкам.

Часта галоўны герой Барыса Пятровіча таксама пісьменнік, у скрайнім выпадку мастак, паэт, філолаг з патэнцыялам празаіка, альбо проста натура лірычная. І бадай усе гэтыя героі наўрад ці жывуць у рэальнасці. Яны жывуць у сваіх снах. І ўсе яны — хочуць разабрацца ў сабе.

На супрацьпастаўленні явы і сну, на нейкай фантасмагарычнасці ды сюррэалістычнасці пабудаваныя некаторыя апавяданні. Часам немагчыма паверыць, што амаль «дастаеўскае» «Каханне ў краіне, дзе не было сэксу…» з нечаканай сацыяльна-палітычнай, відавочна дакументальнай развязкай пісаў той жа чалавек, што напісаў і «Шызы паўзмрок». Гэтае кароткае апавяданне пра чырвонага каня, які жыве, відаць, толькі ва ўяўленні галоўнага героя, як прага цуду, як жаданне збегчы ад аднастайнай будзённасці.

Не згадаць пра фантастыку нельга, хаця б таму, што некаторыя апавяданні зборніка — фантастычныя творы, не пазбаўленыя публіцыстычнага пафасу. Напрыклад, гісторыя «Не пытайце, што будзе заўтра», якая падышла б для студэнцкага кароткаметражнага фільма. Альбо «Неба пад нагамі і вакол», якое сваімі палётамі ў сне і наяве прымушае ўзгадаць «Бар’ер» Паўла Вежынава.

Лаканічны, нават трошку сухі стыль Барыса Пятровіча ў некаторых новых апавяданнях ператвараецца ў мінімалізм. Аўтар цалкам адмаўляецца ад вялікіх літар і кропак. Праўда, гэта больш падобна на банальны пошук новай формы, чым на нейкі апраўданы і абгрунтаваны для гэтых апавяданняў спосаб данесці мастацкую ідэю. «Цень закаханы» ўсё адно застанецца напаўказкай, варыяцыяй на тэму «Ценю» Андэрсана, а «Больніца» — шчымлівай гісторыяй-успамінам пра хлопчыка, які падчас аперацыі перажыў вяртанне з таго свету.

Зрэшты, калі гаворка ідзе пра вечны вырай, адсутнасць кропкі ў канцы падаецца вельмі абнадзейваючай.

Рыта Лён

ВОДЗЫВЫ

ВЫБАР МАШТАБУ

Пра кнігу паэзіі Міколы Кандратава «Кроплі дажджу»



Выбар маштабу — ці не самае цяжкае ў мастацтве.

Вытанчаная настольная статуэтка, раздзьмутая да памераў вулічнага манумента, выглядае як мінімум недарэчна. Як, зрэшты, і гераічны эпас, уціснуты ў межы невялічкай навэлы. Але ж памер ані ў якім разе не вызначае мастацкую вартасць твора: адно пранікнёнае хайку Мацуа Басё куды больш каштоўнае за дзясяткі вонкава эфектных, але цалкам пустых паэм. Галоўнае — адпаведнасць зададзенай формы і абраных мастацкіх сродкаў.

У гэтым сэнсе паэтычны зборнік Міколы Кандратава «Кроплі дажджу» надзіва гарманічны.

Дождж ад раніцы ідзе
досыць цёплы,
скачуць кроплі па вадзе,
танчаць кроплі.

(Верш «Кроплі дажджу»)

Што гэта? Правільна, паэтычнае назіранне, падкрэслена адчужанае. Прытым назіранне для аўтара — гэта найперш мастацкі акт, хуткаплынны, што той летні дожджык. Дожджык знянацку пачаўся і гэтак жа раптоўна скончыўся, сонца плюхаецца ў калюжынах, краявід змяняўся. Жыццё працягваецца, праз якую хвіліну на той дождж усе забываюцца, і толькі «на асфальце, як на шкле, танчаць кроплі.» Так і ў падсвядомасці чытача пасля прачытання таго верша застанецца падсвядомае адчуванне свята, гармоніі і спакою.

Падобныя творы не могуць быць зацягнутымі паводле вызначэння, бо інакш гэта ўжо не цёплы летні дождж, а змрочная восеньская залева. А невялічкая паэтычная форма, у сваю чаргу, вымагае адпаведных літаратурных сродкаў. Сапраўдная паэзія — гэта не абавязкова прыгожая і бліскучая цацанка. А майстэрства паэта не ў тым, каб усе словы блішчэлі і зззялі вясёлкай, а ў тым, каб словы, абзацы і рыфмы стаялі на патрэбным месцы, і каб іх спалучэнні выклікалі эмацыйны ўздым чытача.

Калі літаратурны стыль, паводле Джонатана Свіфта — «патрэбнае слова ў патрэбным месцы», дык паэтычная стылістыка зборніка «Кроплі дажджу» абсалютна бездакорная.

Гэта першае ўражанне пасля прачытання кнігі. А яшчэ неверагодна падкупляе амаль дзіцячая непасрэднасць аўтара — я маю на ўвазе штодзённую здольнасць адкрываць нязвыклае ў будзённым і шчыра, па-дзіцячы, гэтаму радавацца.

Ужо пасля выхаду першай паэтычнай кніжкі М. Кандратава «Возера Рудакова» аўтара адразу ахарактарызавалі як «паэта неакласічнай манеры», стылістыка каторага «нагадвае пісьмо філалагічнага пакалення». З гэтым можна пагадзіцца хіба што часткова. Так, вершы са зборніка «Кроплі дажджу» часам перагукаюцца з лірычнай паэзіяй Максіма Танка — празрыстасцю мовы, падкрэсленым мінімалізмам і стрыманай танальнасцю. Але ж «традыцыйнасць» М. Кандратава — менавіта метад, а не самамэта і ўжо тым больш не лекала, паводле каторага паэт стварае вершы.

«Кроплі дажджу» — традыцыйная неакласічная форма і абсалютна зразумелая чытачу сучасная інтанацыя, іншым разам, можа, і падкрэслена асабістая, з водблiскам роздумаў пра ўласнае жыццё і лёс, але, тым не менш, перакананаўчая для чытача.

Маштаб вытрыманы дасканала, усе паэтычныя сродкі абсалютна адпавядаюць зададзенай форме.

Ці здольны Мікола Кандратаў змяніць маштаб і ўзяцца, скажам, за паэму?


Мажліва.

Толькі навошта?

Уладзіслаў Ахроменка

РАСШЫФРАВАЦЬ СВЯДОМАГРАФІЮ

«Свядомаграфія» — так называецца зборнік мінскай паэткі Ірыны Хадарэнка, які пабачыў свет у мінулым годзе ў выдавецтве «Кнігазбор» (серыя Саюза беларускіх пісьменнікаў «Кнігарня пісьменніка»).



Адразу стала цікава, якія думкі і вобразы хаваюцца за нетрывіяльнай назвай. Настроіўшыся на экзістэнцыйны лад, я разгарнула старонкі і… не знайшла там ні любоўнай лірыкі, ні жаночых сантыментаў а-ля незадаволеная лібіда (зрэшты, тады б зборнік мусіў называцца «Падсвядомаграфія»)…

Амаль адразу аўтарка ўпэўнена дэкламуе сваю грамадзянскую пазіцыю:

Маё грамадзянства — Вялікае Княства,
Мой родны абшар — ад Варшавы да Мінска.
Між Вільняй і Кіевам — продкаў калыска;
Мой род паяднаў і сялянства, і панства.

У спадчыну маю — з крыніцы славянства –
Зямлю, лес і хмары, што сцелюцца нізка,
Свавольнасць і ўпарты характар літвінскі:
У думках — свабода, у сэрцы — паганства.

(Верш «Біяграма»)

У многіх творах гучыць непрыхаваны боль за сваю краіну, роспач, але наша гераіня — ужо сталая і загартаваная жыццёвымі выпрабаваннямі грамадзянка, і мужнае сэрца падказвае ёй простае выйсце з безнадзейнай сітуацыі:

Не шкадаваць і не баяцца —
І пераможаш.

Аўтарцы ўласцівы з’едлівы, нават чорны гумар, сатыра, скіраваная на сацыяльныя і чалавечыя хібы; гэта часам праяўляецца і ў загалоўках (напрыклад, верш «Пустмадэрнізм»), і ў змесце вершаў:

Паслухмяныя парламентарыі —
Быццам нішы ў пустым калумбарыі…

А ў вершы з ужо згаданай назвай «Пустмадэрнізм» аўтарка «страляе» па сучасных літаратарах:

Сучасныя аўтары надта ўжо любяць верлібры,
Карціць ім пісаць пра бамжоў, маргіналаў і сэкс.
Іх творы — гумовыя кулі смяротных
калібраў —
Лятуць, каб забіць «трох зайцоў»: вобраз,
рыфму і сэнс.

Трэба адзначыць, што І. Хадарэнка таксама спрабуе сябе ў верлібрах:

* * *

з ценю крывавай нядзелі
выпаўз яе жаніх —
чорны панядзелак
з прыгожым і элегантным букетам

мілыя мірныя людзі
жуючы гамбургеры і гумкі
кожны дзень шпацыруюць
уздоўж скатабойні
маўчаць
і прадбачліва маюць у шафах
гатычныя строі

На маю думку, кожная частка гэтага верлібра паасобку можа выглядаць як скончаны самадастатковы верлібр.

А найбольш вартыя па мастацкіх якасцях вершы ў зборніку, дзе відаць арыгінальную, цікавую, яркую, жывую асобу паэткі, гэта творы філасофскага складу. Менавіта ў іх найлепш праявіўся яе творчы талент, яе здольнасць тонка адчуваць, сузіраць, пераасэнсоўваць і па-мастацку ўвасабляць (напрыклад, верш «Загадка волі», а таксама «***Звярыныя вочы за мной назіраюць…» , «***Ідзя — гэта нечаканы скарб…», «Паэзія», «Музыка» і іншыя).

У зборніку таксама змешчаны пераклады вершаў А. Пушкіна, Ф. Цютчава, Г. Ахматавай, М. Гумілёва, Я. Твардоўскага, Ч. Мілаша, Р. Ваячка, М. Бялашэўскага, А. Стронка, Б. Мая. Пераклады вельмі якасныя, застаецца толькі падзякаваць аўтарцы-перакладчыцы за яе руплівую працу і тое эстэтычнае задавальненне, якое атрымліваеш ад прачытання кнігі.

Таццяна Будовіч



ДРУК

«З РАДЗІМНАГА ЗАГОНУ»: «ДЗЕЯСЛОЎ», № 65

ЛеГАЛ

Яшчэ нядаўна пісалі, што Святлана Алексіевіч з'яўляецца сёлета адным з найбольш рэальных прэтэндэнтаў на атрыманне Нобелеўскай прэміі. За мяжой, і ў прыватнасці ў Швецыі, рэцэнзіі на яе апошнюю кнігу раслі, як грыбы пасля дажджу... І як жа неадназначна (пераважна негатыўна) успрынялі гэтую нечаканую навіну нашы электронныя СМІ і розныя, звязаныя з літаратурай, сайты! Аднак не паспеў яшчэ задзёр усчацца напоўніцу, як тут жа й заціх, бо, аказваецца, зноў беларускія, ды і постсавецкія творцы, нават у першую букмекерскую дзясятку не патрапілі...

А шкада — і прэміі, і задзёру, і шырокага сусветнага розгаласу... Бо значнасць гэтай прэміі для беларускай літаратуры, нераўнуючы, як самога «Беларуськалія» для дабрабыту краіны... І што ж цяпер, падкажаце, рабіць, калі і нацыяналізаваць ужо немагчыма, і прыватызаваць чужому шкада, і адпомсціць за абман, зняволіўшы якога-небудзь шведскага акадэміка, небяспечна?

Ат, жыццё, як сказаў мудрэц, вечнае — пачакаем лепшага часу...

Далей іранізаваць на гэтай тэме не буду, яна ў нас і так штодня на слыху і на вуснах.

І вось у чарговым нумары «Дзеяслова» **С. Алексіевіч** якраз і друкуе фрагмент нашумелага ў замежжы «Часу sekond-hand» у перакладзе Валеры Стралко. Па сутнасці, гэта запісаныя споведзі апошніх савецкіх людзей пасля «катастрофы» перабудовы, распаду СССР, прыхватызацыі і штучнага капіталізму... Своеасаблівае ўнутранае агольванне-выгаворванне... Увесь тэкст агулам прытрымліваецца аўтарскай абранай пазіцыі, галоўнай ідэі твора: быць па магчымасці шчырымі і сумленнымі. І гэта не так цвярозае пераасэнсаванне перажытага грамадска-палітычнага стрэсу, як усплёск уласных эмоцый, выкладанне «сэрца на далоні»... Але па прачытанні з'яўляецца і кволае прадчуванне, што гэта ўжо не зусім «home savetikus», а людзі эпохі духоўнага катарсісу. Хто за імі і што пасля іх? Адказ — не за пісьменніцай, а за самімі гэтымі людзьмі і іх нашчадкамі... Бо «вера была шчырая... наіўная вера... Паверылі, што вось зараз... ужо стаіць на вуліцы аўтобусы, якія павязуць нас у дэмакратыю. Будзем жыць у прыгожых дамах, не ў шэрых «хрушчоўках», пабудуем аўтабаны замест раздзяўбаных дарог, станем усе добрымі. Рацыянальных доказаў гэтаму ніхто не шукаў. Іх і не было. А навошта? Верылі сэрцам, а не розумам. І галасавалі на выбарчых участках сэрцам. Ніхто канкрэтна не казаў, што трэба рабіць: свабода — і ўсё.



Калі ты сядзіш у закрытым ліфце, то марыш аб адным — каб ліфт адчыніўся. У цябе шчасце, калі яго адкрылі. Эйфарыя! Ты не думаеш пра тое, што ты цяпер павінен нешта рабіць... ты нарэшце дыхаеш на поўныя грудзі... Ты ўжо шчаслівы!»

С. Алексіевіч больш цікавая менавіта для замежнага чытача, які даўно не спазнаваў падобных катаклізмаў і яшчэ прагны да тлумачэння такіх псіхалагічных драм, а тым больш канання чырвонага чалавека (бо наш чытач, апроч маладзёнаў, які і ёсць героем іх твораў, і той, хто, чытаючы, пазнае ў іх сябе, і раздражняецца сям-там, таму што ведае сябе яшчэ глыбей і бязлітасней, чым ведае яго сама пісьменніца. Але ж у тым і была, мабыць, галоўная аўтарская задума: не проста занатаваць пэўную фактуру для гісторыі, не толькі ўзнавіць яе для нашчадкаў, а — напомніць чалавеку пра яго сутнасць і нейкім чынам разбудзіць яго свядомасць...

Гісторыя ВКЛ і Рэчы Паспалітай, жыццё князёў Радзівілаў, Жыгімонтаў і просталюдзінаў у рамане **Эрнеста Ягугіна** «Перад Патопам» паказана не праз сухі і статычны архіўна-дакументальны афіцыёз, а праз кулуарнае жыццё, падгледжанае ў калідорах улады і праз канкрэтны лёс асобнага чалавека, і, трэба зазначыць, зроблена гэта даволі адметна, па-мастацку вобразна, магчыма, нават не менш праўдзіва, як было насамрэч, дзякуючы менавіта гэтай адвольнай, але стрымана-ўдумлівай суб'ектыўнасці аўтара. Сам тэкст стылёва просты, на першы погляд аднак, чытэльны і зацягвае па ходу развіцця сюжэта. Ярка і запамінальна выпісаны быт, звычкі, памежныя і людскія дачыненні, прырода і мова нашых продкаў. Працяг гісторыі — у наступным нумары часопіса.

Прыцягне чытацкую ўвагу і яшчэ адна празаічная рэч — другая аповесць рамана-павуты **Ігара Бабкова** «Паветраны шар (1984)». «І ён вярнуўся і жыў далей, і, часам, пражываючы пэўныя рэчы, ужо наперад прадчуваў, які гэта будзе рэдкі і прыгожы ўспамін. Магчыма, ён падумаў пра гэта таксама, адночы ўсё ягонае жыццё, завершанае і дасканалае, насычанае сэнсамі, паўстане перад ім як завершаны твор. І будзе не страшна ставіць апошнюю кропку». Гэтая цытата з рамана збольшага раскрывае чытачу бессюжэтную і псіхалагічна-медытатыўную задуму твора і яго патаемную, непадуладную аўтару, мастацкую аўру... Складваецца ўражанне, што на пустым месцы выснаваўся зруб жыццёвага выраку творчага чалавека... Гэткае ідэйна-палітычнае і культуралагічнае рэзюмэ прамінулага часу канкрэтнага постсавецкага нацыянальнага інтэлектуала (дарэчы, якое кантрастнае супрацьпастаўленне вышэй узгаданаму твору С. Алексіевіч!). Калі зусім казаць шчыра пра ўласнае ўражанне, то раман І. Бабкова, хоць і аднастылёвы па сутнасці, але складаны па задуме і настолькі структурна стракаты, што месцамі насамрэч ілюзорна напамінае сабой павуту, у якой, у рэшце рэшт, і апынаецца залётны, заінтрыгаваны выбітным ткацкім літаратурным майстэрствам аўтара, чытач... Кожны ведае, чым гэта канчаецца ў падобных выпадках, але кожны спадзяецца на лепшае...

З малой прозы — апавяданне **Вінцэся Мудрова** «Гісторыя хваробы». Твор у ягоным пазнавальным стылі — нязмушаны, у меру іранічны, чытэльны. Вінцэсь як бы сабе не здраджвае і найчасцей застаецца ў сваёй залатой пары галавазломнага юнацтва і напаўдысідэнцкай маладосці. А вось аповед «Кашаль» Аляксея Чубата абсалютна не ўразіў. Прасталінейны чарцёжны журналісцкі стыль, лабавы сюжэт. Я памятаю А. Чубата як паэта, там ён значна цікавейшы. Дэбют жа гамяльчаніна **Алеся Брагінца** з апавяданнем «Возера, дзе расце доўгі-доўгі чарот...», скажам казённа, прымальны. Нешта ёсць у яго ад помных мне «крынічных» аповедаў пра Ваню Бянькова згаданага мной В. Мудрова. Аўтар мае адметны, праўда, яшчэ не ўпрацаваны стыль і, прынамсі, валодае візуальна не скаваным сюжэтным схематызмам. З яго творамі варта чакаць новай сустрэчы.

Што да паэтычнага красамоўства. Друкуецца нізка вершаў **Алеся Каско** «Багашукальніцтва». Безумоўна, узрост сціпае волю метафарычным крылам паэта, але яшчэ не можа пазбаўляць яго ўзлётаў... Паэзія А. Каско ўздымаецца з прыземленасці быцця ў высокае захмар'е чалавечых мрояў... У аўтара ёсць адметны талент і выпрабаваны часам літаратурны густ. Чытаючы яго, далучаешся да шырокага светапогляду паэта, пачынаеш жыць лёсам яго вершаў.

Найлепшыя гінуць за свет і святло,
каб нараджалася людства
свабодным.
Чаму ж і цяпер, хоць шмат
жыццяў сышло,
грэх — першародны?
Душа вымагае, а голас слабы
ў верных, сумніўных і ў багаборцаў...
Няўжо-ткі дарэмна твой Сын
палюбіў
нас, Усятворца?!

Вельмі цэласная, выдатная паэтычная нізка **Фелікса Баторына** «Познім вечарам у дождж», асабліва вершы «Апокрыф» і «Я ўсё адно пайду на дно». Даўно сачу за яго творчасцю — і, чым далей, тым больш цешуся і пераймаюся яго паэтычнымі ўдачамі і спакутаваннямі — яго суперажываннямі чалавеку і неардынарнымі развагамі над яго векавечным і па сутнасці прадказальным выракам. Адмысловы паэт, якога нашай літаратуры пара было б заўважыць і ўважыць яго чалавечы і творчы талент (зрэшты, пра што, каму і ў які час я гэта гавару?)...

Плыву, жыву з апошніх сіл.
Нічога ў Бога не прасіў:
Што мне патрэбным можа быць,
Умеў зрабіць і зарабіць.
Адно адзінае прашу:
Не супакой маю душу
І мне як долей часу плынь,
Каб з ёю дужацца, пакінь.

Алена Ігнацюк з Пінска ў сваіх вершах «Слухаць мора», як заўсёды, непаўторная і віртуозная фантазёрка. Праўда, вершы пераважна аднастайныя і па стылёвасці і па форме — гэткая своеасаблівая спроба выявіць разняволеную рэчаіснасць пэўнага месца і часу, але чытаюцца бегла, міла і нярэдка ўражліва (назва гэтага агляду ёсць цытацыяй аднаго з вершаў)... Нізка блізкая да характарыстыкі самой паэткай:

Мора тэкст — нібы верша радкі,
што выводзіць рука сімваліста...

Даўно ўжо не чытаў вершаў Уладзіміра Мароза, таму было інтрыгоўна зайсці за яго край туману (назва нізкі) і паблукаць у ачышчанай ад слоўнага смогу прасторы. Балючыя, выпакутаваныя душой вершы, можа, сям-там занадта правільныя ў сваім пасыле. Віной таму — затуманеная нацыянальная свядомасць народа, праз аблуду якой трэба шукаць пэўную дарогу, свой шлях да святла і свету.

...Ды нічога не зробіш — брыдзём,
Як закладнікі крыўды й падману.
І нарэшце якім-небудзь днём
Дабярэмся да краю туману.

Неблагія пачынанні ў маладога паэта **Максіма Баравіка**. Хоць, часам, эмоцыі перасільваюць здаровы сэнс, але ж ці ўздымалася б без таго вершаскладанне да паэзіі...

Добрую справу робіць (творыць) **Андрэй Хадановіч**, перакладаючы на беларускую мову лепшыя вершы лаўрэаткі Нобелеўскай прэміі палячкі **Віславы Шымборскай.** Важкі томік адборнай лірыкі выбітной паэткі даўно чаканы. Мне здаецца, што сутворчасць паэтаў атрымалася не толькі плённай, але і па-мастацку ўдалай, вартай шырокай чытацкай увагі.

Таксама ў перастварэнні з польскай **Наталляй Русецкай** і ў сцэнічнай адаптацыі **Сяргея Кавалёва** друкуецца п'еса Францішкі Уршулі Радзівіл «Выкраданне Еўропы».

Смачна-чытэльнае і апетытнаўежнае, душэўнае і ў корані сваім мудрае занатаванае паэтам **Рыгорам Барадуліным** гаваркое слова Вушаччыны. Лепш не скажаш, чым тое, што тут прачытаеш... Прадмову да «Вушацкага слоўзбору», які хутка выйдзе асобнай кнігай, напісаў У. Някляеў.

Следам і сам **Уладзімір Някляеў** выступае з працягам публікацыі сваіх «Знакаў прыпынку». Думныя, эмацыйныя запісы паэта з эгацэнтрычнай прыроднай таленту. Чытанне займальнае, месцамі адсведчанае і безагляднае на самога сябе... Згадваючы асобныя дзеі сваёй біяграфіі, аўтар міжвольна ўздымае палемічны пыл у завочных стасунках са сваімі былымі калегамі, хоць у душы і спадзяецца, што «калі будуць лічыць па вялікім рахунку, нам залічыцца дарога, а не пыл над ёй.» Даводзіцца толькі загадзя спачуваць тым, на каго той пыл асядзе. Урэшце, знаны паэт усё гэта добра разумее і афарыстычна зазначае: «Там, дзе ты сам не герой, там няма герояў».

Друкуюцца сардэчныя ўспаміны-развагі **Дануты Бічэль** пра Ніну Мацяш, якой гэтымі днямі споўнілася б 70 гадоў. Завяршае расповед вядомая паэтка вершам сваёй каляжанкі І. Жарнасек, у якім, напраўду, вобраз Ніны Язэпаўны паўстае як жывы:

З усіх нашых сходаў
пісьменніцкіх
засталіся
трывала ў памяці
кветкі
на прыполе
Ніны Мацяш.

Друкуецца скасаваны на пачатку 70-х цэнзарам часопіса «Полымя» артыкул **Сяргея Панізніка** «Сумежжа сэрцаў і дум». Трэба адзначыць, што тэкст і сёння чытаецца з цікавасцю.

Рэдакцыя не пашкадавала аб'ёму для палемічнага «двубою» на тэму «мастацкага густу» і «безгустоўнасці» ў культуры і літаратуры паміж Эдуардам Дубянецкім і Віктарам Жыбулем. Я, хоць і больш схільны да пазіцыі Эдуарда, але з прычыны ўжо немалога свайго творчага і жыццёвага вопыту, пры магчымасці ўдзелу, заняў бы тут сваю адрозную — трэцюю (не трацейскую пазіцыю «над»), а — «паміж» ці «пасярод»... Калі ж выказаць сваё больш канкрэтнае вобразнае ўражанне ад «казанняў» супрацьўных бакоў, то мне бачыцца гэта як непамыснае ўтрапенне ахоўніка класічных традыцый Эдуарда Дубянецкага перад футурыстычным партрэтам Паўла Шукайлы, напісаным авангардным пэндзлем Віктара Жыбуля... Застаецца спадзявацца, што час вырастае і звядзе ў адно пазіцыі абодвух бакоў, кожны з якіх мае сваю пэўную рацыю. Таму што спрадвечная і жыццядзейная пазіцыя ў творчасці была, ёсць і будзе толькі адна — высокамастацкая.

У часопісе друкуецца і артыкул крытыка і літаратуразнаўцы **Евы Лявонавай** «А душа падумала і здрыганулася» (творчасць Максіма Гарэцкага ў святле еўрапейскага літаратурнага досведу). Параўнальны аналіз яго апавядання «Рускі» (1915) і навэлы Кафкі «Ператварэнне» (1912). Вельмі арыгінальнае супрацьстаўленне і неардынарныя высновы таленавітай даследчыцы нацыянальнай і замежнай літаратуры.

Анатоль Сідарэвіч і **Леанід Галубовіч** друкуюць рэцэнзіі, першы — на кнігу «Зоська Верас. Я помню ўсё: лісты, успаміны» (укладзенай М. Скоблам), другі — на паэтычны зборнік Валеры Дубоўскага «На пачатку маўчання».

Напрыканцы часопіса ў традыцыйнай рубрыцы «Дзеяпіс» анансуюцца новыя выданні Бібліятэкі СБП з серыі «Кнігарня пісьменніка».

Такое вось літаратурнае жніво і яго пасляжнівеньскі намалот. І ўсё дзеля вашага чытацкага здароўя.

▸ ЛІТКАЛЕЙДАСКОП

САЙТ ПРА ЛЬВА ТАЛСТОГА



Запрацаваў новы сайт, прысвечаны жыццю і творчасці Льва Талстога — tolstoy.ru. Яго з'яўленне прымеркавана да 185-годдзя пісьменніка (9 верасня).

На сайце, які задумваўся як афіцыйны партал пісьменніка, сабраная вывераная спецыялістамі інфармацыя пра жыццё і творчасць пісьменніка, змешчана шмат рэдкіх медыйных матэрыялаў: фатаграфіі, ілюстрацыі да твораў, аўдыё- і відэазапісы з музейных фондаў. Таксама на tolstoy.ru прадстаўленая інтэрактыўная геаграфічная карта, на якой пазначаны месцы, звязаныя з імем пісьменніка і месцамі дзеяння яго твораў.

На партале ўпершыню выкладзены ўвесь 90-томны збор твораў Талстога ў электронным выглядзе. Кнігі можна бясплатна спампаваць у фарматах PDF, fb2 і ePub.

Праца па падрыхтоўцы электроннай версіі 90-томніка праводзілася ў межах праекту «Увесь Талстой за адзін клік». Праект быў распачаты кампаніяй ABBYY сумесна з Дзяржаўным музеем Льва Талстога і музеем-сядзібай «Ясная Паляна» ў чэрвені гэтага года. Вычытвалі талстоўскія творы валанцёры. Любы ахвотны мог спампаваць з сайта readingtolstoy.ru 20 старонак тэксту і спецыяльную версію ABBYY FineReader, якая дапамагае распазнаваць тэксты.

Праца праводзілася ў тры этапы: вычытка тэксту валанцёрамі, паўторная праверка валанцёрамі-аўдытарамі, вычытка валанцёрамі-карэктарамі і канвертацыя ў фарматы электронных кніг. Першы этап, паводле словаў арганізатараў, завяршыўся рэкордна хутка. За 14 дзён былі вычытаныя ўсе 90 тамоў. У праекце ўзялі ўдзел 3123 удзельнікі з 49 краін.

Збор твораў Льва Талстога ў 90 тамах выходзіў з 1928 па 1958 гады ў Дзяржлітвыдавецтве. У яго ўваходзяць усе мастацкія творы пісьменніка, а таксама дзённікі, лісты, публіцыстыка, філасофска-рэлігійныя творы і чарнавікі.

ПРЭМІІ

БУКЕР

Кароткі спіс прэтэндэнтаў на Букераўскую прэмію быў абвешчаны 10 верасня. З лонг-ліста, які складаўся з 13 пісьменнікаў, журы абрала шасцярых. У іх лік увайшлі брытанскі пісьменнік Джым Крэйс з раманам «Ураджай» («Harvest»), ірландзец Колм Тойбін з «Запаветамі Мэры» («The Testament of Mary»), новазеландка Элеанора Катон з кнігай «Свяціла» («The Luminaries»), брытанка Джумпа Лахіры з раманам «У нізіне» («The Loward»), канадска-амерыканская пісьменніца Рут Озекі з «Казкай пра быццё» («A Tale for the Time Being») і Новаёлет Булавайё з Зімбабвэ з раманам «Нам патрэбныя новыя імёны» («We Need New Names»).

Кніга Колма Тойбіна «Запаветы Мэры» стала самым кароткім творам, які калі-небудзь намінавалі на Букераўскую прэмію. Яна складаецца ўсяго са 112 старонак. Таксама было абвешчана, што сёлета ў шорт-ліст патрапілі самы пажылы і самы малады намінанты ў гісторыі прэміі: 67-гадовы Джым Крэйс і 27-гадовая Элеанора Катон.

Пераможца будзе названы 15 кастрычніка. Яму ўручаць статуэтку і чэк на 50 тысяч фунтаў (каля 80 тысяч даляраў).

Букераўскую прэмію з 1969 года прысуджаюць аўтару, які пражывае ў адной з краінаў Садружнасці нацый (Вялікабрытанія і былыя калоніі), Ірландыі ці Зімбабвэ. Твор павінен быць напісаны на ангельскай мове. У мінулым годзе «Букер» дастаўся брытанскай пісьменніцы Хілары Мантэл за раман пра Томаса Кромвеля «Вынесіце целы».

ПРЭМІЯ ІМЯ САЛТЫКОВА-ШЧАДРЫНА

Пісьменнік Юры Палякоў узнагароджаны Усерасійскай прэміяй імя Салтыкова-Шчадрына за раман «Гіпсавы трубач». Узнагарода аўтару лепшага твора, напісанага ў сатырычным жанры, была ўручана ў Кіраве, у доме-музеі, які носіць імя вялікага сатырыка, губернатарам вобласці Мікітам Бялых. На наступны дзень адбылася прэзентацыя гэтай кнігі – на Маскоўскай міжнароднай кніжнай выставе-кірмашы.

Старонка падрыхтавана паводле матэрыялаў РИА Новости, УНІАН, newsru.ua, The Guardian, lenta.ru, BBC News і news.tut.by.

НОВЫ РАМАН ПРА ЭРКЮЛЯ ПУАРО

Як паведаміла «The Guardian», у Вялікабрытаніі будзе выдадзены новы раман пра бельгійскага дэтэктыва Эркюля Пуаро. Аўтарам новых прыгодаў знакамітага літаратурнага героя стане пісьменніца Сафі Хана. Кніга, якая пакуль не атрымала назвы, з'явіцца ў верасні 2014 года.



Па словах пісьменніцы, дзеянне новага рамана будзе разгортвацца ў часавым прамежку паміж сюжэтамі «Таямніцы «Блакітнага цягніка»» (1928) і «Загадкай Эндхаўза» (1932). Лепшы сябар Пуаро капітан Гасцінгс у рамане не з'явіцца.

Правы на выкарыстанне вядомага персанажа ў новай кнізе былі атрыманы ў спадчыннікаў Агаты Крысці. Хана прадставіла ім і выдавецтву «Харпер Колінз» падрабязны стостаронкавы план кнігі. Як заявіла пісьменніца, яна думала над адным дэтэктыўным сюжэтам каля двух гадоў, але не магла прыдумаць, як адаптаваць яго да сучаснага жыцця, і тады вырашыла, што хоча зрабіць галоўным героем свайго рамана Эркюля Пуаро.

Унук Агаты Крысці Мэцью Прычард заявіў, што рашэнне дазволіць працягваць дэтэктыўную серыю пра Пуаро далося яму і іншым спадчыннікам нялёгка. Ён адзначыў, што яны з цікавасцю назіралі за працягам серыі пра Джэймса Бонда, напісаным Себасцьянам Фолксам («Д'ябал не любіць чакаць», 2008). «Мая бабуля напісала значна больш кніг, чым той жа Ян Флемінг. Мы думалі, што ў спісе твораў Крысці і так занадта шмат пунктаў», — распавёў Прычард.

Сафі Хана адзначыла, што паспрабуе звяртацца з персанажам Крысці як мага асцярожней. «Я разглядаю кожнае напісанае Агатай Крысці слова амаль як святое пісанне, так што паспрабую не дапушчаць адмысловых вольнасцяў. Напрыклад, Пуаро сапраўды не будзе катацца на роліках», — заявіла пісьменніца.

Сафі Хана, ангельская паэтка і празаік, жыве і працуе ў Кембрыджы. Некаторыя яе паэтычныя творы ўваходзяць у адукацыйную праграму брытанскіх школ. Шырокую вядомасць Хана атрымала як аўтар дэтэктываў. Яе раман «Маленькі тварык» у 2008 годзе быў намінаваны на Дублінскую літаратурную прэмію.

Агата Крысці напісала 33 раманы пра Эркюля Пуаро. Апошні — «Заслона» — быў апублікаваны ў 1975 годзе, незадоўга да смерці пісьменніцы.

ДОМ ДЗІКЕНСА Ў КЕНЦЕ

Дом ангельскага пісьменніка Чарльза Дзікенса ў графстве Кент, у якім ён жыў на працягу апошніх 13 гадоў жыцця, ператвораць у музей.



Двухпавярховы будынак Гэдсхіл-Плэйс з 1920 года выкарыстоўваўся як школа. Кабінет Дзікенса служыў офісам дырэктару школы, а ў астатніх памяшканнях знаходзіліся класныя пакоі.

Аднак, па словах цяперашняга дырэктара школы Дэвіда Крэгса, дом пісьменніка ўжо не адпавядае патрабаванням сучаснай адукацыі. Таму школа неўзабаве пераедзе ў два нядаўна пабудаваныя новыя будынкі. У цырымоніі адкрыцця аднаго з іх удзельнічала ўнучка пісьменніка Марыон Дзікенс.

Гэдсхіл-Плэйс у вёсцы Хайем у графстве Кент быў пабудаваны ў 1780 годзе для былога мэра Рочэстэра Томаса Стэфенса. Дзікенс упершыню ўбачыў асабняк у 1821-м, калі яму было дзевяць гадоў. Як успамінаў пісьменнік, яго бацька тады сказаў, што калі ён будзе шмат працаваць, то калі-небудзь зможа купіць гэты дом.

Праз 35 гадоў пісьменнік купіў яго за 1,790 тысячы фунтаў і праз год пераехаў туды з Лондана.

У Гэдсхіл-Плэйс Дзікенс напісаў, між іншага, «Аповесць пра два гарады», «Вялікія надзеі» і «Наш агульны сябар», а таксама свой апошні няскончаны раман «Таямніца Эдвіна Друда». У 1870 годзе ён памёр у абедзенным пакоі асабняка.

Чарльз Дзікенс нарадзіўся ў 1812 годзе ў Портсмуце, дзе пражыў тры гады. З 1904-га ў яго доме працуе музей. Другі музей пісьменніка знаходзіцца ў яго доме ў Кэмдэне (Лондан).



Такім чынам, у Брытаніі будзе тры музеі Дзікенса. А вось помнік у яго гонар — пакуль што адзін. Ды і той з'явіўся толькі сёлета — у родным горадзе Портсмуце. Першапачаткова планавалася, што помнік паставяць у 2012-м, калі брытанцы святкавалі 200-гадовы юбілей раманіста, аднак на праект не паспелі сабраць грошы. Манумент, замоўлены «Таварыствам Дзікенса», ацэньваецца ў 118 тысяч фунтаў стэрлінгаў (191,7 тысяч даляраў), а апошняе ахвяраванне ад ананімнага дабрачынцы ў памеры 25 тысяч фунтаў (40,6 тысяч даляраў) было нядаўна.

Сам жа пісьменнік у сваім тэстаменце прасіў не ўзводзіць яму манументаў. Вядома пра існаванне дзвюх скульптур за межамі Англіі, усталяваных у гонар Дзікенса: адна з іх знаходзіцца ў Філадэльфіі, другая — у Сіднэі.

НОВЫЯ КНІГІ СЭЛІНДЖЭРА

Нявыдадзеныя творы амерыканскага пісьменніка Джэрома Д. Сэлінджэра, аўтара рамана «Лавец у жыце», хутка пабачаць свет.

Пра тое, што кнігі Сэлінджэра рыхтуюцца да друку, паведамілі Шэйн Салерна і Дэвід Шылдс, аўтары біяграфіі пісьменніка. Інфармацыя была атрыманая імі з «дзвюх незалежных і дакладных крыніц».

У неапублікаваных тэкстах чытачоў чакаюць героі папярэдніх твораў пісьменніка: Холдэн Колфілд («Лавец у жыце») і Фрэні і Зуі Глас (зборнік «Фрэні і Зуі»). Сэлінджэр таксама звяртаецца да свайго досведу ваеннай службы падчас Другой сусветнай вайны і захаплення ўсходнімі рэлігіямі, сцвярджаюць Д. Шылдс і Ш. Салерна.

Выдавецтва Little, Brown and Company, у якім выйшаў раман «Лавец у жыце», а таксама сын пісьменніка Мэт Сэлінджэр каментаваць сітуацыю адмовіліся.

Адзначым, што Д. Шылдс і Ш. Салерна падчас напісання біяграфіі не супрацоўнічалі са сваякамі Сэлінджэра — яго сынам М. Сэлінджэрам і ўдавой Колін О'Ніл. Аўтары біяграфіі Сэлінджэра — не літаратуразнаўцы і не спецыялісты па яго творчасці. Ш. Салерна — галівудскі сцэнарыст, вядомы па фільмах «Армагедон» і «Дзікуны», а Д. Шылдс — пісьменнік, аўтар кніг на розную тэматыку, у тым ліку аб прафесійным баскетболе і сучаснай літаратуры.

«Лавец у жыце» — адзіны раман Сэлінджэра, які выйшаў пры яго жыцці, у 1951 г. Кніга здабыла велізарны поспех. Пісьменнік апублікаваў яшчэ шэраг навэлаў, пасля чаго пачаў весці жыццё пустэльніка. Ён перастаў выдаваць свае кнігі ў пачатку 1960-х, аднак многія крыніцы сведчаць, што ён не перастаў пісаць. Так, у інтэрв'ю ў 1974 годзе пісьменнік паведаміў, што піша «штодня, але выключна для сябе». «Адмова ад выдання кніг прыносіць мне спакой», — патлумачыў ён.

Кіраўнік праекта «ЛІТАРАТУРНАЯ БЕЛАРУСЬ» Алесь ПАШКЕВІЧ. Рэдактар Барыс САЧАНКА. Тэлефон для даведак: (8-017) 200-80-91.
Адрас электроннай пошты: sbp@tut.by